WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ЖНІЎНЯ 2010 г.
СЕРАДА
№ 155
(26763)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

У Беларусі распрацоўваецца дзяржпраграма развіцця культуры на 2011-2015 гады

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў актывізаваць работу па прыняцці ў бліжэйшы час дзяржаўнай праграмы развіцця культуры Беларусі на 2011-2015 гады. Такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў 10 жніўня, прымаючы з дакладам міністра культуры Паўла Латушку, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Паводле слоў Паўла Латушкі, гэта праграма створыць дадатковыя магчымасці для новага этапа развіцця культуры і мастацтва Беларусі ў бліжэйшай пяцігодцы.

Кіраўніку дзяржавы даложана аб выніках работы Міністэрства культуры з чэрвеня 2009 года, з часу назначэння Паўла Латушкі на пасаду міністра.

Прэзідэнт праінфармаваны аб перспектывах далейшага развіцця сферы эстрады і кінамастацтва Беларусі. У бліжэйшы час плануецца правесці нараду на ўзроўні кіраўніка дзяржавы з удзелам прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, дзеячаў культуры, кінамастацтва і дэталёва прааналізаваць стан і перспектывы развіцця кінамастацтва Беларусі.

На сустрэчы размова ішла таксама аб рабоце ВНУ сферы культуры. Прэзідэнт даручыў па выніках іх праверкі актывізаваць работу па павышэнню ў іх узроўню навучальнага працэсу.

Прэзідэнт падтрымаў некалькі прапаноў Міністэрства культуры. У прыватнасці, аб стварэнні сістэмы нацыянальных прэферэнцый для развіцця айчынных культуры і мастацтва. Прапануецца стварыць больш ільготныя нормы падаткаабкладання ў беларускім заканадаўстве, якія далі б магчымасць прыцягваць больш пазабюджэтных сродкаў для развіцця сферы культуры і мастацтва.

Аляксандр Лукашэнка адобрыў ініцыятыву аб стварэнні пры ўрадзе грамадскага савета па развіцці культуры і мастацтва, у склад якога ўвойдуць як усім вядомыя дзеячы культуры і мастацтва Беларусі, так і прадстаўнікі таленавітай моладзі.

Кіраўнік дзяржавы таксама падтрымаў прапанову аб заснаванні нацыянальнай тэатральнай прэміі. На думку Паўла Латушкі, гэта створыць дадатковыя магчымасці для стымулявання развіцця тэатральнага мастацтва ў Беларусі.

Рэзідэнты беларускага ПВТ гатовы інвеставаць у стварэнне вытворчай інфраструктуры Парку

Рэзідэнты беларускага Парку высокіх тэхналогій гатовы інвеставаць уласныя сродкі ў развіццё і стварэнне вытворчай інфраструктуры ПВТ. Аб гэтым Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку 10 жніўня далажыў дырэктар Адміністрацыі Парку высокіх тэхналогій Валерый Цапкала.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб ходзе будаўніцтва Парку, да якога сёння падключаюцца кампаніі-рэзідэнты з уласнымі сродкамі. Як адзначыў Валерый Цапкала, на сёння развіццё рэзідэнтаў ПВТ дало магчымасць накапіць дастаткова фінансавых рэсурсаў, каб самастойна іх укладваць у развіццё навукова-вытворчых і вучэбных карпусоў. Будаўніцтва ПВТ павінна завяршыцца да 2014 года.

Прэзідэнту даложана таксама аб выніках работы Парку высокіх тэхналогій за першае паўгоддзе 2010 года. Тэмп росту аб'ёмаў вытворчасці праграмнага забеспячэння за студзень-чэрвень склаў 140 працэнтаў да адпаведнага перыяду мінулага года.

Як адзначыў Валерый Цапкала, асноўнай задачай, якая стаіць на сёння перад Паркам высокіх тэхналогій, з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў для ПВТ: як студэнтаў беларускіх ВНУ, так і ў рамках ствараемых адукацыйных структур. Размова перш за ўсё ідзе пра беларуска-індыйскі Навучальны цэнтр лічбавых тэхналогій на базе ПВТ у Мінску, адкрыццё якога плануецца ўжо ў кастрычніку, а таксама шэраг іншых кампаній, якія будуць займацца падрыхтоўкай спецыялістаў для ПВТ.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Васіліна КАЛУГІНА:

«БЕЛАРУСКІ ШЫКОЎНЫЯ, ТАМУ ШТО БЕЗ ПЛАСТЫКІ»

Фота БЕЛТА

12 жніўня ў Вільнюсе распачынаецца конкурс «Місіс Сусвет-2010»: канкурсанткі з 25 краін свету будуць змагацца за званне самай прыгожай жанчыны планеты. Беларусь на конкурсе прэзентуе 27-гадовая мінчанка Васіліна КАЛУГІНА. Напярэдадні свайго ад'езду беларуска сустрэлася з карэспандэнтам «Звязды» і расказала, як ішла яе падрыхтоўка і якім чынам аўтарытэт краіны можа паўплываць на вынікі конкурсу.

— Я чуў, што летась на конкурс «Місіс свету» ў В'етнам вы ехалі за свае сродкі. Сёлета сітуацыя змянілася?

— У гэтым годзе мне дапамагае СТБ. Тэлеканал вызваўся паспрыяць з набыццём памятных падарункаў для арганізатараў. Плюс інфармацыйная падтрымка. За мяжой для замужніх мадэляў існуе шэраг конкурсаў, там любяць і цэняць менавіта жанчын, бо сумяшчаць прыгажосць, сям'ю і працу — гэта зусім не проста. У нас, шчыра кажучы, не надаюць асаблівай увагі. Маўляў: вы старэнькія, вам бы толькі на вечары каму за 70...Падрыхтоўкай «міс» у нас займаецца Нацыянальная школа прыгажосці. «Місіс» жа павінны разлічваць на ўласныя сілы. Дарогу я аплачваю сама, вобраз прадумвала таксама сама.

— Значыць, і вечаровыя сукенкі таксама павезяце свае?

— Так, з сабою я вазьму вечаровую сукенку, з якой я ездзіла на «Місіс свету». Хацела і нацыянальны касцюм узяць той жа, але дзякуй дызайнерам сёстрам Парфяновіч, якія вядомыя сваімі сукенкамі падчас шоу «Міс Беларусь-2010». Яны падрыхтавалі для мяне адмысловы нацыянальны касцюм, адаптаваны пад сённяшні дзень. Хоць я не зусім аднесла б яго да нацыянальнага, але мне падабаецца.

— Удзел у «Місіс сусвет» — ваша другая спроба патрапіць на конкурс. Летась вы таксама збіраліся ехаць, але не даехалі — што ж здарылася?

— Летась адбылася незразумелая сітуацыя. Нехта напісаў арганізатарам, што я не падрыхтаваная і не гатова ехаць. Хоць гэта і было няпраўдай, але са спісу ўдзельніц конкурсу мяне выключылі. У любых спаборніцтвах ёсць інтрыгі — і ў спорце, і ў інтэлектуальных гульнях, а тут — конкурс прыгажосці. Сёлета я зноў падала заяўку і...зноў прайшла ў фінал. Так што, як кажуць, першы блін камяком.

СТАР. 2

АСАБІСТАЯ СПРАВА:

Васіліна Калугіна нарадзілася ў Мінску ў 1982 годзе. Скончыла факультэт народнай культуры БДПУ імя М. Танка па спецыяльнасці «Сусветная мастацкая культура. Народны фальклор» (2005). Уладальніца тытула «Міс прэса» на конкурсе «Міс Беларусь-2006». Удзельніца конкурсу «Місіс свету» (2009). Некаторы час працавала прэс-сакратаром тэлеканала СТБ, цяпер — у рэкламным аддзеле тэлеканала. Замужам, выхоўвае сына.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЗА СУТКІ ЛІКВІДАВАНЫЯ 22 ПАЖАРЫ

Паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў аператыўнай дзяжурнай часці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

У тым ліку восем пажараў зарэгістравана ў экасістэме: тры лясныя, тры тарфяныя і два ўзгаранні травы і кустоў. Усе пажары аператыўна ліквідаваныя. Застаюцца абсточанымі 289 населеных пунктаў, якія пацярпелі ад ураганнага ветру ў мінулыя выхадныя. Найбольш гэта датычыцца населеных пунктаў Гродзенскай і Мінскай абласцей. Тут праводзяцца работы па аднаўленні энергазабеспячэння, разбіраюцца паваленыя ветрам дрэвы, рамантуюцца дахі дамоў і вытворчых будынкаў. Пажаранебяспечнай застаецца сітуацыя ў лясах Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей. У гэтых рэгіёнах за мінулыя суткі адбылося 7 пажараў на плошчы 6,3 га.

Тым часам зводны атрад МНС Беларусі змагаецца з агнём у адным з самых складаных па пажарнай сітуацыі расійскіх рэгіёнаў. Паводле даных МНС Расіі, у Разанскай вобласці, дзе знаходзяцца беларускія ратавальнікі, цяпер 14 ачагоў прыродных пажараў, 7 з якіх яшчэ не лакалізаваныя. У склад атрада МНС Беларусі ўваходзіць 25 адзінак спецтэхнікі і 150 чалавек асабовага складу. Па стану на 9 жніўня, беларускія ратавальнікі патушылі 28 лясных і 4 тарфяныя пажары на агульнай плошчы 25 га.

ПАГОНЯ ЗА СКРАДЗЕНЫМ ТРАКТАРАМ

была арганізавана ў Докшыцкім раёне. Механізатар паведаміў у міліцыю, што нехта паехаў на службовым трактары «Беларус», які стаяў ля ягонага дома.

Устанавілі, што прыкладна а першай гадзіне ночы нейкі мужчына сеў у незачыненую кабіну трактара і паехаў. Праз дзве з паловай гадзіны трактар затрымалі супрацоўнікі дзяржаўнай аўтаінспекцыі. Высветлілася, што пакатацца на трактары вырашыў 20-гадовы рабочы. Заведзена крымінальная справа.

ТАЛЕРКАЙ ЗАБІЎ ЖОНКУ

У вёсцы Галубічы Глыбоцкага раёна муж падчас сваркі з жонкай забіў яе талеркай. Ударыў 55-гадовую жанчыну па галаве і яна памерла. Менавіта такую папярэднюю выснову зрабілі эксперты.

А ў Мёрскім раёне сужыцелька парэзала 34-гадовага сужыцеля. 46-гадовая жанчына прыраўнавала і схапілася за нож. Мужчыну адвезлі ў раённую бальніцу на «хуткай» і шпіталізавалі.

АСУДЖАНЫЯ ЗА ЎРАДЖАЙ НАРКОТЫКАЎ

Тры жыхары Віцебска асуджаныя за незаконны пасеў і вырошчванне канопляў. Насенне яны замовілі па інтэрнэце. У «сусветным павуцінні» таксама навучыліся даглядаць расліны. Купілі для гэтага ўсё неабходнае: лямпы, іншыя аксесуары, наладзілі выцяжку. Ураджай вырасцілі на кватэры бацькі аднаго з членаў кампаніі. Зладзеі дзяжурылі па графіку: палівалі расліны і гэтак далей. Асуджаныя 22- і 23-гадовага ўзросту.

Як паведаміла «Звяздзе» **Наталля ЯРОМЕНКА, пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах і аналізу судовай практыкі пракуратуры Віцебскай вобласці**, пра ўраджай незаконных раслін вядома стала выпадкова. Падвяло абсталяванне, і ў кватэры ўзнік пажар.

Падчас следства хлопцы прызналіся, што вырошчвалі каноплі для сваіх патрэб. Маўляў, хацелі паспрабаваць марыхуану і нікому прадаваць зелле не збіраліся. Каб атрымаць задавальненне, купілі трубкі...

Улічваючы ўсе акалічнасці, суд прыгаварыў усіх «садаводаў»-аматараў да пяці гадоў абмежавання волі з адбываннем пакарання ў папраўчай установе адкрытага тыпу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению ОАО «Дзержинский райагросервис»

проводит открытый аукцион по продаже **административно-хозяйственного здания, об.пл. 393,9 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 4.**

Начальная цена с НДС – 345 964 800 бел. руб.

Площадь земельного участка 0,0808 га.

Задаток в сумме 25 000 000 бел.руб.

перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **14.09.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.09.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224-61-34; 500-47-12.

АДМЕНА БІТВЫ ЗА ЎРАДЖАЙ

— Чаму я кавуны не пасадзіла сёлета! — пляскае на дачы рукамі суседка. У такое сярэднеазіяцкае надвор'е яны б, напэўна, выспелі. Між іншым, тыя, хто гэта зрабіў, любуюцца на градках прыгожымі паласацікамі. Здаецца, толькі яны адны сёлета і рады сонейку. Між тым, год 2010-ы для сельгасвытворцаў Гомельшчыны — не толькі выпрабаванне, але і прымерка да года 2011-га. Што сеяць, дзе сеяць, якія тэхналогіі выкарыстоўваць... Прынамсі, новыя тэхналогіі, якія ў сельскай гаспадарцы за апошнія гады ўжо ўкараніліся, сёлета далі вынікі — нягледзячы на тое, што глабальныя планы надвор'е сарвала. Калі б не тэхналогіі, было б куды горш, лічыць старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Валянцін БАБОК:

— Як бы складана ні было, мы выкарыстоўваем новыя тэхналогіі. 103 % мінеральных угнаенняў унеслі да ўзроўню мінулага года. Была забяспечана абарона раслін. Тое, што на палетцы прыйшла гомсельмашаўская тэхніка, безумоўна, таксама дапамагло. Мы тры гады куплялі ў лізінг па 300 камбайнаў, на наступны нам трэба змяняць сітуацыю, іншая тэхніка спатрэбіцца. У нас сёння ўвогуле няма праблем з уборкай. Не трэба весці ніякія бітвы за ўраджай. Паўсюль працуюць вопытныя механізатары, арганізацыя працы нармальная, вялікіх зрываў увогуле няма.

Між тым, спякота, якая для Гомельскай вобласці пачалася з 18 чэрвеня, аказала значны ўплыў на расліны, якія не прыстасаваныя да такіх умоў жыцця. Практычна з таго часу днём ніжэй за 30 градусаў яшчэ не было, а часцей — бліжэй да 40. Дарэчы, пры тэмпературы 40 градусаў ідзе зварочванне бялку ў раслінах. У Хойніцкім раёне два дні таму кукуруза была зялёная, а сёння яна ўжо белая стаіць. І тым не менш, лічыць старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Валянцін Бабок, драматызаваць сітуацыю не трэба:

— Так, сітуацыя няпростая. Недабор збожжавых у бункернай вазе сёлета складзе каля 200 тысяч тон. Калі летась у нас было 990 тысяч тон без кукурузы, сёлета будзе намалочана збожжа каля 790 тысяч тон. Улічваючы тое, што ў гаспадарках ёсць рэшткі леташняга збожжа — каля 270 тысяч тон, складаецца баланс па забеспячэнні грамадскай жывёлагадоўлі канцэнтраванымі кармамі.

Няма праблем у хлебаробаў Гомельшчыны і з выкананнем дзяржаўнага заказу па ўсіх відах культур, у тым ліку па піваварным ячмені. Пачалася ўборка ранняй бульбы, ураджайнасць якой сёлета — больш за 250 ц з га. Хоць па колькасці клубняў, калі б яны выспелі як звычайна, ураджайнасць павінна была быць удвая большай. Калі звычайная бульбіна важыць грамаў 50, сёлетняя — толькі 20-25. Аптымізму дадае толькі тое, што сёлета былі значна пашыраны пасяўныя плошчы любімай беларусамі крухмальнай агародніны — амаль на 2 тысячы га. Значыць, возьмем колькасцю. Праўда, абіраць давядзецца больш маленькай бульбачкі. Калі верыць папярэднім прагнозам па іншай агародніне, хопіць нам сёлета і цыбулі, часнаку, морквы, буракоў, зялёнага гарошку, гуркоў і таматаў. Валянцін Бабок лічыць, што некаторыя праблемы могуць узнікнуць толькі з позняй капустай.

СТАР. 4

Жыццялюбы

«БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА МОЖА ПРЫВАБЛІВАЦЬ ТУРЫСТАЎ НЕ МЕНШ, ЧЫМ МОНТЭ-КАРЛА ЦІ НЬЮ-ЁРК»

Фелікс Высоцкі падзяліўся са «Звяздой» сваёй даўнішняй марай, дзеля якой ён, уласна кажучы, і пераехаў жыць у вёску

«ФЕЛІКС ПРЫЕХАЎ У БЕЛАРУСЬ НЕ ВУЧЫЦЦА, А ЖАНІЦЦА»

З Абхазіі ў сінявокую юнага Фелікса прывяла рэклама Бабруйскага мастацкага вучылішча, якую ён аднойчы ўбачыў па тэлебачанні. Беларускую навучальную ўстанову прэзентавалі сімпатычныя дзяўчаткі, адна з якіх адразу ж спадабалася маладому чалавеку.

— З таго дня не мог ні есці, ні спаць, — надзвычай эмацыйна ўзгадвае Фелікс Феліксавіч. — Таму вырашыў паехаць у Бабруйск і паступіць у вучылішча, чаго б мне гэта ні каштавала.

СТАР. 4

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СУСВЕТНЫ БАНК ЗАКЛІКАЎ ЭКСПАРЦЁРАЎ ЗБОЖЖА НЕ БРАЦЬ ПРЫКЛАД З РАСІІ

Сусветны банк заклікаў краіны-экспарцёры не ўводзіць абмежаванні на вываз збожжа. Пра гэта заявіла кіруючы дырэктар банка Нгозі Аконджа-Івеала.

Паводле яе слоў, уводзіны эмбарга на паставкі пшаніцы могуць прывесці да глабальнага крызісу на харчовым рынку. Аконджа-Івеала адзначыла, што павышэнне коштаў у першую чаргу закране бедныя краіны. Такім чынам СБ папрасіў сусветных экспарцёраў не браць прыклад з Расіі.

УКРАІНА СТАЛА ДРУГІМ ПА ВЕЛІЧЫНІ ДАЎЖНІКОМ МВФ

Украіна стала другім па аб'ёмах запазычанняў даўжніком Міжнароднага валютнага фонду, паведамляе «Інтэрфакс». Пасля атрымання першага транша новага крэдыту даўгі краіны перад фондам склалі 8,25 мільярда адмысловых правоў запазычання (SDR), ці 12,66 мільярда долараў.

Найбуйнейшым даўжніком цяпер з'яўляецца Румынія, даўгі якой складаюць 9,03 мільярда SDR. На трэцім месцы ідзе Венгрыя — 7,64 мільярда SDR.

Пры гэтым новая праграма дапамогі Украіне, прынятая ўвесну 2010 года, з'яўляецца чацвёртай па велічыні сярод дзейных праграм крэдытавання МВФ. Першыя тры месцы займаюць Грэцыя, Румынія і Венгрыя.

ЭКСПЕРТЫ ПАДЛІЧВАЮЦЬ СТРАТЫ АД ПАЖАРАЎ У РАСІІ: ЗГАРЭЛА ЎЖО $15 МЛРД

Страты, якія панесла эканоміка РФ больш як за месяц анамальнай спякоты і справакаваных ёю пажараў, могуць каштаваць 1% росту ВУП у 2010 годзе, піша «Коммерсантъ».

Пры прагнозным намінальным ВУП РФ у 2010 годзе ў 44,8 трлн руб. гаворка ідзе пра сумы каля 450 млрд руб., ці каля $15 млрд, адзначае выданне са спасылкай на аналітыкаў HSBC і «Уралсіба». Тым часам афіцыйныя спробы ацаніць страты, звязаныя з анамальнай спякотай і пажарамі ў РФ, з'явяцца не раней чым у канцы 2010 года.

ЗША ЗАСТАНУЦЦА БЕЗ ВОЛІ

Статую Волі ў Нью-Ёрку зачыняць для наведвання ў сувязі з правядзеннем работ па паляпшэнні сістэм бяспекі. Доступ у статую будзе закрыты на працягу года.

Працы пачнуцца пасля 12 кастрычніка 2011 года — у гэты дзень помніку споўніцца 125 гадоў. Статую плануюць абсталяваць новымі ўваходамі, ліфтамі і лесвіцамі. Кошт работ ацэньваецца ў 26 мільёнаў долараў.

Статуя Волі — адна з галоўных адметнасцяў Нью-Ёрка. Штогод яе наведвае больш за 5 мільёнаў чалавек. Усярэдзіне вянка на галаве статуі размешчана адна з самых вядомых у ЗША назіральных пляцовак.

СВІННЮ ПАКРЫЎДЗІЦЬ МОЖА КОЖНЫ?

Гучная справа

Да трох гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці прыгаварылі заснавальніка мінскай прыватнай фірмы, што займаецца пастаўкамі розных дабавак для кармлення сельскагаспадарчых жывёл і не толькі гэтым, які ўдзельнічаў у гучнай аферы па пастаўцы для кармлення свіней фактычна бескарысную кармавую дабаўку.

Як паведаміла «Звяздзе» **Наталля ФЕДАРЭНКА — намеснік начальніка аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці па наглядзе за следствам у органах унутраных спраў**, следства па заведзенай крымінальнай справе яшчэ працягваецца. Адзін з махляроў вышукваецца.

На працягу прыкладна трох гадоў дзейнічала добра прадуманая крымінальная схема. Асуджаны разам з дырэктарам фірмы (ён вышукваецца) выкарыстоўвалі рэквізіты і бухгалтарскія дакументы фальшывых прадпрымальных структур, зарэгістраваных быццам бы ў сталіцы, каб пастаўляць у Беларускі гібрыдны цэнтр пад відам паліферментнага прэпарата «Гімізім — С» меней эфектыўную і значна таннейшую сумесь «Аміласубтылін», а таксама спецыяльных кампазіцый з крэйды і мукі. Ведалі пра гэта толькі самі махляры. Ні перавозчыкі, ні ў цэнтры пра гэта не ведалі. Паставілі ўсяго каля 25 тон фальшывых дабавак і атрымалі за гэта ажно 544 мільёны рублёў. Атрымлівалі ў ліку іншага і валюту, якая пералічвалася ў якасці платы за імпарт на рахункі мінскіх камерцыйных структур. А потым пасрэднікі абнаяўлівалі грошы і перадавалі махлярам. Ад імя беларускага гібрыднага цэнтра заключаліся заведама фальшывыя дагаворы.

Кіраўніцтва цэнтра нават і не падазравала, што свінкам дабаўляецца ў ежу не імпартная дабаўка, а сумесь, якую робяць фактычна ўручную ў Жодзіне — у звычайным прыватным гаражы. Гэты працэс кантраляваў яшчэ адзін таварыш асуджанага, які цяпер пад следствам. Апошні, як адзначыў юрыст падчас следства, з'яўляецца ідэйным натхняльнікам усёй крымінальнай аферы. Менавіта ён, па версіі юрысконсульта, тэлефанаваў кіраўніцтву сельскагаспадарчага прадпрыемства, прасіў заплюшчыць вочы на адсутнасць адпаведнага сертыфіката на чарговую партыю сумесі.

Афера мо і працягвалася б, калі б не добрасумленныя работнікі гібрыднага цэнтра. І раней былі падазрэнні, што дабаўкі з Расіі ніяк не ўплываюць на прыбаўку вагі свіней, іх агульны стан.

У ліку іншага ўстанавілі, што вадзіцель, які працаваў на злядзеяў, прывозіў крэйду для вырабу сумесі прама з завода будаўнічых матэрыялаў...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.08.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША	2 973,00	1 чэшская крона	158,15	USD	30,0239
▼ 1 еўра	3 916,93	1 польскі злоты	985,50	10 UAH	38,0555
1 латвійскі лат	5 530,65	▼ 1 расійскі рубель	99,02	1000 BYR	10,0955
1 літоўскі літ	1 134,78	1 украінская грыўня	376,83	EUR	39,5235

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Жывая зямля

КАШТАН ПЕРАБЛЫТАЎ ЖНІВЕНЬ З МАЕМ

Гэтую незвычайную прыгажосць на сухім ад спёкі каштане заўважыла наша звяздоўская калега Ірына Тамковіч, ідучы ў любімую краму «Рыга» на сталічнай вуліцы Сурганава.

— Я не паверыла сваім вачам, бо час каштанавай квецені, калі лічыць дакладна, завяршыўся ў сярэдзіне мая, — казала Ірына, літаральна інтрыгуючы сваёю знаходкай.

Не марудзячы ні хвіліны, я выправіўся на пошукі гэтага «парушальніка» вегетацыі і клімату. Нібы спецыяльна, дрэва расло на самым тралейбусным прыпынку і прыцягвала да сябе ўвагу, быццам навагодняя ёлка сваім бліскучым убраннем. Пасажыры, як і варта было чакаць, выказвалі свае меркаванні і раілі напісаць, што ва ўсім вінаватая не толькі спёка, а што дрэвы нікім не даглядаюцца, не паліваюцца і таму ў іх парушана звыклае ўспрыняцце сезоннасці і кліматычнага стану надвор'я.

Падобна на тое, што сёлета гэты малады каштан не квітнеў, бо насення каштанаў на ім няма. Магчыма, дрэва вырашыла ўсё ж наверстаць упушчанае. Бываюць жа ў прыродзе выпадкі, калі і птушаняты са спазненнем выводзяцца, і жывёлы познія ці заранніе з'яўляюцца. Дзівосхапае. Вось у нас цяпер спёка, а заходнія суседзі змагаюцца з паводкаю. А ў Бразіліі і Мексіцы ідзе снег. Як тут не «звіхнуцца»нават дрэвам?!

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Ва Урадзе

Украінскае піва будзе ліцэнзавана, а пастаўкі расійскага збалансаваныя

Гэта дасць магчымасць праз пяць гадоў скараціць долю імпартнага піва на ўнутраным рынку да 5 працэнтаў

«І чаму ў нас, як толькі пачынаецца барацьба з алкагалізмам, рукі даходзяць толькі да піва?» — гэтай напалову жартаўлівай, напалову іранічнай фразай кіраўнік канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Іван Данчанка хацеў сказаць, што нягледзячы на паспяховае (у цэлым) выкананне дзяржаўнай праграмы развіцця піваварнай галіны за апошнія чатыры галіны праблем тут хапае. І яны вельмі разнапланавыя. Як і чаму беларускае піва павінна быць бліжэй да беларускага ж спажыўца, учора абмяркоўвалі члены Урада на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Яно прайшло пад старшынствам Сяргея Сідорскага.

Адна з найгалоўнейшых праблем айчынных півавараў — гэта барацьба беларускіх вытворцаў піва з імпартнай прадукцыяй на ўнутраным рынку. Яна прымушае іх змяншаць цэны, адстойваць літаральна кожную паліцу, кожнае месца ў гандлёвых аб'ектах, рабіць розныя маркетынгавыя хады, часта не зусім выгадныя і апраўданыя. «Мы змагаемся да такой ступені, што самі сябе робім стратнымі, — сказаў Іван Данчанка. — Таму ў найбліжэйшы час работу прадпрыемстваў піваварнай галіны на ўнутраным рынку неабходна ўпарадкаваць: канкурэнцыя — гэта добра, але калі ў гандлёвай сетцы невядома што робіцца, краіна губляе вялікія грошы». Тут жа кіраўнік «Белдзяржхарчпрама» паведаміў, што ёсць выйсце з гэтай сітуацыі: Міністэрства гандлю распрацавала праект Указа «Аб некаторых пытаннях рэгулявання гандлю». Сутнасць яго ў тым, каб абмежаваць памер узнагароджання, якое выплачваецца гандлёвым арганізацыям, 10 працэнтамі ад кошту набытых тавараў. Праект гэтага дакумента прадугледжвае таксама, што тарыфы на паслугі вызначаюцца зыходзячы з памеру эканамічна абгрунтаваных затрат і ўзроўню рэнтабельнасці не больш за 25 працэнтаў.

Іван Данчанка таксама прапануе ўвесці ліцэнзаванне піва з Украіны. Беларускі бок правёў антыдэмпінгавае расследаванне ў дачыненні да ўкраінскага піва. Украіна ў выніку вымушана была прызнаць, што яна дэмпінгавала, каб антыдэмпінгавая пошліна ў памеры 11% не ўводзілася. Некаторыя піваварныя кампаніі Украіны ўзялі на сябе абмежаванні ў цэнавым плане па пастаўках піва ў Беларусь. Усё гэта дае нам законныя падставы ўвесці ліцэнзаванне ўкраінскага пеннага напою.

Цяпер — што рабіць з расійскім півам? Тут пытанне крыху больш складанае, але небязвыхаднае. Прапануецца для выраўноўвання балансу ўвозу і вывазу піва з Расіі ўключыць таварную пазіцыю піва ў баланс Саюзнай дзяржавы. «У рамках Саюзнай дзяржавы мы з Расіяй пастаянна робім прагнозныя балансы па цукры, мясе, яйку, малацэ. Ёсць прапанова ўвесці падобныя меры ў дачыненні да піва. Гэта дазволіла б нам рэгуляваць імпарт піва з Расіі», — адзначыў Іван Данчанка. Прынятыя меры, лічыць кіраўнік «Белдзяржхарчпрама», дазволяць да 2015 года скараціць долю імпартнага піва на ўнутраным рынку да 5 працэнтаў з сённяшніх 30. Гэта цалкам магчыма, тым больш, што лічбы сведчаць аб станоўчай дынаміцы росту аб'ёмаў як вытворчасці, так і рэалізацыі піва. Так, за першую палову года піваварнымі арганізацыямі краіны выраблена 17,9 млн дэкалітраў напою. Продаж айчыннага піва за гэты час павялічыўся амаль на 8 працэнтаў. Вядучыя прадпрыемствы піваварнай галіны краіны сёння — сучасныя арганізацыі, якія маюць абсталяванне і тэхналогіі вядучых сусветных кампаній.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

КАЛІЙНЫ ІНТАРЭС

Індыя зацікаўленая ў набыцці не толькі ўгнаенняў, але і прадпрыемства, якое іх вырабляе

Наша «белае» багацце — смачны кавалак для Індыі, чыя эканоміка грунтуецца на сельскай гаспадарцы. Яна, нагадаем, з'яўляецца адным з найбуйнейшых імпарцёраў прадукцыі нашага, бадай, самага прыбытковага прадпрыемства. І так бы мовіць, не хлеба хоча ад нашых угнаенняў:

— Мы маем патрэбу ва ўгнаенях і зацікаўленыя ў далейшым умацаванні супрацоўніцтва з Беларуссю ў гэтым кірунку, — адзначае **пасол Індыі ў Беларусі Рамеш ЧАНДЭР** падчас сустрэчы з журналістамі. — Для нас адкрылася новая перспектыва, калі было аб'яўлена аб прыватызацыі «Беларуськалія». Карыстаючыся магчымасцю, хачу афіцыйна заявіць пра зацікаўленасць Індыі ва ўдзеле ў гэтым працэсе.

Дыпламат мяркуе, што абмеркаваць перспектывы такога супрацоўніцтва атрымаецца ўжо ў кастрычніку — падчас канферэнцыі па энергетыцы ў Індыі, куды запрошаны першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка. «Пацвярджэнне пакуль не атрыманае, аднак спадзяюся, што спадар Сямашка прыедзе і гэты аспект таксама можна будзе абмеркаваць». Да таго ж, на лістапад запланаванае пасяджэнне беларуска-індыйскай камісіі па развіцці гандлёва- эканамічнага супрацоўніцтва. Пасол упэўнены, што і там «калійнае» пытанне таксама будзе на парадку дня.

На гэтым сельскагаспадарчы інтарэс індыйскага боку не замыкаецца. Сёлета чакаецца візіт у Беларусь дэлегацыі з Пенджаба — каб на месцы, так бы мовіць, прамацаць глебу для супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчай перапрацоўкі. Зацікаўленасць з індыйскага боку вельмі і вельмі выразная, у іх багаты вопыт рэалізацыі сумесных праектаў у гэтай галіне з многімі дзяржавамі (сярод свежых прыкладаў і Украіна), «чаму б і з Беларуссю нам не стварыць нешта агульнае і не пачаць працаваць у гэтым кірунку», — задаецца рэзонным пытаннем дыпламат.

Досыць трывалыя сувязі наладжаныя паміж краінамі ў сферы фармацэўтыкі. У Індыі гэты сектар, паводле слоў пасла, вельмі развіты. Беларусь у сваю чаргу мае вельмі выгаднае геаграфічнае становішча, валодае неблагой тэхнічнай базай, ведамі. Многія індыйскія спецыялісты ў галіне фармацэўтыкі, дарэчы, атрымліваюць адукацыю менавіта ў нас. Наогул супрацоўніцтва ў гэтым сектары дынамічна развіваецца: літаральна два тыдні таму дэлегацыя беларускіх бізнэс-колаў пабывала ў Мумбаі, дзе ўзяла ўдзел і ў канферэнцыі па фармацэўтыцы. Пасол спадзяецца, што вынікі гэтага візіту не змусяць сябе чакаць. Патэнцыял супрацоўніцтва ў фармацэўтычным сектары, на яго думку, велізарны.

Індыйскія кампаніі зацікаўленыя таксама ў супрацоўніцтве з Беларуссю ў галіне цяжкага машынабудаўніцтва і абсталявання — галіне, у якой, паводле слоў пасла, Беларусь мае «прызнаную сілу». У сваю чаргу беларускія прадпрыемствы пакрысе ўсталёўваюць сваю прысутнасць на індыйскім рынку, у прыватнасці, «БелАЗ» ды «Амкадор». Апошні, паводле інфармацыі спадара Чандэра, якраз працуе над адкрыццём свайго прадстаўніцтва ў горадзе Бангалор.

Сярод найбольш выбітных сумесных праектаў кіраўнік дыпмісіі назваў стварэнне пры падтрымцы індыйскага ўрада Навучальнага цэнтра інфармацыйных тэхналогій на базе ПВТ у Мінску (які мае адкрыцца нібыта ўжо ў кастрычніку). А таксама праект па рэканструкцыі Гродзенскай электрастанцыі. Індыйская кампанія BHEL падпісала ўжо адпаведны кантракт. Аб'ём фінансавання ацэньваецца прыкладна ў 55 млн доларaў. Індыйскі ўрад выплучыў крэдытную лінію для рэалізацыі гэтага праекта.

У цэлым жа эканамічнае і гандлёвае супрацоўніцтва дзвюх краін — на пад'ёме, — перакананы дыпламат. Да такіх высноў прыводзіць станоўчая дынаміка таваразвароту: летась яго аб'ём склаў 600 млн доларaў, што, паводле слоў пасла, «нашмат перасягнула запланаваныя да 2010 года 500 млн доларaў».

Пазітыў бачны і ў палітычным дыялогу. Пасол канстатуе, што «паміж Індыяй і Беларуссю склаліся цёплыя сардэчныя адносіны, ёсць узаемаразуменне па пытаннях рэгіянальнага, міжнароднага парадку дня. Здзяйсняюцца кантакты на высокім узроўні». На належным узроўні адносіны паміж парламентамі, так, спікер ніжняй палаты індыйскага парламента спадарыня Кумар запрошаная наведаць Беларусь.

Адносіны ў галіне культуры цудоўныя, паводле выразу дыпламата. Беларусы ахвотна навучаюцца індыйскім класічным танцам, засвойваюць ёгу і хіндзі. А дні індыйскага кіно ў нашай краіне заўжды праходзяць «на ўра».

У той жа час дыпламат перакананы, што значна большае чакае нас напарадзе, паколькі ў абедзвюх краінах «яшчэ не да канца даследчаныя ў магчымасцях адно аднаго»...

Ала МАЧАЛАВА.

Абзац

◢ У Гомелі плануюць замяніць брукаванкай асфальтавае пакрыццё каля прыпыначных пунктаў грамадскага транспарту, каб выключыць уплыў высокіх тэмператур на гэтыя ўчасткі дарог.

◢ 9 жніўня ў 15.10 у Мінску аўтамабіль ВАЗ, рухаючыся па сталічнай вул. Багдановіча ад пл. Бангалор да вул. Някрасава, сутыкнуўся з аўтамабілем «Аўдзі-100». Удар аказаўся нямоцным, бо ВАЗ перамяшчаўся з хуткасцю не больш як 20—30 км/гадзіну. Калі вадзіцель «Аўдзі» падышоў да аўтамабіля віноўніка ДТЗ, высветлілася, што за рулём знаходзіцца мёртвы вадзіцель. 70-гадовы мужчына памёр да ДТЗ, а не ў выніку яго. Прычына смерці вызначаецца.

◢ У лесапаласе мікрараёна Уручча ў Мінску знойдзены мінчанін 1972 года нараджэння, які вісеў у пятлі на дрэве. Праваахоўнікамі была знойдзена перадсмяротная запіска, у якой памерлы пісаў, што стаміўся ад даўгоў і просіць жонку годна выхаваць дзіця. Папярэдне ўстаноўлена, што доўг, пра які гаворыцца ў запісцы, складае некалькі тысяч доларaў. Побач з дрэвам, на якім знойдзена цела, стаяў яго мінівэн.

◢ Супрацоўнікі Жыткавіцкага РАУС затрымалі на выездзе з поля, што належыць ААТ «Тураўшчына», гружаны кукурузай мікрааўтобус. У салоне аказалася каля 3 тон катахоў. Высветлілася, што напярэдадні з раніцы да позняга вечара ў полі працавалі пяць жыхароў навакольных населеных пунктаў, якіх наняў 20-гадовы жыхар Турава. Ён абяцаў расплаціцца з імі пасля таго, як яны ўручную наломаюць кукурузы, расфасуюць яе ў сеткі і падрыхтуюць да транспарціроўкі. Сабранае прызначалася для вывазу ў расійскія рэгіёны.

◢ Адзін з найбуйнейшых бізнэсменаў сучаснасці, заснавальнік кампаніі «Майкрасофт» Біл Гейтс заняўся новым праектам: вывядзеннем новых відаў раслін, якія ўтрымліваюць усе неабходныя для чалавека вітаміны і мінералы. У якасці асновы для гэтай расліны, якая ўжо атрымала ў сусветнай навуцы назву «супережа», выбрана сорга — злакавая культура, якая выкарыстоўваецца ў сучаснай сельскай гаспадарцы. Выбар сорга тлумачыцца яго неверагоднай біялагічнай устойлівасцю і здольнасцю выжываць у самых цяжкіх кліматычных умовах. Яшчэ адна яго адметнасць у тым, што для вырошчвання яно патрабуе вельмі мала вады ў параўнанні з іншымі культурамі, уключаючы злакавыя.

Поўны абзац

◢ Частку пасёлка Таірава ў Адэскай вобласці заліло віном з найбліжэйшага завода. З-за вельмі гарачага надвор'я на прадпрыемстве прарвала цыстэрны, у выніку перабрадзіўшы алкаголь трапіў на размешчаныя непадалёк дворы і агароды. Вінныя патокі знішчылі ўраджай на бліжэйшых агародах. Акрамя іншага, віно стала крыніцай непрыемнага паху ў пасёлку. На вуліцы смярдзіць брагай, і мухі лятаюць чародамі. А на заводзе дык увогуле віннае балота па калена, і яно таксама бродзіць і «пахне».

◢ Жыхар Вялікабрытаніі Дэйв Валентайн сабраў калекцыю пустых пакетаў ад чыпсаў, якая ацэньваецца прыкладна ў 10 тысяч фунтаў стэрлінгаў (крыху больш за 12 тысяч еўра), паведамляе BBC News. Такі высокі кошт набору тлумачыцца тым, што многія віды хрумсткай бульбы ўжо не выпускаюцца, што аўтаматычна робіць упакоўку ад яе калекцыйным рарытэтам.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

«ПРІОРБАНК» АДКРЫЎ 45-ТЫСЯЧНЫ «ПЕНСІЙНЫ РАХУНАК»

Уладальнікам гэтай юбілейнай пластыкавай карткі, якая была выпушчана «Пріорбанкам» да карт-рахунка «Пенсійны рахунак», стаў жыхар Гомеля — Рыгор Аўчыннікаў, якому яшчэ даставіліся і памятныя падарункі ад банка.

Рыгор Уладзіміравіч падзякаваў за такую ўвагу і расказаў, чаму вырашыў афармiць карт-рахунак менавіта ў «Пріорбанку»:

— Пра атрыманне пенсіі я даведаўся ад сваіх родзічаў. Перад тым, як адкрыць рахунак, я наведаў не адзін банк, каб даведацца пра ўсе ўмовы і параўнаць, наколькі выгадным з'яўляецца прапанова. «Пріорбанк» сапраўды прапануе камфортныя ўмовы і добры дадатковы прыбытак, які сёння так важны для пажылых людзей!

Як паведамілі ў аддзеле маркетынгу і грамадскіх сувязяў «Пріорбанка», на «Пенсійным рахунку» даход кожны месяц павялічваецца на суму працэнтаў, якія «Пріорбанк» налічвае на астатак грашовых сродкаў з разліку 14,5% гадавых, нават у тым выпадку, калі зберажэнні знаходзіліся на рахунку ўсяго адзін дзень. Таксама «Пріорбанк» прапануе кліентам, якія афармілі карт-рахунак «Пенсійны рахунак», скарыстацца пакетам паслуг «Пенсійны», дзе змяшчаецца шэраг сэрвісаў па найбольш выгадных для пенсіянераў умовах. У «Пріорбанку» адзначылі таксама, што з дапамогай іх пластыкавай карткі можна без камісіі здымаць грошы ў аддзяленнях Белпошты, банкаматах і аддзяленнях банка, а таксама можна аплачваць камунальныя плацяжы, электраэнергію, тэлефон, тэлебачанне і здзяйсняць пакупкі ў крамах.

Пры афармленні карт-рахунка «Пенсійны рахунак» пенсіянер адразу атрымлівае міжнародную пластыкавую картку «Пріорбанка» тэрмінам на 3 гады, на якую будзе налічвацца пенсія. Гэта з'яўляецца выгадным адрозненнем ад аналагічных прапаноў на рынку.

Іван СТУЖКА.

ДЫРЭКТАР АДНОЙ З ГАНДЛЁВЫХ СЕТАК МІНСКА ПАДАЗРАЕЦЦА Ў ВЫКРАДАННІ BR44 МЛН

Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў Цэнтральным РУУС Мінска.

Аператыўныя супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Цэнтральнага РУУС правялі праверку ў дачыненні да кіраўніка адной сталічнай гандлёвай сеткі. У выніку ў праваахоўнікаў з'явіліся важкія падставы меркаваць, што 45-гадовая дырэктар на працягу двух гадоў выкрадала грашовыя сумы, якія належалі прадпрыемству, якое яна ўзначальвала. Прадпрымальная дама выкарыстоўвала некалькі спосабаў несумленнага заробку. Напрыклад, яна складала заведамае лжывыя дагаворы падраду з фізічнымі асобамі на выкананне ўсялякіх работ. Прычым і работы фактычна не ажыццяўляліся, і людзі, якія па дакументах іх выконвалі, на аб'ектах гандлёвай сеткі ніколі не з'яўляліся. Цяпер жанчыне пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да 12 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

КАЧКАМ — ПАКУЛЬ ЖЫЦЬ!

Дзікія качкі могуць не хвалявацца — іх жыццю пакуль нічога не пагражае. Вось толькі паляўнічыя, відаць, крыху страцілі настрой ад таго, што на нявызначаны перыяд адкладаецца паляванне на вадаплаўную балотную дзічыну. Але ж усім зразумела — сітуацыя ў палескіх лясах і на балотах такая, што трава, здаецца, можа ўспыхнуць ад аднаго гнеўнага позірку. Генеральны дырэктар Гомельскага абласнога лесагаспадарчага аб'яднання Міхаіл Супрун, між тым, адзначае, што не можа прыгадаць сітуацыі, каб пажар у лесе справакавалі менавіта паляўнічыя. Ён кажа, што гэта людзі дысцыплінаваныя, але ж вядома — беражонага Бог сцеражэ:

— З 1 красавіка ў дзяржлясфондзе Гомельскага лесагаспадарчага аб'яднання пашкоджана пажарамі толькі 80 га. Мы цяпер працуем ва ўзмоцненым рэжыме. Устанавілі ў розных лясгасах 13 камер відэанагляду. Гэта нам вельмі дапамагае, бо самае галоўнае — тэрмінова заўважыць момант узгарання і тады лягчэй будзе тушыць. Калі пажар разгараўся — патушыць вельмі складана. Мы супрацоўнічаем з аператарамі сотавай сувязі — камеры ўсталёваем і на іх мачтах. Адной камерай мы сёння бачым практычна ўвесь раён і нават суседні. Яна варочаецца ва ўсе бакі, манітор знаходзіцца на зямлі, аператар бачыць лес як на далоні і не трэба залазіць на вышку. Калі надвор'е яснае — бачна ў радыусе 20 кіламетраў. Да канца года мы плануем устанавіць хоць бы па адной відэакамеры ў кожным лясгасе. А на наступны год — па 2-3 каб было — трэба закрыць раёны поўнасцю. Вы ж улічыце і тое, што ў такое надвор'е стаяць чалавеку з біноклем на мачце проста немагчыма.

Прынамсі, ужо цяпер ёсць лясгасы, якія маюць такую тэхніку і не ў адзінкавых экзэмплярах. Намеснік дырэктара Акцябрскага лясгаса Аляксандр Бандарэнка расказвае, што каштоўная тэхніка, якую яны закупілі яшчэ тры гады таму, даўно апраўдала ўсе затраты. Цяпер відэакамеры ўстаноўлены ў трох лясніцтвах і на цэнтральнай базе так, каб спецыяліст мог пабачыць узгаранне нават з розных пунктаў і дакладна вызначыць квартал гарэння. У Палескім лясніцтве Светлагорскага лясгаса сістэма відэаназірання знаходзіцца на вышыні 72 метры — на вежы аднаго з мабільных аператараў **(фота)**.

Акрамя таго, два разы за дзень авіятэхніка «Беллесавія» робіць аблёты над лясамі Гомельшчыны. Цяпер размова ідзе пра тое, каб самалёт Іл-103 і два верталёты Мі-8 аглядалі прасторы Гомельшчыны і Магілёўшчыны тры разы за дзень. Тэхніка, якой укамплектаваныя лясгасы, дазваляе аператыўна рэагаваць на пачатковыя ўзгаранні і адразу ж іх ліквідоўваць. У кожным лясгасе ёсць мабільная група, укамплектаваная трактарам і спецыяльнымі ранцавымі апрыскальнікамі. Спецыялісты гавораць, калі б тэхніка і тактыка, якія выкарыстоўваюцца пры тушэнні пачатковых ачагоў у Беларусі, прымянялася ў суседняй краіне — не было б таго бедства, якое мы бачым па ТБ. Важна і тое, хто ў лесе гаспадар. У Расіі большасць лясоў даўно здадзеная ў арэнду. А арандатару патрэбна толькі добрая драўніна.

У гэтым сезоне, ва ўмовах жудаснай спякоты, на Гомельшчыне усе аб'ядналіся ў намаганнях не дапусціць трагедыі — міліцыя, леснікі і выратавальнікі. У пастаяннай гатоўнасці знаходзіцца дэсантная група выратавальнікаў, якая на працягу гэтага лета некалькі разоў тушыла ўзгаранні ў цяжкадаступных месцах і высаджвалася непасрэдна ў ачаг агню. Як ніколі своечасовым на Гомельшчыне было прыняцце яшчэ ў пачатку лімітавання рашэння аб забароне наведвання лясоў і ўезду ў іх транспарту, а цяпер і перанос тэрмінаў пачатку сезона палявання. Зразумела ж усім: нельга дапусціць, каб з выпадковай іскры разгарэлася полымя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«БЕЛАРУСКІ ШЫКОЎНЫЯ, ТАМУ ШТО БЕЗ ПЛАСТЫКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Якія ўмовы на конкурсе?

— «Міс свету» — самы маштабны конкурс сярод дзяўчат. «Місіс свету» — самы маштабны сярод жанчын. Умовы для ўдзелу: рост не ніжэй за 170 см, мець шлюб, наяўнасць дзяцей пажаданая. Дэфіле ў купальніках у фінале шоу не будзе, але арганізатары вельмі прасілі, каб удзельніцы цудоўна выглядалі ў купальніках. Таму што часта бывае — здымкі дасылаюць пад такім фоташопам, што калі пасля бачаць дзяўчыну ў рэальнасці, яе проста не пазнаюць. Сёлета, калі я запаўняла анкету, вельмі шмат было пытанняў пра пластычную хірургію. Арганізатары высвятлялі, ці рабілі мы пластыку. У мяне ўсё натуральнае — ніякай пластыкі няма, мне прасцей. Яшчэ адна з умоў — гэта вызначыцца з нацыянальнай стравай, якую патрэбна будзе прыгатаваць на конкурсе. Я вырашыла, што за 40 хвілін, якія адведзеныя на конкурс, найлепш я прыгатую дранікі. Хутка, смачна, элементарна і нацыянальна! Нават сама назва — дранікі — гэтаксама гучыць і па-англійску. Ні разу не бачыла замежніка, які б у рэстаране дранікі называў як-небудзь па-іншаму. Толькі дранікі.

— Ці скарыстаеце ў Вільнюсе свой «в'етнамскі вопыт»? Ці ёсць у такіх конкурсах «рэцэпт перамогі»?

— Вядома. Увогуле, на кожным конкурсе існуюць свае правілы паводзінаў. Найперш ты павінна быць падрыхтаваная псіхалагічна: нават калі стамілася, не паказваць гэтага. Людзей зусім не хвалююць твае праблемы, людзі чакаюць ад цябе пазітыву. Па-першае, пазітыўнае стаўленне да жыцця. Ты павінен заўсёды выпраменьваць радасць і выглядаць на 110 балаў.

— А па-другое?

— Па-другое, імідж краіны. Пэўны палітычны момант ёсць нават у конкурсах прыгажосці. Напрыклад, падчас конкурсу «Місіс свету» летась трэцяе месца заняла в'етнамка (гаспадыня конкурсу), другое — амерыканка (бо конкурс сам амерыканскі), перамога — у расіянкі (Расія была адным з асноўных спонсараў). На «Місіс Сусвет» — усяго 25 удзельніц. Выдзеліцца і запомніцца будзе прасцей. Тым больш яшчэ летась мне казалі: беларускі шыкоўныя, таму што натуральныя — без пластыкі. У Амерыцы людзі прывыклі да штучнасці.

— На каго пакінеце сына Віталіка?

— Сын застаецца ў вялікай кампаніі дзвюх бабуль, мужа і прабабулі. Сын і муж прыедуць да мяне ў Вільнюс 20 жніўня ўвечары, якраз напярэдадні фіналу. Буду іх вельмі чакаць.

— Як ставіцца муж да актыўнага ўдзелу сваёй жонкі ў конкурсах прыгажосці?

— Мы з мужам любім экстрым. Недзе нешта ёсць — раз — давай паспрабуем. У жыцці, каб трымацца, трэба нешта прыдумляць. Мы разам ужо дзевяць гадоў. Кожны раз, калі я вяртаюся з конкурсу, ён на мяне нават глядзіць па-іншаму, быццам прыязджае іншая жонка. Гэта яму падабаецца, хоць ён і не кажа. Але, як жанчына, я гэта адчуваю. Гэтыя перажыванні неяк больш згуртоўваюць сям'ю, робяць яе мацнейшай.

— Ці плануеце яшчэ дзяцей?

— Так, я вельмі хацела б мець дзяўчынку. Першым дзіцем я заўжды хацела хлопчыка, і калі ў мяне нарадзіўся хлопчык, была самай шчаслівай мамай у свеце. Але гадаваць дзіця — адказна і няпроста: і фізічна, і матэрыяльна. На другое дзіця я рашуся, калі буду ведаць, што змагу яго забяспечыць. Я ніколі не баялася цяжкасцяў, таму калі буду ведаць, што ў мяне атрымаецца, у мяне абавязкова будзе другое дзіця! І я яго вельмі хачу!

Гутарыў Ілья ЛАПАТО.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса,13А

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв: 13.00-14.00,

тел. 227-52-36, 226-03-01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 13 (по генплану)» в г. Минске.

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-1762 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 15.10.2009 г.

Земельный участок площадью 0,1873 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома – 23-этажное, односекционное. Количество жилых помещений жилого дома – 126. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства – декабрь 2009 года.

Окончание строительства в соответствии с ПОС – декабрь 2011 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 26.05.2009 № 1164-5/09.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без отделочных работ в текущих ценах составляет – 3 201 870 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 03.12.2009 № 27/09, генподрядчик – ОАО «Стройтрест № 7».

Ожидаемый ввод жилой части в эксплуатацию в соответствии с договором строительного подряда – март 2011 г.

Прием и регистрация заявлений на строительство квартир жилого дома будет осуществляться в каб. 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

Генеральный директор **Е.И. Вовна**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»

220050, г.Минск, ул. К. Маркса,13А

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв: 13.00-14.00,

тел. 227-44-76, 227-65-53

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул.Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-5 (1 очередь строительства). Жилой дом №1 по генплану» в г. Минске.

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-1737 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 01.10.2009.

Земельный участок площадью 0,2853 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано 5-секционным, 10-11-13-этажным. Количество жилых помещений жилого дома – 242, серия – индивидуальная. На первом этаже жилого дома расположены: магазин промышленных товаров, книжный магазин, нотариальная контора, офисные помещения, имеющие отдельные входы.

Начало строительства – ноябрь 2009 года.

Окончание строительства в соответствии с ПОС – декабрь 2011 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 23.04.2009 № 929-5/09 с дополнением от 09.07.2009 № 1266-5/09;.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться на строительство офисных помещений: № 1 – площадью 138,62 м², № 2 – площадью 145,97 м², № 3 – площадью 75,84 м², № 4 – площадью 232,12 м², нотариальной конторы – площадью 140,57 м², магазина промтоваров – площадью 226,72 м², книжного магазина – площадью 145,63 м².

Предметом договора будет являться строительство нежилых помещений.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади нежилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет: офисное помещение № 1 – 5142210 руб.; офисное помещение № 2 – 5127350 руб.; офисное помещение № 3 – 5134830 руб.; офисное помещение № 4 – 4947220 руб.; нотариальная контора – 5117080 руб.; магазин промтоваров – 5172430 руб.; книжный магазин – 5147960 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 06.10.2009 № 28, генподрядчик – ОАО «Стройтрест № 1».

Прием и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве нежилых помещений будет осуществляться в каб. 401, по адресу г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

Генеральный директор **Е.И. Вовна**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса,13А

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв: 13.00-14.00,

тел. 227-52-36, 226-03-01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д.36.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-5 (2 очередь строительства). Жилой дом № 24 по генплану в г. Минске.

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-1691 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 27 августа 2009 г.

Земельный участок площадью 0,1995 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано 5-секционным, 9-этажным. Количество жилых помещений жилого дома – 197, серия – 3А-ОПБ.

Начало строительства – август 2010 года.

Окончание строительства в соответствии с ПОС – март 2011 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 22.07.2010 № 665-60/10;

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с учетом выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 2 355 100 руб. – для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий; 2 797 730 руб. – для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Предусмотреть не более 50% общей площади жилых помещений для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и

11
ЖНІЎНЯ
2010 г.
СЕРАДА
№ 29 (15632)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Ёсць пытанне

ЦІ МОЖА МАЛАДЫ СПЕЦЫЯЛІСТ ЗВОЛЬНІЦЦА БЕЗ НАСТУПСТВАЎ?

— Калі студэнт-платнік размеркаваўся па сваім жаданні, але месца працы яго не задавальняе, ці можа ён звольніцца без наступстваў для сябе? І ці трэба яму звяртацца ў ВНУ па даведку аб свабодным працаўладкаванні?

Ж.Д., *Мінская вобласць.*

На пытанні чытачоў «Звязды» адказвае **намеснік старшыні Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, старшыня Рэспубліканскага савета старшыняў прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Раман ДАПІРА.**

— Былы студэнт-платнік, які пажадаў размеркавацца, можа не прыступаць да працы ці звольніцца на агульных падставах. Гэта значыць, што на працягу двух гадоў, якія маладому спецыялісту належыць адпрацаваць па размеркаванні, ён можа спыніць свае працоўныя адносіны з наймальнікам у любы момант. І пры гэтым на яго не распаўсюджваюцца нормы, што ўтрымліваюцца ў Палажэнні аб вяртанні сродкаў у рэспубліканскі і (ці) мясцовыя бюджэты, выдаткаваных дзяржавай на падрыхтоўку рабочага (служачага), спецыяліста. Праўда, пры ўмове заключэння з наймальнікам двухгадовага кантракта (асабліва калі ў арганізацыі ці на прадпрыемстве ёсць вострая патрэба ў кадрах) звольніцца будзе больш праблематычна, чым пры заключэнні працоўнага дагавора. Таму, калі былога студэнта-платніка штосьці не задавальняе, лепш увогуле не прыступаць да працы па размеркаванні.

Трэба мець таксама на ўвазе, што ў выпадку адмовы працаваць па накіраванні і пры звальненні маладым людзям, якія праходзілі навучанне за кошт уласных сродкаў, трэба будзе звярнуцца ва ўстанову адукацыі, якая выдала ім накіраванне па даведку аб самастойным працаўладкаванні. Сутнасць у тым, што ў адпаведнасці з Палажэннем аб размеркаванні наймальнікі, незалежна ад формы ўласнасці арганізацыі, пры прыёме на працу выпускнікоў дзяржаўных установ адукацыі на працягу аднаго года пасля атрымання імі прафесійна-тэхнічнай і двух гадоў — пасля атрымання сярэдняй спецыяльнай ці вышэйшай адукацыі павінны патрабаваць ад іх пасведчанне аб накіраванні на працу ці даведкі аб самастойным працаўладкаванні. Магчыма, у камісіі па размеркаванні на час звароту па такую даведку будуць у наяўнасці пэўныя заяўкі ад іншых наймальнікаў, якія могуць выпускніка зацікавіць. Але атрымаць новае накіраванне на працу будзе яго правам, а не абавязкам.

— Хацелася б даведацца, з якога моманту трэба весці адлік працы па размеркаванні: з моманту размеркавання і афармлення накіравання на працу ці з моманту заключэння дагавора з наймальнікам?

Д. РЫЖОЎ, *г. Пінск.*

— У адпаведнасці з пунктам 5 Палажэння аб размеркаванні, рабочымі (служачымі) ці маладымі спецыялістамі з'яўляюцца выпускнікі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную ці вышэйшую адукацыі першай і другой ступені на дзённай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовага бюджэтаў, накіраваныя на працу па размеркаванні, гэта значыць, з дня атрымання накіравання. У той жа час трэба мець на ўвазе, што тэрмін працы па размеркаванні адлічваецца з дня заключэння працоўнага дагавора (кантракта) паміж маладым рабочым (служачым) ці маладым спецыялістам і наймальнікам і складае адзін год пасля атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі і два гады — пасля атрымання сярэдняй спецыяльнай ці вышэйшай адукацыі.

— Я ведаю, што ў некаторых рэгіёнах наймальнікі часткова кампенсуюць кошт арэнды жылля, якое вымушаны наймаць маладыя настаўнікі. Ці абавязаны гэта рабіць усе арганізацыі?

Т. САЛАНЕНКА, *Пухавіцкі раён.*

— У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, наймальнік не абавязаны забяспечваць маладых спецыялістаў жылымі памяшканнямі. У адпаведнасці з пунктам 28 Палажэння аб размеркаванні выпускнікоў установ адукацыі маладым спецыялістам , якія прыбылі на працу па размеркаванні, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама арганізацыі пры недастатковасці ўласнага жыллёвага фонду могуць выдаткоўваць сродкі з мэтай кампенсацыі ім выдаткаў на наём жылых памяшканняў у грамадзян.

Умова аб выдзяленні маладым спецыялістам жылога памяшкання наймальнікам можа быць таксама агаворана ў накіраванні на працу, працоўным дагаворы (кантракце) ці ў калектыўным дагаворы.

Што тычыцца непасрэдна маладых настаўнікаў, то, на жаль, арганізацыям адукацыі не выдзяляюцца бюджэтныя асігнаванні на кампенсацыю выдаткаў, звязаных з арэндай настаўнікамі жылля ў адпаведных населеных пунктах (нават часткову). У той жа час у некаторых рэгіёнах па хадайніцтве органаў адукацыі і камітэтаў Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі створаныя фонды падтрымкі маладых спецыялістаў, якія прыехалі працаваць у сельскую мясцовасць. Сродкі з гэтых фондаў ідуць на выплату аднаразовай матэрыяльнай дапамогі для першапачатковага ўладкавання маладых спецыялістаў на новым месцы і частковай кампенсацыі ім выдаткаў па арэндзе жылля.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Выпрабавана на сабе

«КВАСНАЯ» ПРАЦА

Для студэнтаў лета — гэта не толькі пара адпачынку, калі можна забыцца пра лекцыі, канспекты і залікі. Большасць маладых людзей не губляюць дарма час і шукаюць сабе падпрацоўку.

Я таксама праз знаёмых знаёмай маёй сяброўкі ўладкавалася на працу прадаўцом квасу. Усё, што для гэтага было неабходна, — санітарная кніжка і трошкі практыкі ў працаўніка са стажам.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Маёй «настаўніцай» аказалася прыемная жанчына гадоў сарака. Квас яна называла сваім хобі: акрамя асноўнай працы адміністратарам у краме, у выхадныя зарабляла на летні адпачынак. Мне ў нейкім сэнсе вельмі пашанцавала, бо мая «настаўніца» працавала так ужо шэсць гадоў і добра ведала нюансы «кваснага бізнэсу». Усяго аднойчы я прыехала да яе. Жанчына падрабязна расказала аб сістэме продажу, растлумачыла, каму і што трэба гаварыць, як паводзіць сябе ў пэўных сітуацыях, што рабіць і каму тэлефанаваць у надзвычайных (а такія бываюць!) выпадках, раскрыла ўсе «сакрэты майстэрства». « Усё астатняе ў працэсе зразумееш», — праз гадзіну сказала яна. Яшчэ праз некалькі хвілін патэлефанавала начальніку і коратка прамовіла: «Дзяўчына гатовая. Заўтра можа прыступаць да працы»...

У свой першы працоўны дзень я прыехала за гадзіну раней да дамоўленага напярэдадні часу. Здаецца, кожны мой рух, погляд, кожны крок выдаваў хваляванне. Зразумела, у гандлі ніколі не працавала, за плячыма мінімум тэорыі і ніякай практыкі, усё, пра што даведалася ўчора, здаецца, пераблыталася ды і дзень абяцаў быць вельмі гарачым, а значыць сумаваць не давядзецца.

— Прывітанне, Юля. Ну, ці гатова прыступіць да працы? — я ўбачыла маладога мужчыну, які, як высветлілася, і быў гаспадаром майго гандлёвага пункта.

— Так...

— А што за няўпэўненасць? Сумнявацца няма калі. Месца тут добрае, народу шмат...

Пакуль малады хлапец, які ўладкаваўся на лета працаваць грузчыкам, выстаўляў ярка-жоўты кіёск з надпісам «Халодны квас», я даведалася, што мой працоўны дзень будзе пачынацца ў 9 гадзін раніцы і заканчвацца ў 9 вечара. За пару хвілін мне расказалі, што гаварыць і якія дакументы паказваць санэпідэмстанцыі і пакупнікам, калі папросяць, што ні ў якім разе не трэба з імі сварыцца і заўсёды ўсміхацца.

— Ну, усё, поспехаў... Калі што, тэлефануй..., — сказаў мой начальнік на развітанне.

Першы пакупнік падышоў праз некалькі хвілін:

— Добрай раніцы. А квас смачны?

— Я не ведаю... напэўна, смачны...

Мужчына ўсміхнуўся:

— Як гэта вы квас прадаяце, а самі нават не пакаштавалі? Ну наліце мне маленькую шкляначку...

Тут я злавіла сябе на думцы, што не толькі не ведаю, што прадаю, але нават не вывучыла кошт. Сарамліва я паглядзела яго на вывесцы, а пакуль дрыжачымі рукамі налівала першую ў сваёй працы шклянку квасу, у галаве лічыла рэшту. Працягнула напой мужчыне. Пачуўшы ў адказ «дзякуй», выдыхнула. Здаецца, усё добра. Падняла вочы і... убачыла чаргу ў некалькі метраў! «Божухна, дапамажы мне!» — сказала я сама сабе, а ўслых з усмешкай на твары:

— Добрай раніцы. Што вы жадаеце?

Час цягнуўся несправядліва доўга. Людзей не меншала, а спякотнае сонца сляпіла вочы. Мне не было калі нават спаліць смагу, не гаворачы пра абедзенны перапынак. Не ведаючы што рабіць часам, хацелася закрыць твар рукамі і заплакаць. Да вечара я стамілася так, што ледзь магла гаварыць. Затое, ужо на памяць ведала кошт усяго асартыменту, магла з лёгкасцю падлічыць такія лічбы, над якімі раней думала б значна больш часу. Што ж, хоць адзін плюс — у матэматыцы папрактыкуюся.

З кожным днём я больш і больш уцягвалася ў працоўны працэс. Усё атрымлівалася значна хутчэй, не даводзілася па кожным пытанні тэлефанаваць начальніку. Але праз тыдзень я малілася, каб пайшоў дождж і можна было выспацца, дзянёк адпачыць. Прызнаюся, часам мне нават здавалася, што я ненавіджу людзей, якія з 9 раніцы да самага вечара ідуць і ідуць, а чарзе няма канца краю. Спачатку мяне вельмі раздражнялі пытанні тыпу: «А ў вас квас? Вы яго прадаяце?», «Гэта такі квас, як у маёй маладосці?» (адкуль я ведаю, які ён быў задоўга да майго нараджэння!), « Ён мне спадабаецца?». Маладыя дзяўчаты цікавіліся, колькі ў ім калорый. Але ж самым папулярным было пытанне, якое мне задавалі, гледзячы на сметніцу з пустымі ёмістасцямі побач з кіёскам: «А вы што іх потым мыеце?».

Акрамя гэтага, людзі чамусьці думалі, што калі я тут працую, то абавязкова ведаю маршруты і расклад усіх аўтобусаў, дзе знаходзяцца ўсе крамы, аптэкі, бальніцы, аддзяленні сувязі, банкаматы, аўтастаянкі, цырульні і г. д. З часам ад усяго гэтага я пачала нават атрымліваць асалоду і сапраўды ведала адказы на ўсе пытанні. Больш за тое, у мяне з'явілася шмат знаёмых, пастаянных кліентаў. Адзін дзядуля купляў квас кожную раніцу і замест «дзякуй» працягваў цукерку «Мишка на севере». Дзіўна, але неаднойчы бывала, калі зусім незнаёмыя гараджане падыходзілі і проста пачыналі расказваць пра сваё жыццё, цікавыя выпадкі, нават раіліся. Здаралася наадварот. Людзі ж розныя бываюць... Я нават думала, што некаторыя з іх прыходзілі зусім не па квас, а толькі для таго, каб пасварыцца. Як я цяпер спачуваю і адначасова дзіўлюся жалезнай вытрымцы людзей, якія цэлы дзень стаяць за касай у краме! Але ж у кожнай працы ёсць свае плюсы і недахопы. У прадаўца, напэўна, адначасова і першым і другім з'яўляецца пастаянны кантакт з людзьмі.

Праз пэўны час я стала сапраўдным прафесіяналам, ведала ўсе месцы з квасам у горадзе, пасябравала з «калегамі», да мяне ўжо прысылалі «кандыдатаў у прадаўцы» на стажыроўку. Цяпер, праязджаючы каля месца сваёй былой працы, успамінаю гэты час з сумам. Акрамя вопыту і грошай (дарэчы, за дзень у сярэднім можна зарабіць 70 тысяч беларускіх рублёў) я набыла шмат сяброў, пазітыўных эмоцый і цудоўны бронзавы загар.

Юля КАРОЛЬ,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.

ЗАВЕРЕНО
Директор Департамента
по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
Гальперин А.Л.
09.08.2010

УТВЕРЖДЕНО:
Протокол Наблюдательного
Совета ОАО «Технобанк»
14.07.2010 № 8

ТЕХНОБАНК

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ПЕРВОГО, ВТОРОГО И ТРЕТЬЕГО ВЫПУСКОВ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ТЕХНОБАНК»

1. Наименование.
На белорусском языке:
полное – Адкрытае акцыянернае таварыства «Тэхнабанк», сокращенное – ААТ «Тэхнабанк».
На русском языке:
полное – Открытое акционерное общество «Технобанк», сокращенное – ОАО «Технобанк».

2. Место нахождения, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).
Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.
Тел./факс: +375 17 283 15 05
Адрес в интернете: www.technobank.by
E-mail: info@technobank.by

3. Номера расчетных счетов, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций.
1 выпуск:
№ 3811000000000 в ОАО «Технобанк», код 182 (для юридических лиц – не банков).
№ 1811800182319 в ОАО «Технобанк», код 182 (для юридических лиц – банков).
2 выпуск:
№ 3811809780000 в ОАО «Технобанк», код 182 (для юридических лиц – не банков).
№ 1811800182003 в ОАО «Технобанк», код 182 (для юридических лиц – банков).
3 выпуск:
№ 3811808400004 в ОАО «Технобанк», код 182 (для юридических лиц – не банков).
№ 1811800182175 в ОАО «Технобанк», код 182 (для юридических лиц – банков).

4. Наименование периодического печатного издания, в котором публикуется бухгалтерская отчетность.
Годовая бухгалтерская отчетность эмитента публикуется в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным, также с данной информацией можно ознакомиться на сайте ОАО «Технобанк» по адресу: **www.technobank.by.**

5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, его местонахождение, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия лицензии.
ОАО «Технобанк» обслуживает депозитарий ОАО «Технобанк», расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/0385568, выданного Министерством финансов Республики Беларусь, срок действия – до 22 июня 2014 года.

6. Размер уставного фонда, количество акций по категориям и типам привилегированных акций, номинальная стоимость акции.
Сумма зарегистрированного уставного фонда составляет 46 586 939 800 (Сорок шесть миллиардов пятьсот восемьдесят шесть миллионов девятьсот тридцать девять тысяч восемьсот) белорусских рублей.
Уставный фонд разделен на 24 519 442 (Двадцать четыре миллиона пятьсот девятнадцать тысяч четыреста сорок две) акции, из них простых (обыкновенных) акций 24 455 229 (Двадцать четыре миллиона четыреста пятьдесят пять тысяч двести двадцать девять) штук и привилегированных акций 64 213 (Шестьдесят четыре тысячи двести тринадцать) штук. Номинальная стоимость акций – 1 900 (Одна тысяча девятьсот) рублей.

7. Дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего.
Эмитент зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь как ООО СКБ «Технобанк» 5 августа 1994 года, регистрационный номер № 47, преобразован в ОАО СКБ «Технобанк» 1 июня 1995 года, переименован в ОАО «Технобанк» 5 мая 2000 года. ОАО «Технобанк» (далее – Банк) является правопреемником всех прав и обязанностей ЗАО «Торгово-Промышленный банк», ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

8. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.
Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу:
в офисе ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 с 9.00 до 16.00;
на интернет-сайте эмитента: www.technobank.by.

9. Дата принятия решения о выпуске облигаций, номер протокола и наименование органа, принявшего это решение.
Решение о выпуске облигаций принято Наблюдательным Советом ОАО «Технобанк» 14 июля 2010 года, протокол № 8.

10. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.
1 выпуск:
К открытой продаже предлагаются 300 000 (Триста тысяч) именных дисконтных облигаций в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).
Серия «ТБ-1», номера «000001 – 300000».
Объем эмиссии составляет 30 000 000 000 (Тридцать миллиардов) белорусских рублей.
2 выпуск:
К открытой продаже предлагаются 3 000 (Три тысячи) именных дисконтных облигаций в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).
Серия «ТБ-2», номера «0001 – 3000».
Объем эмиссии составляет 3 000 000 (Три миллиона) ЕВРО.
3 выпуск:
К открытой продаже предлагаются 3 000 (Три тысячи) именных дисконтных облигаций в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).
Серия «ТБ-3», номера «0001 – 3000».
Объем эмиссии составляет 3 000 000 (Три миллиона) долларов США.

11. Номинальная стоимость облигаций.
1 выпуск – 100 000 (Сто тысяч) белорусских рублей.
2 выпуск – 1 000 (Одна тысяча) ЕВРО.
3 выпуск – 1 000 (Одна тысяча) долларов США.

12. Цель выпуска облигаций.
Облигации выпускаются с целью привлечения свободных денежных средств юридических лиц для формирования ресурсной базы банка.

13. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.
Облигации выпускаются без обеспечения в соответствии с подпунктом 1.8. пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 года № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг».

14. Сведения о согласовании выпуска облигаций с Национальным банком Республики Беларусь.
Выпуск облигаций осуществляется в пределах восьмидесяти процентов от суммы нормативного капитала эмитента по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь. (Постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от «26» июля 2010 года № 311).

15. Период проведения открытой продажи облигаций.
Дата начала продажи: 16 августа 2010 года.
Дата прекращения продажи: 16 августа 2012 года.

16. Место и время проведения открытой продажи облигаций.
Открытая продажа (размещение) осуществляется:
- на внебиржевом рынке по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 ежедневно в течение банковского дня на основании договора первичного размещения облигаций;
- на биржевом рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с регламентом торгов.

17. Срок обращения облигаций.
1 выпуск: с 16 августа 2010 года до 27 декабря 2012 года (864 дня);
2 выпуск: с 16 августа 2010 года до 21 декабря 2012 года (858 дней);
3 выпуск: с 16 августа 2010 года до 19 декабря 2012 года (856 дней).

18. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций.
Погашение облигаций осуществляется по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44 в ОАО «Технобанк» с 9.00 до 16.00 в рабочие дни по следующим датам:
1 выпуск – начиная с 27 декабря 2012 года;
2 выпуск – начиная с 21 декабря 2012 года;
3 выпуск – начиная с 19 декабря 2012 года.
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций. Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций.
Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев в день погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций. Списание денежных средств производится по реквизитам последнего держателя, указанного в реестре владельцев облигаций ОАО «Технобанк», сформированном депозитарием эмитента за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций. Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета эмитента по реквизитам владельцев облигаций.
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете банка до непосредственного обращения владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При погашении облигаций владельцам возмещается номинальная стоимость облигаций денежными средствами в сумме и валюте номинала облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

19. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты.
Цена продажи облигаций в период открытой продажи устанавливается эмитентом из расчета следующей доходности:
1 выпуск - 15% годовых к погашению;
2 выпуск - 8% годовых к погашению;
3 выпуск - 8% годовых к погашению.

Годовая доходность по облигациям рассчитывается по следующей формуле:

$$Дг = \frac{(Н - Ц) \times 100}{Ц} / (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}),$$

где:
Дг – годовая доходность по облигациям (процентов годовых);
Н – номинальная стоимость облигаций;
Ц – цена продажи облигаций;
Т365 – количество дней срока обращения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней до погашения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Количество дней до погашения облигаций определяется со дня их продажи по день погашения. При этом день продажи и день погашения считаются одним днем.

Текущая стоимость облигаций рассчитывается по следующей формуле:

$$С = Ц + \frac{Ц \times Д}{100} \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}),$$

где:
С – текущая стоимость облигаций;
Ц – цена продажи облигаций, установленная эмитентом в день начала открытой продажи;
Д – доходность, рассчитанная исходя из цены продажи на дату начала размещения облигаций (процентов годовых), установленная эмитентом;
Т – количество дней обращения дисконтных облигаций данного выпуска. Количество дней обращения дисконтных облигаций определяется с даты начала их размещения по дату расчета их текущей стоимости. При этом день начала размещения дисконтных облигаций и день расчета их текущей стоимости считаются одним днем;
Т365 – количество дней срока обращения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней до погашения облигаций, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Расчет цены продажи и текущей стоимости облигаций осуществляется исходя из фактического количества дней в году.
При расчете количества дней срока обращения (до погашения) и периода начисления дохода первый и последний дни срока (периода) считаются одним днем. При этом, если срок (период) делится переходом с календарного года, состоящего из 365 дней, на календарный год, состоящий из 366 дней, либо наоборот, то при определении значений Т365 и Т366 уменьшается количество дней в первой части периода независимо от количества дней в календарном году.
При определении текущей стоимости и цены продажи облигации расчет дохода производится по каждой облигации с точностью до одного рубля по облигациям, номинированным в белорусских рублях, и до двух знаков после запятой по облигациям, номинированным в иностранной валюте, с округлением в соответствии с Правилами начисления процентов в банках Республики Беларусь.
Облигации продаются по цене ниже номинальной стоимости и погашаются по номинальной стоимости.
Доходом у держателя облигаций является дисконт, который в случае приобретения облигаций до погашения рассчитывается по формуле:

Д = Н - Ц,

где:
Д – дисконт (доход);
Н – номинальная стоимость облигаций;
Ц – цена покупки облигации.
В случае досрочного выкупа облигаций эмитентом доход рассчитывается по формуле:

Д = Цв - Ц,

где:
Д – дисконт (доход);
Цв – цена выкупа эмитентом;
Ц – цена покупки облигации.

20. Минимальная цена продажи облигаций.
1 выпуск – 73 819 (Семьдесят три тысячи восемьсот девятнадцать) белорусских рублей.
2 выпуск – 841,86 (Восемьсот сорок один ЕВРО восемьдесят шесть евроцентов).
3 выпуск – 842,17 (Восемьсот сорок два доллара США семнадцать центов).

21. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций.
При запрещении выпуска ценных бумаг эмитент в месячный срок с момента получения от регистрирующего органа уведомления о запрещении выпуска ценных бумаг возвращает инвесторам средства, полученные в оплату размещенных ценных бумаг.

22. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия конвертации, условия и порядок досрочного погашения облигаций.
Эмитент имеет право выкупать облигации по договорной цене в течение всего срока обращения. Выкуп облигаций осуществляется эмитентом на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и/или на биржевом рынке в порядке, установленном ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
Эмитент имеет право продавать на вторичном рынке облигации по договорным ценам.
Эмитент имеет право досрочно погасить выкупленные облигации с прекращением обязательств по облигациям в силу совпадения должника и кредитора в одном лице согласно статье 383 Гражданского кодекса Республики Беларусь.
Эмитент имеет право совершать иные операции с облигациями, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.
Конвертация облигаций не производится.

23. Дата и номер государственной регистрации облигаций.
1 выпуск № 5-200-02-0712 от «09» августа 2010 года.
2 выпуск № 5-200-02-0713 от «09» августа 2010 года.
3 выпуск № 5-200-02-0714 от «09» августа 2010 года.

И.О. Председателя Правления **Н.А. Сурдо**
Главный бухгалтер **Н.А. Кузьмицкая**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010 г.

АЭРАПОРТ ПАБУДАВАЛІ

І адшукалі «Восьмы цуд свету»

Самыя актыўныя і самыя пазітыўныя дзяўчаты і юнакі — так самі сябе ахарактарызавалі ўдзельнікі Віцебскага абласнога лагера актыву Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Гэты лагер, які дзейнічаў у Віцебскім раёне на базе аздараўленчага лагера «Чайка», не мае аналагаў у краіне, значна адрозніваецца ад звычайных. Каб трапіць сюды, трэба такое права заслужыць.

гадоў у лагеры шукалі «Восьмы цуд свету» — такую назву мела ролевая гульня, якую праводзілі падчас усёй змены. Пабудавалі «Аэрапорт» падчас удзелу ў ёй. Арганізавалі канцэрт міру, фестываль моладзевых песень. Працавала творчая лабараторыя — моладзь навучалася азам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Падчас размовы з вясёлымі і шчырымі актывістамі карэспандэнт высветліў: яшчэ адна асаблівасць лагера ў тым, што большасць з выхавальнікаў — былыя ўдзельнікі змены. Каманда выхавальнікаў тут называецца «СЛОН». «СЛАНы» на роўных з тымі, каго выхоўвалі, рабілі ўсё для таго, каб змена была як мага больш карыснай. Разам пісалі сцэнарыі, рыхтавалі розныя праграмы...

Фота Сяргея САВЕЛЬЕВА.

Змена з удзелам лідараў пярвічных арганізацыі — па-свойму ўнікальная стартавая пляцоўка для актывістаў, якая дазваляе ім яшчэ больш развіць у сабе лідарскія якасці. Адпаведна, потым у сваіх родных школах, ліцэях і гэтак далей яны змогуць рэалізоўваць новыя праекты...

Каля дзевяноста актывістаў ва ўзросце ад 14 да 18

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *Віцебскі раён.*

Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж» приобретает на баланс Общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные ОАО «Сантехэлектромонтаж», в количестве до 4200 штук по цене 25000 белорусских рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами с целью дальнейшей продажи инвесторам. Выкуп простых (обыкновенных) акций будет производиться в период с 30.08.2010 г. по 10.09.2010 г. с оформлением сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям.

Оплата приобретенных Обществом акций будет производиться не позднее 60 (Шестидесяти) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи. Форма оплаты наличными денежными средствами или путем безналичного расчета. Срок, в течение которого акционеры должны предоставить предложение о продаже принадлежащих им акций, — с 12.08.2010 г. по 27.08.2010 года. Срок, в течение которого осуществляется совершение сделок купли-продажи акций, — с 30.08.2010 г. по 10.09.2010 года. Сделки заключаются по адресу: 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а. Конт. тел. 8 0232 57 41 91.

УНП 400052115

ЗАМУЖ З ДАЗВОЛУ НАЧАЛЬНІКА

Зразумела, што працаголікі сустракаліся ва ўсе часы, і ўсё ж сёння залішняе «захапленне» той аб іншай справай — хутчэй, проста асабістае жаданне. Між тым яно было вырашальным далёка не заўсёды. Бо існуе дакладны гістарычны факт: напрыканцы пазамінулага стагоддзя вялікім «прарывам» у колішняй Расійскай імперыі стала прыняцце афіцыйнага абмежавання працоўнага дня працягласцю... у 11,5 гадзіны. А што да звыклага цяпер 8-гадзіннага «стандарту», то ў Беларусі ён стаў дзейнічаць значна пазней — па сутнасці, толькі за савецкім часам.

Кодэкс аб працы выдання 1931 года — адзін з цікавых экспанатаў музея гісторыі прафсаюзнага руху.

БЕЛАРУСЫ СВЯТКАВАЛІ ДЗЕНЬ... ПАРЫЖСКІХ КАМУНАРАЎ

Параўнанне — рэч даволі цікавая. Але пры гэтым нельга не заўважыць, што цяперашняе працоўнае заканадаўства «вядзе» свой адлік зноў жа з першых савецкіх гадоў. Менавіта тады з'явіліся патрабаванні скарачаць працоўную змену для няпоўнагадовых, умова выплаты адпускных напярэдадні водпуску, вызначаныя «звыклыя» сёння падставы для звальнення па патрабаванні працадаўцы. А плюс да таго, была «пацверджаная» знаёмая нам забарона на працу па святах.

— Праўда, самі святочныя дні былі крыху іншымі, — распавядае загадчык музея гісторыі прафсаюзнага руху Беларусі Таццяна Няфёдава. — Так, у пачатку 1930-х гадоў афіцыйнымі святамі ў нас лічыліся 1 студзеня — Новы год і Дзень абвяшчэння БССР, 22 студзеня — Дзень памяці Леніна, 12 сакавіка — Дзень звяржэння царскага самаўладдзя, 18 сакавіка — Дзень Парыжскай камуны, 1-2 мая — дні Інтэрнацыяналу, а таксама 7-8 лістапада — дні Пралетарскай рэвалюцыі.

14 З ВЫКЛЮЧЭННЯМІ

Не менш значная ўвага надавалася заключэнню працоўных дагавораў. Тут таксама дзейнічала амаль «сучаснае» правіла — заканадаўства дазваляла ўладкаванне з 14-гадовага ўзросту. Аднак не абыходзілася без выключэнняў, і асабліва — у 1920-я гады.

— У 1925 годзе па ініцыятыве Усесаюзнага цэнтральнага савета прафсаюзаў у СССР было прынятае рашэнне заключыць пісьмовыя працоўныя дагаворы з усімі парабкамі ў сельскай гаспадарцы, — распавядае Таццяна Няфёдава. — Як вынік, ужо праз год каля 400 тысяч парабкаў па ўсім Саюзе ўступілі ў прафсаюз сельскагаспадарчых рабочых. І ў тым ліку тое датычыцца Беларусі. У нашых фондах ёсць вельмі цікавы дакумент — працоўны дагавор 1925 года, які быў падпісаны парабкам Андрэем Бараноўскім, гаспадарамі грамадзянамі Воранавымі з вёскі Кулікі і прадстаўніком раённага прафсаюзнага бюро. Паводле гэтага дагавора, парабак павінен быў на працягу шасці месяцаў пасвіць 4 каровы, а гаспадары — выплачваць грашамі ці натурай 10 пудоў жыта, 18 пудоў бульбы і 2 фунты воўны на суму 10 рублёў 50 капеек у месяц. Адначасова грамадзяне Воранавы бралі на сябе абавязак забяспечваць парабку харчаванне, выдаваць «у рабочыя і святочныя дні» вопратку, дазваляць водпуск або замест яго — даваць грашовую кампенсацыю, плаціць у выпадку хваробы за лячэнне, а ў выпадку датэрміновага звальнення — і плаціць выхадную дапамогу. Але ці не самае адметнае: гаспадары Воранавы прымалі абавязак адпускаць парабка ў... школу. Бо парабку Андрэю Бараноўскаму было 13 гадоў. Прычым, як вынікае з таго ж дагавора, ён ужо меў 4-гадовы працоўны «стаж».

АДГУЛ У «КРЫТЫЧНЫЯ ДНІ»

З пункту гледжання гісторыі сто гадоў — адрэзак нібыта нязначны. І разам з тым за гэты час сапраўды адбыліся значныя змены, у прыватнасці, у стаўленні да жанчын. Калі-нікалі перад імі нават стаяў даволі недвухсэнсоўны выбар — праца ці асабістае жыццё. Вось адзін з прыкладаў. Яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя існавала правіла, паводле якога ў тэлеграфныя канторы прымаліся выключна незамужнія дзяўчаты і бяздзетныя ўдовы ва ўзросце да 30 гадоў. А калі тая ж тэлеграфістка хацела захаваць сваё месца і адначасова стварыць сям'ю, то было неабходна ўзяць спецыяльны дазвол начальніка канторы. Прычым падобны дазвол даваўся на шлюб толькі з паштова-тэлеграфным работнікам і толькі пры ўмове пераводу на «другарадную пасаду».

— Зразумела, што нічога падобнага ў савецкім заканадаўстве ўжо не было, — зазначае Таццяна Няфёдава. — Наадварот, жанчыны сталі атрымліваць дадатковыя гарантыі, напрыклад, з'явілася забарона на прыцягненне жанчын да цяжкіх работ, жанчынам, якія чакаюць дзіця, далі права адмаўляцца ад службовай камандзіроўкі, узніклі дакладныя правілы дазволу на «дэкрэтныя» водпускі. Скажам, Кодэкс аб працы выдання 1931 года вызначаў, што на 8 тыдняў да і пасля родаў вызваляюцца ад працы жанчыны, якія занятыя фізічнай, і на 6 тыдняў да і пасля родаў — жанчыны, якія занятыя «канторскай і разумовай» працай.

Прычым асобныя арганізацыі пайшлі далей і вызначылі жанчынам дадатковыя перавагі ў калдагаворах. Некаторыя з гэтых гарантый (у прыватнасці, скарачэнне на гадзіну працоўнага дня з захаваннем аплаты для маці, якія «кормяць грудзямі і жывуць далёка ад працы») падаюцца цалкам слушнымі. А некаторыя і могуць выклікаць усмешку. Так, калектыўны дагавор 1923 года паміж «Дарпрафсожам» і праўленнем Заходняй чыгункі даваў права не выходзіць на свае працоўныя месцы 3 дні з аплатай па сярэднім заробку «жанчынам фізічнай працы» ў час... менструацыі.

ЗА СПАЗНЕННЕ — У ТУРМУ

Аднак падставы для жартаў з'яўляліся далёка не заўсёды. Аб існаванні ў Савецкім Саюзе крымінальнага артыкула «за гультайства», напэўна, ведаюць многія. Адкрыццём жа можа стаць іншае — у 1930-х гадах Кодэкс аб працы вызначаў літаральна наступнае: «Для змагання з навальнымі бядотамі ўсе грамадзяне БССР могуць прыцягвацца да працоўнай павіннасці паводле пастаноў акруговых, раённых камітэтаў і мясцовых Саветаў». Ад працоўнай павіннасці вызваляліся толькі асобы да 18 гадоў, жанчыны ад 40 і мужчыны ад 45 гадоў, часова непрацаздольныя грамадзяне, інваліды, жанчыны на працягу 8 тыдняў да і пасля родаў, а таксама жанчыны, якія «маюць дзяцей да 8 гадоў і не маюць спецыяльнай асобы для іх догляду».

Зрэшты, магчымасць прыцягнення да «працоўнай павіннасці» ў надзвычайных сітуацыях хоць неяк патлумачыць можна. Нашмат складаней зразумець логіку прыняцця 26 чэрвеня 1940 года пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб пераходзе на 8-гадзінны працоўны дзень, 7-дзённы працоўны тыдзень і аб забароне самавольнага сыходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў».

— Сёння цяжка паверыць, але гэта насамрэч было: у тым ліку пастанова ўводзіла крымінальную адказнасць за спазненне на працу і за датэрміновы сыход з працы, — распавядае Таццяна Няфёдава. — Тое ж спазненне лічылася злачынствам, і за яго людзі траплялі ў турму. Прычым падобная практыка працягвалася да 1951 года, калі, апроч выпадкаў неаднаразовага ці працяглага прагула, судовую адказнасць рабочых і служачых замянілі на меры дысцыплінарнага і грамадскага ўздзеяння.

АД ПУЦЁЎКІ ДА КАЛДАГАВОРА

Таксама цяжказразумелая сітуацыя, але гэта — яшчэ адзін рэальны факт. У 1958 годзе пасля расфарміравання машынна-трактарных станцый і перадачы тэхнікі ў калгасы з'яўляецца рашэнне прымаць у члены прафсаюза толькі старшыняў гаспадарак, іх намеснікаў, механізатараў, брыгадзіраў трактарных брыгад і дыпламаваных спецыялістаў. Калгаснікі астатніх прафесій знаходзіцца ў прафсаюзе не маглі. І такое правіла існавала аж да сярэдзіны 1970-х.

Адшукаць якія-небудзь важкія аргументы для прыняцця падобнага рашэння немагчыма. Хутчэй за ўсё, прычына проста ў тагачасным стаўленні да вяскоўцаў, якія фактычна лічыліся «людзьмі другога гатунку» — калгаснікам налічвалі «працадні», ім не давалі пашпарты, а плюс да таго і забаранілі ўступаць у прафсаюз. З адначасовай адмовай ад дадатковых гарантый па тых жа калдагаворах.

— Насуперак распаўсюджанай думцы, у савецкія часы абавязковага членства ў прафсаюзах не было, і разам з тым, у іх сапраўды знаходзілася абсалютная большасць работнікаў — апроч усяго, гэта давала магчымасць карыстацца стадыёнамі, бібліятэкамі і Палацамі культуры, прафсаюзы займаліся размеркаваннем пуцёвак і вырашэннем жыллёвых праблем, — заўважае Таццяна Няфёдава. — Што ж да апошняга часу, то тут «прыярытэты» змяніліся — на першы план выйшлі перамовы з наймальнікамі і падпісанне калектыўных дагавораў. Бо так было адпачатку: галоўнай мэтай наймальніка заўсёды з'яўлялася атрыманне максімальнага прыбытку з найменшымі выдаткамі. Тады як галоўнай задачай прафсаюза — дамагацца нармальных заробкаў і ўмоў працы.

Сяргей ГРЫБ.

ЯГО ЖЫЦЦЁ БЫЛО ТВОРЧЫМ ПАЛЁТАМ

Вячаслаў Андрэевіч ДУБІНКА быў яскравым прыкладам творчай энергіі і адданасці беларускай фотажурналістыцы і працяглы час працаваў у рэдакцыі «Звязды». Гэта быў час цікавых фотанарысаў і рэпартажаў з розных рэгіёнаў не толькі Беларусі, але і іншых рэспублік былога Савецкага Саюза. Як фотакарэспандэнт рэспубліканскай перыёдыкі — ад раённых да цэнтральных газет, ён ствараў каштоўны фоталетапіс жыцця краіны шасцідзясятых і сямідзясятых гадоў. Сваім бачаннем рэчаіснасці не стамляў здзіўляць гледачоў фотавыстаў і нашых колішніх чытачоў. Пазней Вячаслаў Андрэевіч займаўся літаратурнай дзейнасцю, пісаў дасціпныя і займальныя апавяданні і аповесці, выдаў дзесяць кніг. Беларускае слова было для яго сэнсам жыцця. Адным з моцных жыццёвых яго захапленняў стала адраджэнне і папулярызацыя традыцыйнай беларускай выцінанкі. У 2008 годзе ў сценах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі прайшла яго персанальная выстава. Народжаны на Случчыне, ён пранёс праз усё сваё жыццё вялікую любоў і павагу да малой радзімы. На вялікі жаль, жыццё гэтага адоранага Богам творцы было зусім нядоўгім, — усяго няпоўных 69 гадоў.

Калектыў газеты «Звязда» глыбока смуткуе з прычыны смерці нашага былога калегі і выказвае самыя шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

ЗВЯЗДОЎЦЫ.

Як стаць кадэтам?

1 верасня ў Мінску па вуліцы Стаханаўская, 13 адкрыецца новая навучальная ўстанова — Мінскае гарадское кадэцкае вучылішча № 1. Новы тып навучальных устаноў з'явіўся ў Беларусі згодна з Указам кіраўніка нашай дзяржавы ад 28 студзеня 2010 года № 54 «Аб кадэцкіх вучылішчах».

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў Камітэце па адукацыі Мінгарвыканкама, у Кадэцкім вучылішчы да звычайных урокаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах далучацца заняткі па ваеннай, страявой і агнявой падрыхтоўцы, баявых відах мастацтва і асновах прававых ведаў. Усе кадэты будуць забяспечвацца бясплатным харчаваннем і пражываннем у інтэрнаце. Аднак у адрозненне, напрыклад, ад Сувораўскага вучылішча, дзе рыхтуюць, пераважна, будучых ваенных, у Кадэцкіх вучылішчах будуць рыхтаваць таксама кадры для праваахоўных органаў і структур Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Першы набор навучэнцаў будзе ажыццяўляцца ў восьмы і дзявяты класы (па тры класы ў кожнай паралелі). **Тэрміны падачы дакументаў — з 2 па 15 жніўня.**

Дакументы, якія трэба падаць кандыдатам на званне кадэта:

1. Заяву на імя дырэктара кадэцкага вучылішча.
2. Ведамасць гадавых адзнак з класнага журнала за апошні год навучання з выведзеным сярэднім балам (сярэдні бал акругляецца да дзясятых) за подпісам кіраўніка агульнаадукацыйнай установы.
3. Медыцынскую даведку аб стане здароўя кандыдата.
4. Характарыстыку з месца вучобы за подпісам класнага кіраўніка і кіраўніка агульнаадукацыйнай установы.
5. Дакументы, якія пацвярджаюць права кандыдата на льготы.

Тэрміны правядзення псіхалагічнага адбору — **з 16 па 18 жніўня**.
Праверка фізічнай падрыхтоўкі — **з 19 па 21 жніўня**.
Экзамен па матэматыцы — **24 жніўня**.
Дыктоўка па беларускай (рускай) мове — **26 жніўня**.
Залічэнне — **28 жніўня**.
Кантактны тэлефон **230 34 24**.

Зразумела, што стан здароўя у будучых кадэтаў павінен быць выдатны. Патрабаванні да стану здароўя кадэтаў прад'яўляюцца такія ж як і пры паступленні маладых людзей у ваенныя вучылішчы. Да таго ж, усіх прэтэндэнтаў чакае псіхалагічны адбор — для праверкі іх гатоўнасці навучацца па праграмах, што прадугледжваюць ваенную падрыхтоўку. І толькі тыя з падлеткаў, якія пройдуць псіхалагічны адбор, будуць дапушчаны да праверкі ўзроўню іх фізічнай падрыхтоўкі. Трэці этап адбору — напісанне кантрольнай работы па матэматыцы і дыктоўкі па беларускай ці рускай мове. Без уступных іспытаў пры станоўчых выніках медыцынскага агляду і псіхалагічнага адбору ў кадэцкае вучылішча будуць залічвацца дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі, а таксама дзеці вайскоўцаў і асобаў кіруючага і радавога складу, якія загінулі (памерлі) пры выкананні абавязкаў ваеннай службы або службовых абавязкаў.

Вырашана, што для яднання вучнёўскага і педагагічнага калектываў першыя тры тыдні новага навучальнага года кадэты правядуць у гарадскім лагеры «Лідар», дзе для іх будуць арганізаваныя вучэбныя і трэніровачныя заняткі па фізічнай падрыхтоўцы, экскурсіі ў Акадэмію і музей Міністэрства ўнутраных спраў, на спартыўна-трэніровачную базу МУС, сустрэчы з работнікамі праваахоўных органаў і шэраг іншых мерапрыемстваў. А крыху пазней ва ўсіх кадэтаў з'явіцца і ўласная форма — работа над яе эскізамі ўжо кіпіць...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Публикацию о проведении собрания акционеров
ОАО «МИНСКИЙ ПОДШИПНИКОВЫЙ ЗАВОД»
(газета «Звязда» № 149 от 3.08.2010 г., 3-я полоса)
считать утратившей силу.
УНП 100103346

ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

13 сентября 2010 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Условия предоставления участка	Целевое назначение	Качество земли	Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ	Срок аренды, (лет)	Затраты на подготовку документации, бел. рублей	Начальная стоимость, бел. рублей	Сумма задатка, бел. рублей
1	пересечение ул. Ефремова - пр-та Космонавтов	340100000003002359	0,0024	Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории	установка рекламного светодиодного экрана	к землям сельскохозяйственного назначения не относятся	участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети	5	1 119 691	259 830	25 000
2	ул. Ильича, в районе кинотеатра «Мир»	340100000007005658	0,0015		установка рекламного светодиодного экрана		участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода — 0,0010 га	5	1 096 673	151 620	15 000
3	ул. Ильича, в районе ПО «Гомельчанка»	340100000007005659	0,0024		установка рекламного светодиодного экрана		участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи, водопровода, канализации — 0,0024 га	5	1 252 396	8 850	850
4	ул. Фрунзе	340100000001004695	0,0032		установка рекламного светодиодного экрана		участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: водоохранная зона р. Сож вне прибрежной полосы, охранная зона подземной кабельной линии связи — 0,0008 га; водоохранная зона р. Сож вне прибрежной полосы — 0,0024 га	5	1 158 782	216 410	21 000
5	ул. Нижнебрилевская	340100000004001161	0,0300	Произвести вынос водопровода диаметром 100 мм	магазина продовольственных товаров		участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона напорной канализации — 0,0006 га	50	551 580	4 129 820	412 000
6	ул. Оськина, микрорайон № 15	340100000007005709	0,0605	Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории	здания специализированного розничной торговли		участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона электрокабеля, канализации — 0,0152 га	30	1 754 524	3 633 590	363 000
7	ул. Белицкая, в районе жилого дома № 40	340100000007005708	0,0661		здания специализированного розничной торговли		участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона водопровода — 0,0006 га	30	1 578 198	4 027 400	402 000

1. Организатор аукционных торгов — управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 13 сентября 2010 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16 при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ«Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляют:

4.1 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь — доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 идивидуальные предприниматели — копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина — легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.5 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Горисполкомом может предоставляться рассрочка на срок не более 3 лет, в случаях когда размер платы за право заключения договора аренды земельного участка превышает 2 000 базовых величин для граждан и индивидуальных предпринимателей и 10 000 базовых величин для юридических лиц. Плательщик, претендующий на получение рассрочки, до принятия горисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду должен обратиться в горисполком о предоставлении ему рассрочки.

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням с 9-00 до 17-00 по 7 сентября 2010 г. включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: ул. Советская, 21а (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14-00 до 14-45 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт — www.gorod.gomel.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА СООБЩАЕТ

О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НАХОДЯЩИХСЯ В КОММУНАЛЬНОЙ СОБСТВЕННОСТИ ГОРОДА МИНСКА АКЦИЙ ОТКРЫТЫХ АКЦИОНЕРНЫХ ОБЩЕСТВ.

Аукцион состоится 29 сентября 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Продавец – Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр-т Независимости, 8.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются с 9.00 до 17.00 с 12 августа по 10 сентября 2010 г. по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. (8017) 200 20 89.

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения их копий Фондом, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, копию выданной Министерством финансов Республики Беларусь лицензии на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности на рынке ценных бумаг (профессиональным участникам рынка ценных бумаг);

индивидуальным предпринимателям – копию свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии Фондом;

представителям физических лиц – резидентам Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

представителям юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность;

документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки, в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц представляют копию документа, удостоверяющего личность, и его подлинник для заверения его копии лицом, принимающим документы.

Участником аукциона перечисляется задаток в белорусских рублях в размере 10 процентов от общей начальной цены заявленных лотов на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества не позднее 10 сентября 2010 года. Заверенная банком копия платежного поручения, подтверждающая внесение задатка, предоставляется Продавцу в течение двух рабочих дней со дня перечисления задатка.

Выигравшим торги на аукционе по каждому предложенному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену; внесенный им задаток учитывается при окончательных расчетах за приобретенные им акции. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в торгах по лоту подано только одним участником, то лот продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

При прохождении заключительной регистрации участники аукциона уведомляются о сумме затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения и на проведение оценки рыночной стоимости акций, согласно утвержденной фондом смете фактических расходов на организацию и проведение аукциона, а также о порядке и сроках их возмещения.

Договор купли-продажи акций заключается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона с участником, выигравшим торги.

Получить более подробную информацию об открытых акционерных обществах, акции которых предлагаются для продажи, можно по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 8, каб 227, конт. тел. (8017) 200 20 89.

№ лота	Наименование открытого акционерного общества (ОАО), местонахождение	Размер уставного фонда		Номинальная стоимость акции	Доля коммунальной собственности города Минска		Предлагается для продажи		Начальная цена продажи одной акции	Начальная цена лота*, рублей	Размер задатка, рублей	Наличие 10 % и более акций уставного фонда у юридических и физических лиц
		рублей	штук акций	рублей	штук акций	% к УФ	штук акций	% к УФ	рублей			
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13
1.	«Универсам Свислочь – 94», 220095, г. Минск, ул. Якубова, 58	3 817 539 544	241 892	15 782	60 512	25,02	60 512	25,02	40 523	2 452 139 879	245 213 987	три – юридических лица
2.	«Магазин Дарьяна», 220124, г. Минск, ул. Маяковского, 164	57 661 200	16 017	3 600	2 848	17,78	2 848	17,78	37 200	105 946 952	10 594 695	одно – юридическое лицо
3.	«Торгразвитие», 220050, г. Минск, ул. Вильямса, 45	38 806 400	97 016	400	17 187	17,72	17 187	17,72	22 524	387 124 000	38 712 400	одно – юридическое лицо
4.	«Ресторан «Беларус», 220000, г. Минск, ул. Сторожевская, 15а	3 617 723 330	57 143	63 310	15 019	26,28	15 019	26,28	312 202	4 688 962 131	468 896 213	два – юридических лица

* — рыночная стоимость.

Краіна здароўя

Выпуск № 38 (207)

У нататнік падарожніка

ЯК ПЕРАНЕСЦІ АВІЯПЕРАЛЁТ, ПАЕЗДКУ Ў АЎТОБУСЕ І ПАДАРОЖЖА НА ПАРАХОДЗЕ БЕЗ НЕПРЫЕМНАСЦЯЎ

Транспартнае ўкалыхванне, ці як яго яшчэ называюць — «хвароба руху» здольнае азмрочыць любую паездку. Аднак адмовіцца карыстацца транспартам сёння проста немагчыма.

«Хваробы руху» ўмоўна класіфікуюць на тры асноўныя формы.

Нервовая. Пры ёй пераважаюць наступныя сімптомы: галавакружэнне, цяжкасць у галаве, галаўны боль, слабасць, санлівасць. У гэтым выпадку церпіць псіхічная сфера.

Пры страўнікава-кішачнай форме скажаюцца смакавыя адчуванні. Ежа становіцца быццам папяровай, а вада — гумавай. У роце можа з'явіцца мыльны прысмак. Зніжаецца апетыт, з'яўляюцца млоснасць, ваніты, пасля чаго самаадчуванне часова паляпшаецца. Можа ўзнікнуць гідлівасць да пахаў прыгарэлай ежы, тытунёвага дыму і выхлапных газаў.

На пачатковай стадыі **сардэчна-сасудзістай формы** назіраецца пачашчэнне пульсу, часам парушэнне яго рытму, павышэнне артэрыяльнага ціску. Потым дыханне становіцца больш павярхоўным, а артэрыяльны ціск падае.

Часцей за ўсё «хвароба руху» праяўляе сябе ў змешанай форме, сімптомы з'яўляюцца ў самых розных спалучэннях.

Існуюць агульныя правілы, якія дапамогуць прадухіліць укалыхванне.

Транспартнае ўкалыхванне можа ўказваць на наяўнасць якога-небудзь схаванага захворвання. Таму, калі паездкі ў транспарце ператварыліся для вас у пакуту, абавязкова прайдзіце комплексныя медыцынскае абследаванне арганізма. Хоць універсальным метадам лячэння медыцына цяпер не валодае, усё ж існуюць рэкамендацыі, здольныя палегчыць праявы хваробы.

● Прамежак паміж прыёмамі ежы і паездкай павінен быць не менш чым 1,5-2 гадзіны. Ежа павінна быць лёгкай, але ў той жа час каларыйнай. Перад доўгімі паездкамі не піце натуральнае малако і моцнагазаваныя напоі.

● Перад паездкай можна выпіць таблетку. Але выбар фармакалагічнага прэпарату залежыць ад ступені ўкалыхвання і формы хваробы, працягласці паездкі і індывідуальнай адчувальнасці да лекавага сродку. Ідэальны варыянт, калі цуда-таблетку падбярэ доктар у спецыяльнай медыцынскай установе.

● Напярэдадні паездкі неабходна добра адпачыць, прыняць заспакаяльны ці снатворны сродак. Пры гэтым варта пазбягаць ужывання спіртных напояў, а таксама максімальна абмежаваць курэнне.

● Падчас паездкі лепш сядзець тварам наперад па ходу руху. Калі вам непрыемнае мільгаценне прадметаў за акном, то лепш заплюшчыць вочы і заняць зручную позу, адкінуўшы крэсла максімальна назад. Важна не перагравацца і не пераахалоджвацца ў час паездкі.

● Вельмі эфектыўнай з'яўляецца вестыбулярная трэніроўка. Самастойнае выкананне такіх практыкаванняў, як вярчальныя і ківальныя рухі галавой можа павысіць устойлівасць чалавека да ўкалыхвання.

Акрамя таго. варта ўлічваць, што ў розных транспартных сродках неабходна прытрымлівацца сваіх правілаў. Як перанесці авіяпералёт, паездку ў аўтобусе і падарожжа на параходзе без непрыемных наступстваў? Парады на гэты конт асабліва актуальныя ў час сезона адпачынкаў.

Доўгі **авіяпералёт** — няпростае выпрабаванне для арганізма. Пахадзіць у самалёце і размяцца асабліва не атрымаецца. Акрамя таго, як кажуць сасудзістыя хірургі, у салоне самалёта ўтвараецца не вельмі карысны мікраклімат. Нізкі ціск у самалёце садзейнічае застою крыві ў венах, а сухое паветра абязводжвае арганізм, з-за чаго кроў гусцее. Гэта можа, пры пэўнай схільнасці, выклікаць праблемы з вянозным кровазвароткам: утварэнне тромбаў і нават — у асабліва цяжкіх выпадках — закупорку вен. Спецыялісты называюць гэты стан «сіндромам падарожніка», ці «самалётным трамбозам».

Таму рэкамендуецца, седзячы ў крэсле, не класці нага на нагу. Гэта дапаможа пазбегнуць залішняга ціску на вены, не будзе застою крыві ў сасудах ног. Тым, хто ўжо мае праблемы з венамі і згусальнасцю крыві, абавязкова трэба падчас палёту надзяваць калготкі, панчохі ці шкарпэткі з антытрамбозным эфектам, выкарыстоўваць для падтрымання вен на нагах эластычны бінт. Перад палётам прыміце чвэрць таблеткі аспірыну.

Вельмі стамляюць **аўтобусныя паездкі**. Турыстам даводзіцца часам сядзець па 10-16 гадзін, ад чаго дарога ператвараецца ў пакуту. Таму, збіраючыся ў паездку, апранайцеся ў мяккую эластычную вопратку без мулкіх рамянёў і лямкаў. Лепшы варыянт — баваўняны трыкатаж.

Калі не спіце, старайцеся абыходзіцца без падлакотнікаў, каб як мага часцей мяняць позу і па чарзе даваць нагрузку на розныя мышцы спіны.

Прасіце вадзіцеля хоць бы раз у дзве гадзіны рабіць 10-хвілінны перапынак, каб можна было выйсці з аўтобуса і размяцца. Разам з тым, гэта добрая прафілактыка прыступаў «марской хваробы».

Ёсць спецыяльныя падушачкі для таго, каб спаць седзячы. Яны надзяваюцца на шыю як каўнер. Тады ў час сну галава не падае на плячо, а мышцы шыі атрымліваюць магчымасць адпачыць.

Калі вас укалыхвае, не ешце перад паездкай на параходзе тлустага і салодкага. Лепей адпраўляйцеся ў дарогу напаўгалодным, пачаставаўшы сябе толькі салатай з садавіны ці гародніны.

Заўсёды трымайце пад рукой сродкі ад укалыхвання (авія-мора, аэрон, фенацін), прымайце іх па інструкцыі.

У дарозе піце дробнымі глыткамі халаднаватую мінералку ці адвар мяты.

Адолець прыступ млоснасці дапамогуць пахі апельсіна, мандарына, гваздзікі.

Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.

Ён + Яна

ЖАНОЧЫ РОГАТ РАСПУДЖВАЕ МУЖЧЫН

Прадстаўніцы цудоўнай паловы чалавецтва застаюцца ў адзіноце, бо адпудж-ваюць патэнцыйных мужоў некультурным смехам.

Да такой высновы, як перадае партал «Раўт», прыйшлі псіхолагі з універсітэта ў Каліфорніі. Навукоўцы правялі даследаванне, у якім мужчыны ацэньвалі жаночую прывабнасць па галасавых інтанацыях. Пры гэтым яны не мелі магчымасці ўбачыць твары дам, якія выдавалі вясёлыя гукі.

Падчас працы высветлілася, што найбольшую непрыязнасць у хлопцаў выклікае гучны смех, а прывадзіць у захапленне і правакуе на зацікаўленасць — лёгкае хіхіканне. Напрыклад, больш за 1000 рэспандэнтаў знаходзяцца ў поўнай упэўненасці, што высокімі галасавымі данымі валодаюць выключна неадукаваныя дзяўчаты, якія не ўмеюць нармальна кантактаваць, і з імі сорамна паказацца на людзях.

АТМАСФЕРА ФЛІРТУ СПРЫЯЕ СПРАВЕ

Звыш 80 % жанчын і мужчын фліртуюць або фліртавалі са сваімі супрацоўнікамі. Пра гэта сведчаць найноўшыя сацыялагічныя даследаванні часопіса «Плэйбой». Дзве трэці жанчын і палова мужчын хоць бы адзін раз займаліся сэксам са сваімі калегамі.

Лічыцца, што мужчыны заўсёды ініцыююць службовыя раманы. Існуе меркаванне, што яны ўвесь час толькі пра тое і думаюць, як спакусіць жанчын, якія працуюць разам з імі. Гэта не зусім так. Вось вынікі апытання «Плэйбоя»: жанчыны ўдвая часцей, чым мужчыны, «знімаюць» сваіх калег-пачаткоўцаў супрацьлеглага полу з думкай пра сэксуальны кантакт.

З элегантнымі і дагледжанымі лэдзі маладыя мужчыны ахвотна займаюцца сэксам. Не забываючы пры выпадку паклапаціцца і пра сваю кар'еру. Жанчыны, зрэшты, пра яе таксама не забываюць: паводле статыстыкі, палова жанчын, якія маюць службовыя раманы, «спяць» менавіта з шэфамі.

Псіхолагі гавораць, што для многіх людзей сэкс на працы з'яўляецца эфектыўнай формай барацьбы са стрэсам. А ва ўсім вінаватая празмерная нагрузка — менавіта яна правакуе моцнае сэксуальнае жаданне.

Яшчэ адзін цікавы нюанс: сучасныя жанчыны, асабліва тыя, што працуюць нароўні з мужчынамі (а часам і больш за іх), становяцца ў сваіх сэксуальных адчуваннях падобнымі на прадстаўнікоў моцнага полу. Гэтыя жанчыны хутчэй узбуджаюцца і атрымліваюць аргазм нават без так званай уступнай гульні.

На думку сэксолагаў, людзі, якія шмат часу праводзяць разам, паняволі пачынаюць паглядваць адно на аднаго як на аб'ект сэксуальнага жадання. Згодна з апытаннем кампаніі «Дзюрэкс», пра тое, каб заняцца сэксам з калегам па працы, думае палова мужчын і трэць жанчын.

«Праца — гэта сэксуальна-ўзбуджальны від чалавечай дзейнасці. У пэўны момант офіс ператвараецца ў наймацнейшы афрадызіяк». Так лічаць амерыканскія псіхолагі, паведамляе Shkolazhizni.ru.

У адну кампанію трапляюць звычайна людзі з роднаснымі інтарэсамі, здольнасцямі і досведам — гэта эмацыйна зближае. А каб адпавядаць высокім патрабаванням сваіх працадаўцаў, спачатку дзеляць паміж сабой памяшканне офіса, а затым і ложак. Часцей за ўсё такое здараецца ў рэкламных і маркетынгавых агенцтвах, адвакацкіх канторах, медыя-рэдакцыях і рознага кшталту творчых арганізацыях. У цэлым — усюды, дзе час працы не нармуецца, а службовыя абавязкі і асабістае жыццё цяжка падзяліць.

Даследчыкі адзначаюць, што службовыя раманы забароненыя толькі на 10 % прадпрыемстваў ЗША. Эксперты гавораць: некаторыя працадаўцы нават задаволеныя, калі на фірме пануе атмасфера флірту. Быццам бы пры гэтым супрацоўнікі мацней звязаныя з фірмай, ахвотней праводзяць час разам і стараюцца як мага лепш праявіць сябе ў справе.

МАЛАДЫЯ ПАРТНЁРКІ ПАДСІЛКОЎВАЮЦЬ МУЖЧЫН ЭНЕРГІЯЙ

Сэкс з маладзейшымі каханкамі прадаўжае мужчынам жыццё.

Даследчыкі нямецкага Універсітэта Макса Планка на працягу 15 гадоў аналізавалі прычыны смяротнасці мужчын і прыйшлі да высновы, што верагоднасць ранняй смерці ў прадстаўнікоў моцнага полу зніжаецца на чвэрць, калі партнёрка маладзейшая на 15—17 гадоў.

Вучоныя сцвярджаюць, што маладыя палюбоўніцы ў літаральным сэнсе слова падсілкоўваюць энергіяй мужчын, якія з усіх сілаў спрабуюць заставацца «на вышыні» і пачынаюць весці актыўны лад жыцця. Гэта пазітыўна ўплывае на здароўе мужчын і прадаўжае ім жыццё.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ВЫХАВАЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

Чаму раней было менш дзіцячых капрызаў

Кажуць, што кожнае новае пакаленне разумнейшае за папярэднікаў. Можа з-за такой упэўненасці мы і не карыстаемся вопытам папярэднікаў і таму здабываем сабе новыя праблемы, многіх з якіх удавалася пазбягаць нашым продкам.

— Відаць, людзі не разумеюць, што нічога не пачынаецца з нуля. Гэта ў нейкай галіне можна ствараць новае. А ўвогуле жыццё трымаецца на папярэднім вопыце. Традыцыі маюць вялікае значэнне, — заўважае **кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Любоў РАКАВА**.

Нашы продкі былі мудрэйшымі за нас. Яны карысталіся той сістэмай выхавання дзяцей, якая складвалася стагоддзямі. Мо таму і праблем з дзецьмі ў іх было менш. А мы чытаем усялякія разумныя кніжкі, шукаем парады на дзіцячых пляцоўках і інтэрнэт-форумах, і так не можам разабрацца з самымі простымі пытаннямі. Пройдземся па некаторых.

ДЗІЦЯ НЕ ЕСЦЬ

Гэта цяпер расце пакаленне маленькіх капрызуноў, якіх нават прыходзіцца заганяць за стол, угаворваць, некаторыя сучасныя мамы і цэлы спектакль разыгрываюць, толькі б малое паела. А раней? Якія могуць быць забавы падчас ежы? **Размаўляць за сталом лічылася непрыстойным, гэтак жа як і размахваць рукамі ў час гутаркі.** Калі раптам падчас ежы хтосьці з дзяцей пачынаў «гулі», за гэта можна было без усялякіх папярэджванняў атрымаць лыжкай па лбе.

Раней дзіця не магло пад'есці тады, калі яму ўздумаецца, не прынята было, каб яно само ўзяло хлеб і адрэзала сабе кавалак.

Ды і разважаць пра харчовыя густы дзецям не было калі, калі яны раслі ў вялікай сям'і. Нікому на талеркі асобна не накладалася. На стол ставіўся чыгунок з ежай для ўсіх, раздаваліся лыжкі — і кожны стараўся як мог. Калектыўнае харчаванне, калі лыжкі стукалі па пасудзіне, стымулявала апетыт.

Праблем з кармленнем не было не толькі таму, што ежы было няшмат, існавала паважлівае стаўленне да прадуктаў. Да хлеба былі амаль рэлігійныя адносіны, калі яго кавалачкі выпадкова падалі, трэба было прасіць за тое ў Бога прабачэння. Акрамя таго, дзеці яшчэ і бачылі, адкуль бяруцца прадукты, як цяжка іх здабыць, бо самі змалку дапамагалі бацькам па гаспадарцы.

Не было ў беларусаў праблемы поўных людзей, а ўсё з-за ўкладу жыцця (абмежаванасць ежы, яе натуральнасць і загружанасць працай).

Беларусы былі вельмі гасцінныя. Калі да іх прыходзілі госці, яны выстаўлялі ўсё лепшае. Лічылася: «госць — гэта Бог у дом». **У той жа час нават на святах ніхто не напіваўся, часам за вяселле пілі не больш чым па тры чаркі.** Сціпласць была характэрнай рысай беларусаў.

— У чалавека, што прыйшоў з вяселля, знаёмыя пыталіся, як пачаставаўся, а той адказваў. «Так сабе, бо прымусу не было». У нас быў асаблівы этыкет. Напрыклад, калі дзецям, што прыйшлі ў чужую хату, прапануюць пачастунак, трэба адмаўляцца, узяць можна было, калі гаспадыня надта ўжо настойвае, як быццам прымушае. У дзяцінстве я нават пацярпела з-за такой традыцыі. У нашу вёску прыехалі капаць бульбу салдаты, і ўсе дзеці, цікаўныя, круціліся вакол іх. На вогнішчы яны гатавалі сабе вячэру і прапанавалі дзецям пачаставацца блінамі. Мне так хацелася, але я па традыцыі адмовілася, другой прапановы не было. Я прыйшла дамоў і расплакалася, — узгадвае Любоў Васільеўна.

Ашчадна дзеці ставіліся і да вопраткі, бо тады ніхто не спадзяваўся на абноўкі. Новае шылі толькі да Вялікадня. Каб зберагчы абутак, нават ужо дарослыя дзяўчаты, калі ішлі ў царкву, боты неслі за спінай, а апраналі іх толькі, калі набліжаліся да храма.

Не было раней у беларусаў і такой звычкі, як задорваць дзяцей падарункамі. Дні нараджэння тады ніхто не адзначаў, многія людзі нават дакладна не ведалі дату сваіх народзінаў.

Толькі ў канцы XIX, больш у XX стагоддзі стала ўваходзіць святкаванне Новага года, і тое гэта свята было больш цікавым гараджанам. Асноўным святам, на якое адорвалі дзяцей, быў Вялікдзень, калі прыходзілі хросныя бацькі альбо калі да іх хадзілі «за ларцом» (так называлі падарунак, гэта маглі быць яйкі, булкі, нейкія дробныя рэчы). Да гэтага свята і бацькі стараліся нешта новенькае набыць дзецям.

— А як вы лічыце, гэта добра было, што дзяцей не песцілі падарункамі? — цікаўлюся ў даследчыцы.

— Гэта выпрацоўвала стойкасць да жыцця, непатрабавальнасць, людзі абыходзіліся малым і не было лішніх прычын для суму. А цяпер, бывае, бацькі купяць падарунак, а дзеці крыўдуюць, бо хацелі іншае. Ведаю выпадак, калі сын прасіў ў маці матацыкл, калі яна яго не купіла — павесіўся.

Нам падаецца, што пры дапамозе цацак і прысмакаў мы можам кіраваць дзецьмі, абяцаем, што набудзем новы «кіндарсюрпрыз» узамен на добрыя паводзіны ці добры ўчынак. Але хто тут яшчэ кім кіруе: мы дзецьмі ці яны намі? Вось і падышлі да другога пытання, калі дзіця

НЕ СЛУХАЕЦЦА, НЕ ПАВАЖАЕ БАЦЬКОЎ

Надзвычай моцнай была ў беларусаў традыцыя павагі да бацькоў, іх аўтарытэт быў бясспрэчны. Раней нават казалі: «Бацька і маці ад Бога ў хаце». Калі ў доме з'яўляліся госці, дзеці не павінны былі замінаць, яны альбо ішлі з пакоя, альбо сядзелі ціха, малыя не крычалі, не насіліся, і не ўмешваліся ў размову дарослых.

Маленькія беларусы звярталіся да бацькоў на «Вы», нават, калі яны выраслі, працягвалі падпарадкоўвацца слову маці і бацькі.

З самых маленькіх гадоў дзецям закладвалася паважлівае стаўленне да ўсіх дарослых. Выхаванне дзяцей не было справай адной канкрэтнай сямейнай пары. Трывалымі былі сваяцкія сувязі, калі прадстаўнікі роду падтрымлівалі адно аднаго. Вялікім быў і культ продкаў. Сваякі, што жылі ў гэтай жа вёсцы (ды і не толькі сваякі, проста суседзі) кантралявалі дзяцей, калі тыя нешта дрэннае рабілі, гэта даводзілася да бацькоў.

— У вёсцы адно аднаго ведалі, і кожны стараўся паводзіць сябе пэўным чынам. А сёння большасць людзей для нас на вуліцы — незнаёмыя і гэтая ананімнасць — таксама перашкода ў выхаванні дзяцей, — заўважае Любоў Ракава. — Цяпер вельмі мала сем'яў, якія жывуць разам з дзядулем і бабуляй. А іх роля ў выхаванні дзяцей была вялікая. Занятым працай бацькам патрэбна была дапамога, і сталыя людзі даглядалі дзяцей. Бабуля і казку раскажа, і гісторыі з жыцця павучальныя. Старыя маглі навучаць малых і справам. Калі яны яшчэ мелі сілу, завіхаліся на гаспадарцы. Дзядуля мог віць вяроўкі, рабіць нейкія прылады, бабуля — прасці і ткаць, а побач круціліся ўнукі. Тут таксама адбывалася перадача традыцый. А яшчэ дзеці бачылі, як да бабулі і дзядулі ставяцца іх бацькі, вучыліся на прыкладах. Нават казка ёсць пра тое, як жанчына карміла свайго старэнькага бацьку з драўлянай міскі ў запечку. Але глядзіць — яе малы сын майструе міску, пытаецца, навошта. Калі хлопчык адказаў, што будзе яе гэтак жа карміць, як яна дзядулю, жанчына перамянілася.

Перайманне традыцый ішло натуральным чынам, дзеці проста бачылі, якія стасункі наладжаныя паміж дарослымі і дзецьмі ў сям'і, у сваякоў. У вялікай сям'і быў яшчэ адзін плюс, выхаваўчы. Калі дзяцей шмат, кожны стараецца паводзіць сябе добра, каб не пазбавіцца спадчыны альбо яе долі.

Да сярэдзіны XIX стагоддзя палова сем'яў была складанай — значыць, разам жылі некалькі сем'яў, гэта маглі быць не толькі бацькі і іх сыны са сваімі жонкамі, але і пляменнікі, стрыечныя браты, цёткі. **Па традыцыі беларусы ніколі не кідалі бацькоў: калі тыя станавіліся нямоглымі, іх даглядалі сыны, найчасцей малодшы (лічылася, што ён ідзе ў корань). Не кідаліся і адзінокія сваякі, у сям'ю маглі браць нават далёкую сваячку.**

Пражыванне не родных — таксама было традыцыяй беларусаў, у хаце маглі пражываць і настаўнікі дзяцей (у больш заможных сем'ях настаўнікі жылі нават па некалькі гадоў).

Прынята было дапамагаць адно аднаму, прычым не толькі людзям, якія жывуць у адной хаце, але і сваякам, хросным, суседзям.

НЕ ВЕДАЕ, ЧЫМ ЗАНЯЦЦА

Гэта сучасныя дзяўчаты могуць не ўмець гатаваць. А ранейшыя нявесты ўмелі ўсё рабіць па гаспадарцы. І гэта пры тым, што фізіялагічная спеласць у іх наступала куды пазней, чым у сучасніц. Часам васемнаццацігадовая дзяўчына выходзіла замуж нават тады, калі ў яе яшчэ «не было на рубашцы» (не было месячных).

І гаспадынь, гэтак жа як і гаспадароў пачыналі рыхтаваць з самага юнага ўзросту. Гэта сёння малыя могуць «даставаць» сваю маці таму, што не ведаюць, чым заняцца. А раней усе былі занятыя справамі, улетку і часу на адпачынак не хапала. Даручэнні па гаспадарцы даваліся нават двух-трохгадовым карапузікам, малым дазвалялася мець уласны міні-агарод, дзе яны самі вырашалі, што вырошчваць. Ужо ў 16-18 гадоў дзеці ўмелі ўсё рабіць па гаспадарцы. У час сумеснай працы мацнела павага да бацькоў, бо дзеці бачылі, які ўнёсак маці і бацька робяць у дабрабыт сям'і, наколькі складана весці гаспадарку.

Сяляне расцілі пераемніка гаспадаркі, тое ж самае рабіла і шляхта. Дробная шляхта накіроўвала сваіх дзяцей на панскі двор, каб навучаліся ўсім справам. Пашырана была традыцыя дзядзькавання. Часам дзядзьку наймалі, а часам накіроўвалі дзяцей у простыя сялянскія сем'і, дзе яны не толькі вучыліся абыходзіцца малым, загартоўваліся фізічна, але і спасцігалі сялянскую мудрасць. Сціпласць, павага да дарослых і любоў да працы, прыроды, радзімы, рэлігійнасць — асновы народнай педагогікі беларусаў.

Калі малодшыя дзеці знаходзіліся пад апекай маці, то навучаннем старэйшых хлопчыкаў займаўся бацька. У 13-14 гадоў сыноў прывучаў да складаней, цяжкай працы, браў іх і на поле, і на будоўлю.

— Раней хлопчыкі раслі ў сем'ях, дзе ім хапала мужчынскага ўплыву, і не толькі з боку бацькі, але і дзядуля быў побач, часам старэйшыя браты, дзядзькі. Сёння самы галоўны інстытут сям'і разбураецца, расце колькасць незарэгістраваных шлюбаў, дзеці ў такіх сем'ях нараджаюцца, але яны не вельмі шчаслівыя. Часта такія сем'і разыходзяцца. Шмат маці-адзіночак. І жаночы ўплыў пераважае. Дома дзіця выхоўвае маці, у садку — выхавацелька, у школе, гуртках — зноў жанчыны, — заўважае Любоў Васільеўна.

Раней дзеці былі больш самастойныя. Нават маленькіх маці кідалі адных, бо ім трэба было бегчы на поле, у агарод, карову даіць. Старэйшыя дзеці заставаліся за няньку, прычым часам «нянькам» самім было ўсяго гады два. Хоць да зусім маленькіх дзяцей было асаблівае стаўленне. Напрыклад, іх стараліся не лаяць і не караць, а яшчэ з імі займаліся.

— У беларусаў была «школа пешчання». Малых гушкалі, з імі шмат размаўлялі, гулялі, спявалі песенькі. Гэта цяпер ведаюць у лепшым выпадку дзве калыханкі, а раней іх ведалі дзясяткамі. Існавала шмат розных рытуалаў, абрадаў. Напрыклад, калі дзіця пачынала хадзіць, перад ім «пераразалі путы», каб нішто яму не перашкаджала. Гэта частка нашай культуры.

Прынамсі, папулярныя цяпер пальчыкавыя гульні, пацешкі — гэта ўсё прыдумана нашымі прабабулямі. І многае з таго, што цяпер нам даводзіцца ўжо спасцігаць на маміных курсах, вычытваць у розных дапаможніках па выхаванні дзяцей, раней існавала і перадавалася, па традыцыі. Так, сёння псіхолагі раяць не хваліць дзяцей увогуле, а хваліць за канкрэтны ўчынак. **А беларусы раней лічылі, што не трэба ні хваліцца дзецьмі, ні выказваць ім пахвалу прылюдна, каб не сурочыць.**

— Традыцыя не хваліць дзяцей была кансерватыўнай і паўсюднай. Асабліва не хваліць завочна. У той жа час лічылі, што ў меру трэба пахваліць за добра зробленую працу. І маці абавязкова скажа дачушцы пра тое, што яна малайчынка, добра саткала (вышыла, папрацавала на жніве), — заўважае Любоў Васільеўна.

«НЕ ВЫХАВАЎ БАЦЬКА, НЕ ВЫХАВАЕ І ДЗЯДЗЬКА»

Проста дзякуючы сваім назіранням, назапашанаму досведу, інтуіцыі беларусы стварылі добрую сістэму выхавання. Хоць само па сабе такога разумення слова выхавання, як цяпер, не было. Раней яно ўжывалася ў больш шырокім сэнсе. У XVI стагоддзі выхаванне азначала і даглядзець дзяцей, і пракарміць, і абуць. І гэта было лагічна: **дзіця расло і выхоўвалася побач з бацькамі. Гэта сёння мы выхаванне дзяцей імкнёмся перакласці на некага — садок, школу, гурткі. А беларусы казалі: «Не выхаваў бацька, не выхавае і дзядзька»**, «Якая дошка — такая стружка, якая маці — такая дачушка».

Прычым пачынаць выхоўваць дзіця трэба «пакуль яно ўпоперак ложка, а не ўздоўж». Яшчэ казалі: «Гні галінку, пакуль маладзенька».

Нашы продкі расцілі сумленных, шчырых людзей. Сёння кажуць, што добра расце (гадуецца, працуе) тое, што крадзенае. А ў беларусаў такога не было. Наадварот, крадзеж лічыўся вялікім грахом, у сярэднявечны ён нават мог карацца смерцю.

У XIX стагоддзі вядомы звычай, калі злодзея вадзілі па ўсёй вёсцы, і з кожнага двара выходзілі людзі і сцябалі вінаватага. Усё гэта бачылі дзеці. Адзінае, што не лічылася крадзяжом, было збіранне гароху. Яго звычайна сеялі пры дарозе, і сяляне лічылі, чым больш яго топчуць, тым больш будзе расці, існавала прыказка: «Гарох сееца і на прахадзяшчага і на прабягашчага, і на тыя дзеці, што цераз плот глядзеце».

«АДЗІН СЫН — НЕ СЫН, ДВА СЫНЫ — ПАЎСЫНА, ТРЫ СЫНЫ — СЫН»

Нашы продкі негатыўна ставіліся да кантрацэпцыі ды і асаблівых сродкаў для кантралявання нараджальнасці не было. Але, напэўна, яны і не былі тады патрэбныя. Бо раней існавала зацікаўленасць у дзецях, памочнікі цаніліся ў гаспадарцы.

Беларусы лічылі, што дзяцей у сям'і павінна быць шмат. Яны казалі: «Адзін сын — не сын, два сыны — паўсына, тры сыны — сын».

— Гэта прыказка — формула ўзнаўлення роду, народу. Сёння навукоўцы адзначаюць, што дзеля таго, каб насельніцтва Беларусі не памяншалася, неабходна, каб у кожнай сям'і нараджалася па 3-4 дзіцяці. «Тры сыны» — гэта і ёсць расшыранае ўзнаўленне насельніцтва (два замяшчаюць маці і бацьку, а трэці ў «прыбытак»), — заўважае Любоў Ракава.

Вялікая сям'я існавала, пакуль у ёй была эканамічная патрэба, а сёння нават і цяжка ўявіць, якія павінны быць зроблены захады дзяржавай, каб у сям'і нараджалася па 3-4 дзіцяці.

— Апытанні, якія праводзяцца сярод моладзі, паказваюць, што арыентацыя на колькасць дзяцей вышэйшая, чым існуе ў сапраўднасці. Так, многія маладыя людзі заўважаюць, што хацелі б мець двух-трох дзяцей, але ў выніку атрымліваецца, што заводзяць аднаго-двух. Сёння дзяцей эканамічна цяжка расціць. Змяніўся ўклад жыцця. Да сярэдзіны XX стагоддзя многія жанчыны не працавалі, займаліся дзецьмі, гаспадаркай. А сёння мужчына адзін не можа пракарміць сям'ю і жанчына мусіць працаваць. Як ёй нараджаць дзяцей, калі трэба думаць пра здабыванне грошай? Паспрабуй пракарміць, даць адукацыю, якая цяпер, як правіла, платная. Існуюць жыллёвыя праблемы. А яшчэ ўзрастае эгаізм, калі нараджальнасць можна планаваць, многія жанчыны проста не хочуць «выкладацца» на выхаванне яшчэ аднаго дзіцяці, — упэўнена Любоў Васільеўна.

— А ці магчыма вярнуць тыя прынцыпы сямейнага выхавання, якія былі раней?

— Маладыя бацькі выраслі ў іншы час, большасць з іх з многімі традыцыямі народнага выхавання не знаёмыя, і іх гэтаму трэба вучыць. Неабходна нешта рабіць са сродкамі масавай інфармацыі, на дзяцей і моладзь іх уплыў самы моцны. У апошняй трэці XX стагоддзя мы казалі, што на Захадзе кожныя 15 хвілін паказваюць сцэны гвалту, а сёння ў нас яны кожныя 3-5 хвілін, мы проста стрэчваем тое, чым ганарыліся. Нават у дакументальных фільмах, дзе расказваецца, напрыклад, пра лёс нейкіх вядомых людзей, паказваецца негатыўны вопыт, пра іх няўдалыя сем'і, непаважлівае стаўленне да бацькоў. Гэта ўплывае на свядомасць, каштоўнасць сямейных адносінаў. Тут патрэбны дзяржаўныя захады, каб адсейвалася негатыўная інфармацыя, каб такія перадачы, фільмы былі дзецям недасягальнымі. Пэўныя дзяржаўныя захады павінны быць скіраваны і на барацьбу з алкагалізмам. У нашым пакаленні было абмежаванне, нават дарослыя не маглі ў любы час раздабыць спіртныя напоі. У 90-я гады было дазволена школьнікам піць піва, яны маглі гэта спакойна рабіць на вуліцы — і ў выніку вырасла пакаленне піўных алкаголікаў. А калі нешта ўпусціць, то пасля выправіць вельмі цяжка. Сродкі масавай інфармацыі не выхоўваюць добрых густаў, не паказваюць нашых багатых традыцый, культуры. А мы можам ганарыцца нашай культурай, нашай народнай педагогікай. Колькі ў Беларусі было выхавана людзей, вядомых ва ўсім свеце. Гэта таксама трэба даносіць да дзяцей, каб яны ганарыліся гісторыяй, продкамі, краінай. Патрыятызм з'яўляецца асновай выхавання. Сяляне казалі дзецям: «Любі родную хатку, як родную матку».

Нашы продкі імкнуліся захаваць дзяцей ад усяго брыдкага, дрэннага, непрыстойнага, праз прымаўкі, песні, казкі выхоўвалі дзяцей, сваім прыкладам паказвалі, як трэба паводзіць сябе. А мы? А нам часам і пагаварыць з імі нестае часу. Ці сілаў. Ці жадання. А кажуць, што кожнае новае пакаленне разумнейшае за папярэднікаў...

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Учреждение образования «Борисовский государственный профессионально-технический колледж лесного хозяйства»

продолжает прием документов для поступающих на базе 9 классов по специальностям:

— лесник, егерь, плотник;

— электромонтер, электромеханик по торговому и холодильному оборудованию;

— продавец, буфетчик.

На базе 11 классов по специальности:

— лесник, егерь.

Конт. тел.: (8 0177) 72 04 80, 74 68 93.

Лицензия № 021100/0453607 выд. Мин. образования РБ от 20 декабря 2008 г. сроком до 30 января 2014 г.

УНН 600135374

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В Г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 20 августа 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Целевое назначение	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Первомайская (р-н жилого дома № 72)	0,0828	50 лет	строительство и обслуживание административно-торгового здания с гостиничными номерами и кафе	740100000003005439	562 892	94 927 000	8 543 000
№ 2	район пересечения Минского шоссе и улицы Пелагеевской (огр-р.Дубровенка)	0,2500	50 лет	строительство и обслуживание гостиницы и кафе	740100000001005247	583 397	122 576 000	11 032 000
№ 3	улица Габровская	0,2697	50 лет	строительство и обслуживание административно-складской базы	740100000005003822	532 579	60 261 000	5 423 000
№ 4	улица Ямницкая (огр-охр.зона ЛЭП)	0,0800	50 лет	строительство и обслуживание складских помещений	740100000003005397	1 478 015	21 922 000	1 973 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

иностранные юридические лица: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык;

представители иностранного юридического лица или гражданина: легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры – в соответствии с проектно-сметной документацией.

2) Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

4) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду

Вяртаючыся да надрукаванага

«КАЛІ ХТО-НЕБУДЗЬ З УРАЧОЎ-НЕЎРОЛАГАЎ КРАІНЫ ПАГОДЗІЦЦА ПРЫЕХАЦЬ ДА НАС НА ПРАЦУ, ПАСАДА Ў БАЛЬНІЦЫ БУДЗЕ ЎКАМПЛЕКТАВАНАЯ РАНЕЙ...»

10 ліпеня ў «Звяздзе» пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» быў змешчаны матэрыял «Пры размеркаванні спецыялістаў урачэбная стаўка будзе ўкамплектаваная...» У ім была спроба (пра гэта ніжэй) даць адказ на запыт чытача з вёскі Русаўшчына Клецкага раёна Віктара Іосіфавіча Чывеля. Яго вельмі турбавала, што ў мясцовай цэнтральнай раённай паліклініцы ўрач-неўрапатолаг працуе толькі дзве гадзіны ў дзень. Прычым, як зазначаў заяўнік, талоны на прыём можна атрымаць толькі адзін раз на тыдзень — у чацвер. Чытач заўважаў, што пры такім раскладзе атрымаць жаданы талон да ўрача практычна нерэальна. А па «жывой чарзе» спецыяліст не прымае. «Дык калі ж нам дачакацца, каб у гэтым кірунку палепшылася медыцынскае абслугоўванне?» — ставіў рубам пытанне Віктар Іосіфавіч.

Далей пра нашу спробу знайсці адказ на пастаўленае пытанне. Мы патэлефанавалі першаму намесніку начальніка ўпраўлення аховы здароўя Мінскага аблвыканкама Сяргею Ганчарову, маўляў, дайце каментар і, у межах кампетэнцыі, паспрыяйце выпраўленню сітуацыі. Сяргей Васільевіч папрасіў даслаць з рэдакцыі афіцыйны пісьмовы запыт: згодна з заведзенай практыкай, разгледзім, адрэагуем. Што мы аператыўна і выканалі. Адказ не прымусіў асабліва доўга сябе чакаць. Зноў прывядзём яго цалкам. «Праблема кадраў вузкіх спецыялістаў актуальная. Заяўкі на спецыялістаў пастаянна падаюцца ў Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Пры размеркаванні спецыялістаў урачэбная стаўка будзе ўкамплектаваная». Усё — увесь адказ даслоўна. Ці знайшоў у ім што на свой запыт спадар Чывель, іншыя зацікаўленыя жыхары Клецкага раёна? Вось і мы гэтак жа ахарактарызавалі тое рэагаванне: канстатацыя праблемы, пра якую і так усе ведаюць, і — далейшая агульная абяцанка...

І вось днямі «Звязда» зноў атрымала афіцыйны ліст-рэагаванне на тое ж пытанне нашага заяўніка з упраўлення аховы здароўя Мінскага аблвыканкама, на гэты раз больш змястоўны і — за подпісам яго начальніка Івана Ліпніцкага. Ці пачуюць на гэты раз нешта больш канкрэтнае па сваёй набалелай праблеме чытачы з Клецкага раёна? Ці застануцца задаволеныя прачытаным?..

«Ва ўстанове аховы здароўя «Клецкая ЦРБ» у штатным раскладзе паліклінікі 1,75 стаўкі ўрача-неўролага і 1 стаўка ў неўралагічным аддзяленні. Гэтая ўстанова ўкамплектаваная адным урачом-неўролагам, які займае 0,75 стаўкі ў неўралагічным аддзяленні і 0,5 стаўкі ў паліклініцы. Час працы ўрача-неўролага ў паліклініцы з 12.00 да 15.00. Нагрузка ўрача-неўролага ў першым паўгоддзі 2010 года па стацыянары склала 1,74, па паліклініцы — 1,78.

Паліклініка ўстановы праводзіць прыём па талоннай сістэме. Пачатак працы рэгістратуры паліклінікі — з 7.30. Штодня выдаецца 10 талонаў на наведванне ўрача-неўролага, а таксама 4 талоны па папярэднім запісе, які вядзецца кожны чацвер па тэлефоне на наступны тыдзень.

Паліклініка праводзіць прафілактычныя агляды ўрачом-неўролагам. У экстранных выпадках выдаюцца дадатковыя талоны да ўрача-неўролага. Пры вострым нетранспартабельным стане робіцца выклік яго на дом. Штодзённа па чацвяргах урач-неўролог вядзе прыём дзяцей у дзіцячай кансультацыі.

У пацыентаў з неўралагічнай сімптаматыкай ёсць магчымасць звяртацца да ўчастковага ўрача-тэрапеўта, які пры неабходнасці спецыялізаванай дапамогі арганізуе кансультацыю ўрача-неўролага. Пры адсутнасці ўрача-неўролага ўсе віды прафілактычных работ аглядаў праводзіць урач-псіхіятр-нарколаг. Экстранную дапамогу вядзе ўчастковы ўрач-тэрапеўт ці ўрач-псіхіятр-нарколаг. Пры неабходнасці пацыенты накіроўваюцца ва ўстанову аховы здароўя «Мінская абласная клінічная бальніца» для кансультацыі ў абласных спецыялістаў.

Штогод падаюцца заяўкі ва ўпраўленне аховы здароўя Мінаблвыканкама адносна патрэбы ва ўрачах, у тым ліку ўрача-неўролага. У 2010 годзе ва ўстанову аховы здароўя «Клецкая ЦРБ» размеркаваныя два маладыя спецыялісты: урач-тэрапеўт, урач-стаматолаг. Перападрыхтаваць урача-тэрапеўта ў 2010 годзе няма магчымасці ў сувязі з дэфіцытам урачэбных кадраў.

У 2011 годзе будзе размеркавана 5 маладых спецыялістаў: урач-акушэр-гінеколаг, два урачы-тэрапеўты, урач-анестэзіёлаг-рэаніматолаг, урач-стаматолаг. Магчымасць перападрыхтоўкі ўрача-неўролага з'явіцца не раней за другое паўгоддзе 2011 года, такім чынам, стаўка ўрача-неўролага можа быць укамплектаванай толькі ў 2012 годзе.

У раёне пастаянна праводзіцца праца па прыцягненні медыцынскіх кадраў для ўстановы аховы здароўя «Клецкая ЦРБ». Неаднаразова публікаваліся ў раённых газетах г. Клецка, г. Ляхавічы і г. Баранавічы, у газеце «Медыцынскі веснік» аб'явы пра патрэбу ў медыцынскіх кадрах. Клецкім раённым выканаўчым камітэтам даецца жыллё ўрачам, што прыбылі ў раён. У выпадку, калі хто-небудзь з урачоў-неўролагаў краіны пагодзіцца прыехаць на працу ў г. Клецк, пасада ўрача-неўролага будзе ўкамплектаваная раней за вышэйзгаданы тэрмін».

Сяргей РАСОЛЬКА.

АДМЕНА БІТВЫ ЗА ЎРАДЖАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Сёння самую галоўную задачу мы бачым у тым, каб забяспечыць грамадскую жывёлагадоўлю кармамі ў неабходным аб'ёме. Разлік на кукурузу не спраўджваецца — убіраем падгарэлыя ўчасткі. Зараз іх да 40 %, але з кожным днём становіцца ўсё больш. Там, дзе мы разлічвалі на ўраджайнасць кукурузы 320-350 ц за га, убіраем толькі 220. Але ж і гэтай культуры мы сёлета пасеялі больш на 10 тыс. га, таму спадзяёмся, што сілас будзем мець. Па нашых ацэнках, кукурузнага сіласу будзе нарыхтавана 12,5-13 ц кармавых адзінак на ўмоўную галаву. Калі дадаць, што з першага ўкосу мы нарыхтавалі 25 ц кармавых адзінак — гэта на 1 ц будзе больш, чым летась. Атрымліваецца 105-107 % травяністых кармоў у параўнанні з мінулым годам. Праўда, планавалі мы сёлета нарыхтаваць 30 ц кармавых адзінак — з тым разлікам, каб мець паўтарагадовы запас кармоў. Думалі з наступнага года 80 % дойнага статку перавесці на аднатыпны круглагадовы тып кармлення жывёлы. Ён дае магчымасць штодзень мець стабільны ўдой малака. На жаль, мы выйдзем толькі на 60 %. Між іншым, сёння на такі тып кармлення пераведзена каля 40 % дойнага статку.

Статак на Гомельшчыне ў гэты спякотны час амаль што цалкам утрымліваецца ў летніх лагерах, але на зімовых харчах. Усе пашы сонца спаліла. На корм каровам ідзе штодзень да 10 тысяч тон зялёнай масы кукурузы. Але ж інакш, каб не знізіць вытворчасць малака, нельга. Такім чынам, з-за спякоты ў вобласці не дабіраюць запланаваныя +6 % па малаку, але і цяпер яго вытворчасць складае амаль 105 % да леташняга ўзроўню, адзначае старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні:

— Па нашых экспертных ацэнках, толькі за кошт недабору зерня 70 млрд рублёў складаюць прамыя страты. Зернебабовыя згарэлі. Для іх такія тэмпературы былі асабліва згубныя. Тыя культуры, якія мы планавалі на зерне, значна пацярпелі: гарох, люпін, пялюшка — збіраем толькі 18 ц з га. На 10 ц менш, чым летась. Больш ад спякоты пацярпелі паўночныя раёны: Добрушскі, Гомельскі, Кармянскі, Чачэрскі, Лоеўскі, Брагінскі. Некалькі лепшая сітуацыя на Палессі.

Вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі ўжо сёння аналізуюць сітуацыю і па ўраджайнасці культур у надзвычайных умовах надвор'я. Найбольшую дае азімая пшаніца. Няма праблем з сояй, якой засеяна сёлета на Гомельшчыне каля трох тысяч га. Проса — яшчэ адна культура, якая таксама добра пераносіць спякоту. Менавіта таму размова ідзе аб пераразмеркаванні і ўдасканальванні структуры пасяўных плошчаў, кажа старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Валянцін Бабок:

— Цяпер мы дакладна бачым, што пашырацца нам трэба па азімых. Праўда, ніхто не дае гарантыі, што ў наступным годзе не будзе такой засухі. Налета будзем пашыраць пасевы сланечніку ў 10 разоў. Укладанне вялікіх бюджэтных сродкаў у меліярацыю таксама павінна прынесці свой плён. Сёлета на рэканструкцыі і рамонце меліяратыўных сістэм мы асвойваем 100 мільярдаў рублёў і ўжо сёлета павінны ўвесці пад сяўбу азімых дадаткова 25 тысяч га меліяраваных земляў, якія раней не выкарыстоўваліся. Таму мы і пашыраем плошчы пад азімыя і рапс. Яго ў вобласці на зіму мы будзем сеяць 78 тысяч га. Хутка мы арганізуем у сябе 100-працэнтную перапрацоўку рапсу і будзем перапрацоўваць гэтую культуру на новых прадпрыемствах у розных раёнах вобласці. А потым, у наступным годзе, будзем ствараць асацыяцыю вытворцаў і перапрацоўшчыкаў рапсу.

Тым часам да сельгасвытворцаў Гомельшчыны з прывабнымі па цане прапановамі ўжо цяпер звяртаюцца патэнцыйныя пакупнікі з расійскіх рэгіёнаў, у тым ліку Масквы. І ўжо цяпер 80 % ранняй бульбы ідзе на экспарт.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

СПАЖЫЎЦЫ СТАЛІ ЧАСЦЕЙ ЗВЯРТАЦЦА ПА АБАРОНУ СВАІХ ПРАВОЎ

Узрасла колькасць зваротаў грамадзян на недабраякасныя тавары і паслугі, пра гэта на прэс-канферэнцыі паведаміла **Вольга КРАЎЦОВА, намеснік начальніка ўпраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю**. Па яе словах, за 2010 год толькі апаратам міністэрства было разгледжана 117 зваротаў, што на 10 % больш за леташні паказчык. У цэлым па краіне за 2009 год было разгледжана 9 тысяч зваротаў, складзена 280 пратаколаў і 745 прадпісанняў.

— На жаль, лічбы зваротаў грамадзян растуць, але мы спадзяёмся, што гэта звязана з тым, што спажыўцы становяцца больш адукаванымі, — паведаміла Вольга Краўцова і расказала пра вынікі сацыяльнага апытання, якое праводзілася ў мінулым годзе: — У нас, напрыклад, якасцю абутку не задаволены 56 % апытаных, швейных і трыкатажных вырабаў — 31 %, тэлефонных апаратаў — 30 %, медыцынскіх паслуг — 40 %, ЖКГ — 38 %, транспартных паслуг — 20 %.

У той жа час, па звестках Беларускага таварыства абароны спажыўцоў, каля 60 % ад усіх зваротаў спажыўцоў у гэта таварыства прыходзіцца на якасць паслуг: пачынаючы ад турыстычных і заканчваючы паслугамі ЖКГ. Усяго ж у Беларускае таварыства абароны спажыўцоў за 2009 год звярнуліся 20 тысяч грамадзян, з якіх 5660 — жыхары Мінска.

Журналісты пацікавіліся ў Вольгі Краўцовай, наколькі Мінгандаль лічыць эфектыўнай сістэму зваротаў грамадзян, якая была прынята больш за 2 гады таму і згодна з якой спачатку трэба звяртацца ў мясцовы орган, а толькі потым, калі праблема не вырашана, у вышэйшы:

— Мы спачатку раім звяртацца непасрэдна да прадаўца, а толькі потым скардзіцца ў дзяржорган. Сапраўды, спачатку спажывец павінен звярнуцца ў мясцовы орган, потым у аблвыканкам, а толькі потым ужо ў Мінгандаль. Я лічу, што гэтая сістэма эфектыўная, бо цяпер, калі грамадзянін не знайшоў праўды і пайшоў у вышэйшую інстанцыю, то апошняя павінна не толькі разабрацца па сутнасці звароту, але і даць ацэнку дзеянням ніжэйшай інстанцыі. І гэта з'яўляецца стымулюючым момантам, бо чыноўнікі ў райвыканкамах ведаюць, што ўзровень адказнасці ў іх вышэйшы і што існуе кантроль і за вынікамі іх працы.

А вось **Ганна СУША, старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў**, заўважыла, што яшчэ не ўсе пакупнікі навучыліся правільна набываць тавары і паслугі:

— Мэты нашай арганізацыі ўжо трохі шырэйшыя — калі мы толькі ствараліся, тады ставілі мэтай абарону канкрэтнага спажыўца. Сёння абараніць кожнага канкрэтнага спажыўца немагчыма — яго трэба выхаваць, навучыць, каб ён сам быў адказным за свой выбар, — сказала Ганна Суша. — Не ўсе спажыўцы навучыліся набываць тавары і паслугі. Часта гэта спантанныя пакупкі, людзі не патрабуюць у прадаўца дакументаў, які пацвярджае пакупку, не правяраюць працаздольнасць тавару і не патрабуюць дакумент аб аплаце, калі купляюць нешта праз інтэрнэт-краму, не захоўваюць на папяровым носьбіце звесткі пра інтэрнэт-краму і гэтак далей.

Дарэчы, што тычыцца дзейнасці інтэрнэт-крам, то, як сказала Вольга Краўцова, у гэтым квартале Мінгандаль запланаваў праверыць інтэрнэт-крамы: па-першае, ці ўсе крамы зарэгістраваліся ў гандлёвым рэестры, і, па-другое, ці адпавядае іх дзейнасць заканадаўству аб абароне правоў спажыўцоў. Напрыклад, ці размешчаны на сайтах усе неабходныя рэквізіты, ці прысутнічае поўная інфармацыя пра тавар і гэтак далей.

Расказала Вольга Краўцова і пра беларускія тавары:

— Калі 5 гадоў таму было шмат зваротаў наконт складаных тэхнічных айчынных тавараў, то сёння такога няма. А тыя праблемы, якія ўзнікаць, вырашаюцца з айчыннымі вытворцамі хутчэй.

Але Вольга Барысаўна пры гэтым пераканана, што з-за адміністрацыйных метадаў прасоўвання беларускіх тавараў у айчынных прадпрыемствах не знікае стымул далей павышаць якасць:

— На сёння, калі рэальна паглядзець на рэчы, ніякі адміністрацыйны рэсурс не дапаможа спажыўцу купіць айчынныя тавары, калі ён не хоча і тавар не падабаецца. Сёння нашы вытворцы, нягледзячы на падтрымку дзяржавы, усё адно адчуваюць канкурэнцыю і працуюць над якасцю. Іншая рэч, што ў нас вялізная вытворчасць і зрабіць мадэрнізацыю, набыць новыя тэхналогіі — вельмі затратна. Нашы вытворцы ўсё разумеюць, але ўсё ўпіраецца ў эканоміку і ім патрэбны пэўны час.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Прыёмная кампанія-2010

ЦЭНТРАЛІЗАВАНЫЯ ПІСЬМОВЫЯ ЗАДАННІ — НЕ ТЭСТ.

У якой форме павінны праходзіць уступныя іспыты для выпускнікоў базавай школы пры іх паступленні ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы: у вуснай ці пісьмовай форме? Калісьці такая ж дылема стаяла і перад ВНУ, дзе пісьмовыя іспыты паступова выціснулі вусныя экзамены, а затым ім на змену прыйшло цэнтралізаванае тэсціраванне. Больш за тое, сёння пры паступленні ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы для выпускнікоў сярэдніх школ усе экзамены таксама праводзяцца ў форме цэнтралізаванага тэсціравання. Калі не пашанцавала пры паступленні ў ВНУ, сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы нярэдка становяцца для выпускнікоў своеасаблівым запасным аэрадромам. Галоўнае, што маючы на руках пакет сертыфікатаў ЦТ, не трэба ўдзельнічаць у новых іспытах...

Але ў чым розніца?

Але сёлета ўпершыню абітурыентам ССНУ, якія паступалі на аснове базавай адукацыі, была прапанаваная новая форма ўступных іспытаў — цэнтралізаваныя пісьмовыя заданні, якія рыхтаваліся ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў. Як вядома, менавіта ў сценах гэтай установы рыхтуюцца і тэсты для цэнтралізаванага тэсціравання. Як паведаміла журналістам на прэс-канферэнцыі **галоўны інспектар упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Таццяна ЯГОРАВА**, эксперымент праводзіўся па прапанове дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступных іспытаў у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы і распаўсюдзіўся толькі на тыя ССНУ, якія спыніліся на пісьмовай форме правядзення ўступных іспытаў. У гэтых навучальных установах усе пісьмовыя экзамены праводзіліся па цэнтралізаваных заданнях у дні, вызначаныя Міністэрствам адукацыі. Быў распрацаваны і зацверджаны поўны алгарытм дзеянняў, скіраваны на ахову канфідэнцыяльнасці інфармацыі: ад моманту дастаўкі экзаменацыйных матэрыялаў у навучальную ўстанову, іх захоўвання, да распячатвання канвертаў і тыражавання заданняў. Аднак цэнтралізаваныя заданні — гэта зусім не тэсты...

— Апошнія гады ў нашым інстытуце праводзілася карпатлівая работа па падрыхтоўцы заданняў для абітурыентаў, якія паступаюць у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на аснове базавай адукацыі, — патлумачыла **начальнік упраўлення па распрацоўцы і сертыфікацыі тэстаў для выпускнікоў базавай школы Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Наталля ВАЙЦЯХОВІЧ**. — Апрабацыя праходзіла на базе сталічных школ і гімназій, а таксама школ у рэгіёнах, у тым ліку і сельскіх школ. Мы шукалі такую форму падачы экзаменацыйнага матэрыялу, якая б улічвала псіхалагічныя і ўзроставыя асаблівасці падлеткаў. Спыніліся на тэкставых дыктоўках. І па колькасці слоў, і па часе выканання дыктоўкі па рускай і беларускай мовах на ўступных іспытах адпавядалі нарматывам дыктовак для вучняў 9-х класаў школ. Па іншых агульнаадукацыйных дысцыплінах абітурыентам былі прапанаваныя кантрольныя работы, якія змяшчалі заданні розных узроўняў складанасці і розныя фармулёўкі адказаў. У прыватнасці, былі заданні, дзе абітурыент павінен быў даць разгорнуты адказ. Экзаменацыйная работа па матэматыцы, на якую адводзіліся 135 хвілін (тры акадэмічныя гадзіны) змяшчала 7 заданняў розната ўзроўню засваення ведаў (ад першага да пятага), што дазваляла экзаменатарам ранжыраваць абітурыентаў. Калі з заданнямі першага ўзроўню складанасці спраўляецца пераважная колькасць экзаменуемых, то з заданнямі пятага ўзроўню складанасці могуць справіцца толькі абітурыенты з дастаткова моцнай падрыхтоўкай. Пры апрабацыі нашых заданняў мы пераканаліся, што вучні дзявятых класаў спакойна ўспрымаюць такую форму праверкі іх ведаў. Экзаменацыйныя работы правяраліся ў саміх ССНУ прадметнымі камісіямі: акрамя спецыяльных «ключэй» да кантрольных работ мы забяспечылі членаў камісій і метадычнымі рэкамендацыямі, якія дапамагалі ім пры ацэнцы экзаменацыйных работ.

Цэнтралізаваныя пісьмовыя заданні па рускай і беларускай мовах абітурыенты здавалі ў 103 ССНУ, па матэматыцы — у 24, па замежных мовах — у 7...

Меркаваць пра якасць экзаменацыйных матэрыялаў можна па той акалічнасці, што ніводнай апеляцыі па выніках пісьмовых экзаменаў у ССНУ пададзена не было. Ні ў Міністэрства адукацыі, ні ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў скаргаў таксама не паступала.

— Адзін з плюсоў цэнтралізаваных пісьмовых заданняў, якія рыхтуюцца па-за сценамі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў прафесіяналамі, — гэта іх высокая якасць і папярэджванне карупцыйных з'яў, — упэўнена Таццяна Ягорава. — Да таго ж, пры правядзенні пісьмовых экзаменаў абітурыенты былі застрахаваныя ад суб'ектыўнасці экзаменатараў. Аднак ёсць і аспекты, якія патрабуюць пільнай увагі педагогаў: гэта гатоўнасць дзевяцікласнікаў да такіх выпрабаванняў, магчымасці школ па падрыхтоўцы дзевяцікласнікаў да цэнтралізаваных пісьмовых выпрабаванняў і пагроза далейшага распаўсюджвання рэпетытарства, якое ўжо ахапіла старшую школу. У сярэдніх спецыяльных навучальных установах сёлета была магчымасць самастойна выбіраць форму правядзення ўступных іспытаў, і пераважная іх колькасць аддала перавагу вуснай форме экзаменаў. Кіраўнікоў можна зразумець: кантынгент навучэнцаў трэба сфарміраваць, а падчас вуснага экзамену экзаменатарам прасцей «вывудзіць» з абітурыента веды. З іншага боку, калі мы цалкам адмовімся ад вусных экзаменаў, то ёсць пагроза , што нашы дзеці цалкам развучацца размаўляць, фармуляваць свае думкі і аргументаваць сваю пазіцыю...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Для правядзення ўступных іспытаў па цэнтралізаваных заданнях былі ўстаноўлены наступныя нормы выканання (у акадэмічных гадзінах):
па беларускай ці рускай мове (дыктоўка) — 1 гадзіна (45 хвілін)
па матэматыцы — 3 гадзіны (135 хвілін)
па біялогіі — 2 гадзіны (90 хвілін)
па хіміі — 2 гадзіны (90 хвілін)
па гісторыі Беларусі — 2 гадзіны (90 хвілін)
па замежнай мове — 2 гадзіны (90 хвілін)

Меркаваць пра якасць экзаменацыйных матэрыялаў можна па той акалічнасці, што ніводнай апеляцыі па выніках пісьмовых экзаменаў у ССНУ пададзена не было. Ні ў Міністэрства адукацыі, ні ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў скаргаў таксама не паступала.

— Адзін з плюсоў цэнтралізаваных пісьмовых заданняў, якія рыхтуюцца па-за сценамі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў прафесіяналамі, — гэта іх высокая якасць і папярэджванне карупцыйных з'яў, — упэўнена Таццяна Ягорава. — Да таго ж, пры правядзенні пісьмовых экзаменаў абітурыенты былі застрахаваныя ад суб'ектыўнасці экзаменатараў. Аднак ёсць і аспекты, якія патрабуюць пільнай увагі педагогаў: гэта гатоўнасць дзевяцікласнікаў да такіх выпрабаванняў, магчымасці школ па падрыхтоўцы дзевяцікласнікаў да цэнтралізаваных пісьмовых выпрабаванняў і пагроза далейшага распаўсюджвання рэпетытарства, якое ўжо ахапіла старшую школу. У сярэдніх спецыяльных навучальных установах сёлета была магчымасць самастойна выбіраць форму правядзення ўступных іспытаў, і пераважная іх колькасць аддала перавагу вуснай форме экзаменаў. Кіраўнікоў можна зразумець: кантынгент навучэнцаў трэба сфарміраваць, а падчас вуснага экзамену экзаменатарам прасцей «вывудзіць» з абітурыента веды. З іншага боку, калі мы цалкам адмовімся ад вусных экзаменаў, то ёсць пагроза , што нашы дзеці цалкам развучацца размаўляць, фармуляваць свае думкі і аргументаваць сваю пазіцыю...

Між іншым, боязь, што не ўсе месцы ў ССНУ ўдасца запоўніць, мае падставы. Дэмаграфічная сітуацыя ўсё больш абвастраецца. І хоць залічэнне ў ССНУ на аснове базавай адукацыі яшчэ не завяршылася, усім зразумела, што сярэдні конкурс у ССНУ на аснове базавай адукацыі будзе ў гэтым годзе меншы, чым у папярэднім. Даволі напружаная сітуацыя з запаўненнем месцаў назіраецца ў ССНУ ў Віцебскай вобласці. Пры гэтым у многіх сярэдніх спецыяльных навучальных установах традыцыйна складаюцца такія конкурсы, якім могуць пазайздросціць многія ВНУ. Напрыклад, заўсёды вялікай папулярнасцю ў падлеткаў карыстаецца спецыяльнасць «правазнаўства» ў Ліцэі БДУ. Вельмі высокія конкурсы назіраюцца ў мінскім фінансава-эканамічным каледжы, архітэктурна-будаўнічым каледжы, радыётэхнічным, гандлёвым каледжы. На піку папулярнасці ў абітурыентаў такія спецыяльнасці, як «цырульніцкае мастацтва і дэкаратыўная касметыка», «турызм і гасцінасць», «бухгалтарскі ўлік, аналіз і кантроль», «дызайн», «банкаўская справа», «тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў», «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій». А самая запатрабаваная ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах — завочная форма навучання. Летась сярэдні конкурс на завочную форму навучання склаў 4 чалавекі на адно бюджэтнае месца. Пры гэтым 50 працэнтаў завочнікаў атрымліваюць адукацыю на платнай аснове.

Асноўная ўступная кампанія ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы завершыцца 16 жніўня. А на працягу верасня можа адбывацца «дазалічэнне» абітурыентаў, якія не прайшлі па конкурсе на вакантныя бюджэтныя альбо платныя месцы, у выпадку, калі хто-небудзь з абітурыентаў, залічаных на навучанне, у вызначаны тэрмін не прыступіць да заняткаў без уважлівых прычын. І да 10 снежня завершыцца прыём на завочную форму навучання на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці і спецыяльнасці воднага транспарту.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Факт

АД УДАРУ МАЛАНКІ

У Рэчыцы загарэўся склад аднаго з мясцовых гандлёвых прадпрыемстваў. Памяшканне чатыры гады не выкарыстоўвалася па прызначэнні, таму ў ім нічога, акрамя смецця, не было. Людзі не пацярпелі.

СПАКУСІЛАСЯ ГУЛЬНЁВЫМ ЗАРОБКАМ

21-гадовая аператар тэрмінала электронных інтэрактыўных гульняў «Спортлато» і «Кено» з'яўлялася матэрыяльна адказнай асобай, але ж не змагла пазбегнуць спакусы і пайшла на службовае злачынства. Як расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, за паўтара месяца дзяўчына выкрала з касы тэрмінала ў гарадскім пасёлку Карма больш за 1,5 мільёна рублёў, якія растраціла на асабістыя патрэбы. Грамадзянку з працы звольнілі, і шкоду ёй таксама прыйшлося пакрываць — каб не заводзіць крымінальнай справы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

АБАКРАЛА СТАРУЮ

Да 86-гадовай жыхаркі вёскі Хворасна Пінскага раёна наведвалася 20-гадовая дзяўчына з Лагішына. А калі бабуля агледзела, што прапалі ўсе зберажэнні — 3 000 000 рублёў, 90 долараў, то звярнулася ў міліцыю.

ПАКАЗАЛІ ГАСЦІННАСЦЬ

У Пружаны прыехаў пагасціць чалавек з Вільнюса. Каля часу ночы на вуліцы Кобрынскай яго сустрэлі трое 18-гадовых юнакоў і адабралі гвалтам сумачку. Там былі грошы, дакументы, мабільны тэлефон. Назаўтра зламыснікаў затрымалі. І калі 48-гадоваму грамадзяніну Літвы вярнулі яго маёмасць, ён адмовіўся пісаць заяву. Але ж справа заведзена, і маладым пружанцам давядзецца адказваць за свой учынак.

Яна СВЕТАВА.

Жыццялюбы

«БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА МОЖА ПРЫВАБЛІВАЦЬ ТУРЫСТАЎ НЕ МЕНШ, ЧЫМ МОНТЭ-КАРЛА ЦІ НЬЮ-ЁРК»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сказана — зроблена. Калі даведаўся, што прайшоў па конкурсе, а ён у той час быў надзвычай вялікі, лятаў на крылах шчасця. А праз пару дзён па волі лёсу сустрэў на калідоры, каго б вы думалі, тую самую блакітнавокую з рэкламы. Падышоў і пазнаёміўся.

— Усе тады жартам казалі, што Фелікс прыехаў у Беларусь не вучыцца, а жаніцца, — смяецца спадар Высоцкі. — І сапраўды, як у ваду глядзелі, праз тры гады Марына стала маёй жонкай.

Моладзь у вёсцы толькі і ведае, што піва, цыгарэты ды танцулькі. У асноўным ніхто нічым больш не цікавіцца. А хочацца, каб было па-іншаму, каб жыццё ў Рудні забіла ключом, каб сюды ехалі людзі. Умовы ёсць, але без зацікаўленасці і падтрымкі мясцовай улады не абысціся.

Пасля вяселля навяспечаная сям'я з'ехала ў Сухумі, дзе ў згодзе пражылі дзевяць гадоў. Калі пачалася вайна, ужо з дзецьмі вярнуліся ў Беларусь.

— Можна сказаць, усё жыццё жылі на чамаданах, — кажа мой суразмоўца. — За 15 гадоў у Чэрвені памянялі ажно 7 кватэр. Адзіная радасць — ва ўсіх была руская печка.

Жонка Фелікса ведае толк у кулінарыі. У яе выдатна атрымоўваюцца як беларускія стравы, так і стравы армянскай, грузінскай, абхазскай кухняў, якія Марына асвоіла за гады жыцця ў шматнацыянальнай Абхазіі.

— Мне ж больш за ўсё падабаецца пячы хлеб, — прызнаўся Фелікс Феліксавіч. — А неяк раз вырашыў паспрабаваць рабіць сыр... З таго часу ён, як і разьба па дрэве, стаў маім хобі. Ды што тут казаць, лепш частуйцеся (пайстэрску наразае свой фірмовы сыр-коску, і раскладае круглякі на мяккі батон).

«Я ледзь не плакаў, калі трэба было сыраватку выліваць вон»

Перш чым асвоіць сырную справу, Фелікс Феліксавіч паехаў у Маскву. Ведаў, што там, на Арбаце, абавязкова сустрэне сваіх зямлячак (вайна ў Абхазіі многіх у тыя часы вымусіла эміграваць у белакаменную), якія дакладна ведаюць сакрэт прыгатавання грузінскага сыру — сулугуні.

— Дадому прывёз некалькі дзясяткаў падобных адзін на другі рэцэптаў, — кажа Фелікс Высоцкі. — Адразу ж набылі з жонкай тры біклагі свежага малака, яно тады не так шмат каштавала, і пачалі праводзіць эксперыменты. Першыя дзве біклагі, зразумела ж, сапсавалі. З трэцяй жа атрымалі больш як тры кілаграмы смачнага сыру.

З цягам часу налаўчыліся і пачалі перапрацоўваць за дзень ажно па шэсць біклаг малака. Атрыманы сыр Фелікс вазіў прадаваць у Маскву, дзе ад пакупнікоў адбою не было. Пэўны час забяспечваў сырам і знаёмага фермера, які да таго, як паспрабаваў Феліксаў сыр, нахвальваў толькі прыбалтыйскі. Цяпер Фелікс робіць сыр толькі для сябе, бо на большае нестае часу за працай.

— Навучылі каго-небудзь з мясцовых жыхароў рабіць свой сыр?

— Асабліва ніхто не цікавіцца, бо гэта доўгая і карпатлівая праца.

— А з чытачамі «Звязды» падзеліцеся рэцэптам?

— Калі ласка. У нагрэтае малако дадаю разведзены з вадой парашок сычугу. Праз паўтары гадзіны на маленькім агні вадкасць ператвараецца ў халадцападобную масу, якую я мяшу рукамі, як цеста. У выніку атрымліваецца сырны шар. Праз 12-15 гадзін, гэта залежыць ад тэмпературы ў пакоі, саспелы шар нажом здрабняю ў кіпячую ваду. Усё гэта памешваю драўлянай лапаткай, ажно пакуль сыр не пачне расцягвацца, як жвачка. Гэту жвачку, пакуль яна не астыла, зноў інтэнсіўна вымешваю рукамі. Пасля кідаю ў форму і заліваю салёнай сыроваткай. Праз чатыры дні падвешваю на льняны шпагат і пачынаю вэндзіць. Вэнджу на апілках вольхі на працягу 12—16 гадзін.

У руках жыццярадаснага Фелікса Высоцкага звычайнае дрэва ператвараецца ў твор мастацтва...

... а малако ў надзвычай смачны сыр. Праўда, апошнім часам на творчасць практычна не застаецца часу...

— А ці ёсць назва ў гэтай смакаты?

— Сыр «Смак». Ёміста, запамінальна і, галоўнае, па-беларуску. Калі ў мяне атрымаецца стварыць у Рудні альбо якой суседняй вёсцы нешта накшталт Дудутак, то абавязкова зраблю на сыр якія-небудзь цікавыя драўляныя пячаткі. І яшчэ: я шораз, калі трэба было выліваць сыроватку вон, ледзь не плакаў. Таму ў планах яшчэ і асваенне майстэрства прыгатавання з яе клею.

«Хочацца, каб і на Чэрвеньшчыне з'явіліся свае Дудуткі»

Спадар Высоцкі прызнаўся, што для яго ніколі не былі паказчыкам Монтэ-Карла альбо які-небудзь Нью-Ёрк. Больш за тое, ён перакананы: беларуская вёска можа прывабліваць турыстаў не менш. Калі праявіць фантазію, то ў любым месцы можна зрабіць нешта цікавае.

— Калі ўсё зрабіць, як я сабе ўяўляю, Дудуткі тут і побач бы не стаялі. Я ездзіў туды на экскурсію і мне адразу ў вочы кінуўся штучны брудны вадаём. А ў нас у Рудні ажно два возеры і рэчка, што, несумненна, з'яўляецца істотнай перавагай. Тут можна самім зрабіць байдаркі ды яхты. Акрамя таго, можна наладзіць вытворчасць сыру, выпякаць хлеб, развесці пчол, стварыць своеасаблівы горад майстроў, дзе будуць квітнець народныя промыслы (кавальства, ткацтва, разьба, кераміка...). Прыродных матэрыялаў вакол, дзякуй Богу, багата. І людзей пры жаданні таксама можна падрыхтаваць.

Фелікс з Марынай у стане весці, як мінімум 12 самых розных гурткоў. Ды і дзеці іх усе як адзін (старэйшай дачцэ — 26, сыну — 24, а малодшай дачцэ — 18) творчыя. Цяпер, праўда, раз'ехаліся — хто ў Мінск, хто ў Геленджык.

— Але калі б што цікавае атрымалася, перакананы, мы б у кучу сабраліся вельмі хутка, — кажа суразмоўца. — Моладзь у вёсц

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Пяць рэчаў, якія варта ведаць пра Гальшанскі замак:

1. У XIII стагоддзі замак быў драўляны і стаяў над высокай самароднай гарой Карабель.
2. Князі Гальшанскія валодалі замкам да 1525 г., а потым, пасля шлюбу князёўны Алены Гальшанскай з Паўлам Сапегам, ён перайшоў ва ўладанні Сапегаў.
3. Мураваным замак стаў у XVII стагоддзі.
4. Пры Сапегах у замку была вялікая бібліятэка і тры штучныя возеры.
5. У Галандыі і Польшчы ёсць падобныя замкі.

Пацвердзіць ці абвергнуць гэтыя факты можна будзе 11 жніўня.

Настасся ЗАНЬКО.

Пра чутках і аўтарытэтна

ПРАЗ 10-15 ГАДОЎ ДОБРЫЯ СКУТАРЫ ВЫМРУЦЬ ЯК МАМАНТЫ?

Мінскія скутарысты супраць павышэння пошлін на ўвоз мотатэхнікі

Калі яшчэ 15 гадоў таму скутарысты былі рэдкасцю, то сёння толькі ў Мінску армія прыхільнікаў скутараў налічвае ўжо чатыры з паловай тысячы чалавек. Толькі пачалі беларусы разумець, што на цёплы перыяд двухколавыя транспартныя сродкі — цудоўная альтэрнатыва аўтамабілям, як раптам Мытны саюз паставіў тлусты крыж на ўвозе мотатэхнікі ў нашу краіну...

«Народ кідаў набытыя скутары па той бок мяжы»

Ужо 6 ліпеня, як распавёў «Звяздзе» **адзін з заснавальнікаў Мінскага скутар-клуба скутарыст з 15-гадовым стажам Алег КАРЦАЎ** (далей — **Black Jack**), пачалі раздавацца трывожныя званкі ад таварышаў з беларускай мытні. Маўляў, «мы ў шоку, не ведаем што рабіць, з нас мытнікі патрабуюць шалёныя грошы, ажно 44 працэнты ад кошту скутара».

— Прычым, работнікі мытні чамусьці не прызнаюць паказаных пакупніком дакументаў, якія сведчаць пра кошт скутара, — уступае ў размову **скутарыст Ігар ПАЗНЯК** (далей — **Ватсан**). — Устанаўліваюць яго па нейкім нямецкамоўным каталогу 2006 (!) года. А ні для каго не сакрэт, што мотатэхніка за чатыры гады значна патаннела. Такім чынам, атрымліваецца, што мы пераплачваем за яе на мяжы не 44 працэнты, а ўсе 100.

Нават аптовыя пастаўшчыкі мотатэхнікі задумваюцца над тым, каб памяняць від дзейнасці. Маўляў, гандляваць мотатэхнікай у Беларусі стане нявыгадна.

— Ведаю выпадкі, калі пераплачвалі і таго больш, — дадае Black Jack. — Хлопец прывёз скутар за паўтары тысячы долараў. «Размытнёўка» ж яму абышлася ажно ў дзве тысячы долараў. Такіх грошай, зразумела, у яго з сабой не было. Таму давялося цэлую ноч чакаць сяброў, якія абяцалі падвезці патрэбную суму. Даходзіла і да таго, што народ кідаў набытыя скутары па той бок мяжы. А што ім заставалася рабіць, калі выдаткі на «размытнёўку» перавышалі кошт пакупкі *(уздыхае)*. Мінскі скутар-клуб на працягу 15 гадоў фарміраваў культуру і традыцыі двухколавага руху, з кожным годам беларусы на лета больш актыўна пачалі перасаджвацца з аўтамабіляў на больш эканамічны і зручны транспарт, і раптам такі сюрпрыз...

Хлопец прывёз скутар за паўтары тысячы долараў. «Размытнёўка» ж яму абышлася ажно ў дзве тысячы долараў. Такіх грошай, зразумела, у яго з сабой не было. Таму давялося цэлую ноч чакаць сяброў, якія абяцалі падвезці патрэбную суму.

«А пра нас чыноўнікі, пэўна, забыліся? Альбо наўмысна пагрэбавалі?»

Скутарысты сцвярджаюць, што даведаліся пра павышэнне пошліны на ўвоз мотатэхнікі толькі на беларускай мяжы.

— Гэта навіна для нас была поўнай неспадзяванасцю, шокам, ударам, — кажа Black Jack. — Самае непрыемнае ў гэтай сітуацыі тое, што аўтамабілістаў загадзя праінфармавалі аб зменах пошлінаў, а пра нас, уладальнікаў мотатэхнікі, чыноўнікі, пэўна, забыліся. Альбо проста пагрэбавалі намі. Маўляў, што тыя матацыклісты, іх не так шмат, іншая рэч аўтамабілісты, з імі і будзем лічыцца.

— У выніку мы, аматары мотатранспарту, аказаліся нават маральна проста не гатовыя да ліпеньскіх зменаў, — адзначыў Ватсан. — Некаторыя хлопцы з-за няведання ўжо заказалі дарагія матацыклы і чакаюць іх з Амерыкі... Што ім рабіць, калі яны прыйдуць, выкінуць?..

Ніяк не могуць зразумець маладыя людзі і тое, чаму аўтаўладальнікам чыноўнікі пайшлі насустрач, пакінуўшы ранейшую працэдуру «размытнёўкі» легкавых аўтамабіляў да ліпеня 2011 года, а скутарыстам зрабілі непрыемны сюрпрыз. Чаму такая дыскрымінацыя?

— Такое адчуванне, быццам чыноўнікі лічаць, што тыя людзі, якія ездзяць на двух колах — мільянеры, — кажа Black Jack. — Ды і наогул складваецца такое ўражанне, што мытнае заканадаўства пісалася пад багатых масквічоў. Нават аптовыя пастаўшчыкі мотатэхнікі задумваюцца над тым, каб памяняць від дзейнасці. Маўляў, гандляваць мотатэхнікай у Беларусі стане нявыгадна. Кошт на скутары давядзецца павышаць, ад гэтага нікуды не дзенешся, ніхто ж не хоча працаваць сабе ў страту. Але вось толькі наўрад ці хто іх будзе набываць іх за такія шалёныя грошы.

Вось так у адно імгненне скутар стаў прадметам раскошы, сумна паціскаюць плячыма скутарысты. Што ўжо казаць пра дарагія матацыклы?..

— Акно ў Еўропу, прасечанае Пятром Першым, для нас ужо закалацілі, — кажа Black Jack. — З такім падыходам праз 10-15 гадоў добрая мотатэхніка вымра, як маманты, бо тыя скутары, на якіх мы цяпер ездзім, фізічна ўстарэюць, а набыць новыя будзе фактычна нерэальна... Хацелася б прыцягнуць увагу ўладаў да праблемы, якая ўзнікла...

Надзея ДРЫЛА, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Ігар КАРПЕНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД:

«БЕЗ СКУТАРА МОЖНА АБЫСЦІСЯ»

— Нічога нечаканага не было. Кожны мог зайсці на сайт Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі напярэдадні 6 ліпеня і азнаёміцца са спісам тавараў (а іх больш за 3 тысячы найменняў), на якія краіны-саюзніцы (Беларусь, Расія і Казахстан) узгаднілі пошліны. І я думаю, што гэта не закасцянелы спіс, ён будзе, улічваючы цікавасці тройкі дзяржаў, рэгулявацца ў далейшым. Асабіста я лічу, што як мага хутчэй трэба навесці парадак з тымі скутарамі, а дакладней з іх уладальнікамі, якія зараз ездзяць па беларускіх дарогах, ствараючы аварыйныя сітуацыі. Неабходна, каб ДАІ занялася рэгістрацыяй гэтых транспартных сродкаў, увяла абавязковы іспыт для скутарыстаў на веданне Правілаў дарожнага руху. Ніхто з маіх знаёмых не мае скутара і не збіраецца яго набываць, бо без яго можна абысціся. І яшчэ: высокія пошліны на ўвоз мотатэхнікі для фізічных асобаў маглі б стаць штуршком для замежных вытворцаў. Няхай прыязджаюць у Беларусь і наладжваюць зборку скутараў на базе мінскага мотавелазавода. У нас жа ёсць свой вытворца, інтарэсы якога мы павінны абараняць у першую чаргу, бо там працуюць нашы людзі.

Сярэднявечча адкрыецца ў Гальшанах 21 жніўня

Турніры лучнікаў, бугурты, конныя спаборніцтвы, сярэднявечная музыка і магчымасць апынуцца каля сценаў легендарнага Гальшанскага замка выпадае беларусам якраз 21 жніўня. Менавіта ў гэты дзень адбудзецца чарговы фестываль сярэднявечча «Гальшанскі Замак-2010».

Сёлетні фестываль адметны пяццю «круглымі» датамі. Гэта і 400-годдзе заснавання Гальшанскага замка, 730-годдзе заснавання Гальшанаў, 605-годдзе з дня нараджэння Соф'і Гальшанскай (пачынальніцы роду Ягелонаў). Ну і, вядома ж, 600-годдзе Грунвальдскай бітвы.

У гасцей фестывалю будзе магчымасць не толькі паглядзець на турніры і бугурты, а таксама паласавацца сярэднявечнымі стравамі, прымераць на сябе рыцарскія даспехі, паўдзельнічаць у княжаскіх забаўках. На фэсце чакаюцца таксама і гурты «Стары Ольса», «ЛітвінТроль», «Тэстамэнтум Тэррэ», «Расалія», «Келіх Кола», «Гальярда», і іншыя). А на салодкае — фаершоу ад тэатраў «Гістрыён» і «Дэ-Грыза».

— Гэтыя фестывалі паказалі, што людзям цікавая гісторыя сваёй краіны, свая спадчына. Попыт ёсць, і кожны год прыязджае шмат людзей. Гэта не толькі магчымасць глыбей пазнаёміцца са сваёй культурай, але і добрая нагода пабываць больш часу са сваёй сям'ёй і дзецьмі, — расказвае Алесь Кушнер, супрацоўнік турыстычнага агенцтва «Гісторыя Тур», асноўнага арганізатара свята. — Такімі фестывалямі мы таксама хочам прыцягнуць увагу да стану і самога Гальшанскага замка. Таму што цяпер, наколькі мне вядома, ніякай рэканструкцыі не плануецца. Гаворка ідзе пра тое, каб хоць замаразіць тое, што засталося.

Пачатак фестывалю ў 11.00. Кошт квіткоў — 25 тыс. рублёў.

Настасся ЗАНЬКО.

Кацярына ШАТОХІНА, галоўны інспектар аддзела арганізацыі мытнага афармлення і мытных рэжымаў Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі:

«ПАСЛАБЛЕННЯЎ У НАЙБЛІЖЭЙШЫ ЧАС НЕ ЧАКАЕЦЦА»

— Раскажыце, калі ласка, пра змены, якія закранулі беларускіх аматараў мотатранспарту з уваходжаннем у сілу Мытнага кодэкса?

— З шостага ліпеня плацяжы за ўвоз мотатранспарту на тэрыторыю Мытнага саюза бяруцца ў залежнасці ад кошту дадзенага скутара (матацыкла, квадрацыкла), а не ад аб'ёму рухавіка і моманту выпуску, як раней. Выніковая стаўка сукупнага мытнага плацяжу на сёння складае роўна 44 працэнты ад кошту мотатэхнікі, якая ўвозіцца. У гэту суму ўваходзіць уважная мытная пошліна і падатак на дабаўленую вартасць.

— Ці праўда, што пры вызначэнні кошту мотатэхнікі мытнікі кіруюцца выключна нямецкім каталогам 2006 года?

— У першую чаргу бяром да ўвагі інфармацыю аб кошце, якую дае ўласнік мотатранспарту. Калі ж легальнасць дакументаў ставіцца пад сумненне, то суму плацяжоў разлічваем, зыходзячы з кошту, названага ў каталогу альбо іншых крыніцах. Што датычыцца каталогаў, то ў нас у распараджэнні ёсць розныя каталогі, не толькі нямецкі.

— Чаму для аўтамабілістаў зрабілі паслабленне, адклаўшы павышэнне пошлін ажно на год, а для ўладальнікаў мотатранспарту не?

— На павышэнні пошлін на ўвоз аўта- і матататэхнікі на тэрыторыю Мытнага саюза настойвалі як Расія, так і Казахстан. Практычна нерэальна было адстаяць захаванне сваіх інтарэсаў па абодвух кірунках, таму сканцэнтраваліся на найбольш сацыяльна значнай катэгорыі тавараў. Зразумела, сёння мотааматарам больш выгадна набываць тэхніку на тэрыторыі Беларусі, Расіі і Казахстана, бо ў гэтым выпадку ім не трэба плаціць усе гэтыя ўвазныя пошліны і падаткі. Акрамя таго, павышэнне пошліны на ўвоз мотатэхнікі для фізічных асобаў дазволіць аптовым імпарцёрам уздыхнуць спакойна. Сутнасць у тым, што дагэтуль неаднаразова выяўляліся факты, калі людзі ўвозілі скутар пад выглядам асабістай маёмасці, а пасля па выгаднай цане прадавалі яго на рынку. Адным словам, паслабленняў у найбліжэйшы час не чакаецца. Пакуль працуем па новых правілах. А зменяцца яны ці не, залежыць не ад мытнага камітэта, а выключна ад рашэння кіраўніцтва трох дзяржаў-саюзніц.

НА СВЯТКАВАННЕ 300-ГОДДЗЯ АРХІКАТЭДРАЛЬНАГА КАСЦЁЛА Ў МІНСК ПРЫЕДЗЕ КАРДЫНАЛ З РЫМА

Днямі Папа Рымскі Бенядыкт XVI прызначыў **былога прэфекта ватыканскай кангрэгацыі евангелізацыі народаў кардынала Юзафа ТОМКУ** сваім пасланнікам у Мінск з нагоды святкавання 300-годдзя кансэкрацыі мінскага архікатэдральнага касцёла імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі.

У сваім лісце, які быў апублікаваны 8 жніўня, Пантыфік перадусім кіруе да кардынала такія словы: «...Разам з тым, просім цябе, каб ад Нашага імя ўсім там сабраным перадаў прывітанне, перадусім Архіепіскапу Мітрапаліту Мінска-Магілёўскаму, а таксама ўсім іншым святым Пастырам, святарам, законнікам і законніцам, свецкім Хрыстовым вернікам. Урэшце, моцна жадаем, каб словы Нашай прыхільнасці ты данёс таксама да дзяржаўных уладаў і да ўсіх, хто з увагаю ставіцца да місіі Касцёла, значэння свабоды веравызнання, а таксама да сапраўднага дабра чалавечай асобы».

Свайго пасланніка Пантыфік накіроўвае ў Беларусь ужо трэці раз за апошнія 13 гадоў. Першы раз у 1997 г. на рэкансэкрацыю архікатэдры з Рыма прыязджаў Яго Эмінэнцыя кардынал Казімір Шока. Пазней святыню на заканчэнне Сінода Мінска-Магілёўскай, Пінскай і Віцебскай дыяцэзій наведваў кардынал Камілаў Руіні.

Ксёндз кардынал Юзаф Томка стане трэцім папскім пасланнікам, які наведае архікатэдру. Суправаджаць надзвычайнага пасланніка Папы прызначаны пробашч парафіі Святога Юзафа ў Маладзечне ксёндз прэлат Эдмунд Даўгіловіч-Навіцкі і пробашч парафіі Святога Андрэя, апостала, у Нарачы айцец Бярнард Радзік. 300-годдзе кансэкрацыі галоўнага храма Мінска-Магілёўскай епархіі адбудзецца 9 кастрычніка.

Ілья ЛАПАТО.

РАСІЙСКІЯ ПАМЕЖНІКІ ДАПАМАГЛІ

У Гарадоцкім раёне ля вёскі Ламаносава каля мяжы з Расіяй супрацоўнікі Гарадоцкага раённага аддзела ўнутраных спраў і памежнай службы Федэральнай службы бяспекі Расійскай Федэрацыі затрымалі кантрабандыста-«металіста».

25-гадовы рабочы перавозіў на аўто «ЗІЛ» каля 2,3 тоны лому каляровых металаў без адпаведных суправаджальных дакументаў. Груз у беларускіх рублях ацанілі ў больш за 2,2 мільёна рублёў. У Расіі кантрабандыст мог бы атрымаць за метал у разы больш.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЯК САМАСТОЙНА ЗРАБІЦЬ ХІМЧЫСТКУ САЛОНА АЎТАМАБІЛЯ?

Аўтападказка

Сем крокаў да чысціні, якія дапамогуць зэканоміць 240 тысяч

Напэўна, кожны шляхетны аўтамабіліст сутыкаўся з праблемай — салон машыны з часам так ці інакш забруджваецца. Напрыклад, калі перавозіш у ім дошкі ці сілікатныя блокі. Ужо пасля аднаго такога рэйсу на лецішча некалі чысты салон аўтамабіля ператвараецца ў хлеў.

Калі ў вас маленькае дзіця, то амаль гарантавана, што велюравая тканіна задняга сядзення будзе ў плямах ад ежы. Ды што наракаць на карапузаў, бывае, і дарослы пасажыр разалье на сядзенне тлустую вадкасць з кансервавай бляшанкі. Так ці інакш з часам аўтамабільны салон забруджваецца, з'яўляюцца дрэнныя пахі, і неабходна рабіць хімчыстку.

З гэтай праблемай днямі сутыкнуўся і я. Запаркаваў машыну ля пад'езда і пайшоў дадому глядзець футбол. Раптам усчалася залева. Машынка стаяла ў нізіне, яе затапіла.

— Бяжы хутчэй да машыны, вада з дзвярэй выліваецца, — крычаў сусед у тэлефонную слухаўку.

І сапраўды, у салон маёй машыны залілося з некалькі каністраў вады, і добра, што стыхія не дабралася да паветранага фільтра і рухавіка. Але што рабілася ў салоне — гэта жах. Брудная вада дайшла нават да абшыўкі сядзенняў. Дзень-два — і мая некалі акуратненькая машынка магла ператварыцца ў смярдзючага скунса, у салоне мог з'явіцца пах нямытых шкарпэтак.

ЯКІЯ СЯРЭДНІЯ КОШТЫ НА ПРАФЕСІЙНУЮ ХІМЧЫСТКУ?

Як выйсці з пікантнай сітуацыі? Здаць машыну на поўную хімчыстку салона. Сярэдні кошт паслугі ў Мінску — каля 210-240 тысяч рублёў. Самы выгадны варыянт прапанавалі хлопцы, якія падхалтурвалі на гаражах у вольны ад працы час — 150 тысяч рублёў. Траты гэтыя былі для мяне нечаканымі і незапланаванымі, і я вырашыў прыбраць ваду і зрабіць хімчыстку салона сваімі сіламі. Кансультаваў мяне ў гэтым пытанні **супрацоўнік прафесійнай аўтамыйкі Аляксандр САЙЧЫК.**

Інструкцыю, якую мы склалі, могуць смела ўжываць як тыя, у каго затапіла машыну, так і тыя, хто хоча проста пачысціць забруджаны салон аўтамабіля.

КРОК ПЕРШЫ. Зняць вадзіцельскае і пасажырскія сядзенні.

Перш-наперш трэба дастаць ключ з замка запальвання. Зазвычай сядзенне мацуецца да падлогі вельмі проста — яно прыкручана чатырма балтамі, якія адкручваюцца так званым ключом-галоўкай. Па шчырасці, мне ўдалося адкруціць балты звычайным маленькім разводным ключом.

— Увага! І пад вадзіцельскае, і пад пасажырскія сядзенні ідуць правады. Да кожнага з сядзенняў такім чынам далучаюцца па дзве фішачкі, іх трэба зняць, — тлумачыць эксперт Аляксандр Сайчык. — Цяпер сядзенні можна даставаць, толькі вельмі акуратна, каб не падрапаць абшыўку салона. Ад гэтага часу нават не датыкайцеся ключом да замка запальвання, з-за недалучаных да сядзенняў фішачак электроніка ў будучыні пачне выдаваць памылкі.

КРОК ДРУГІ. Зняць «дывановае пакрыццё» на падлозе.

Як высветлілася, гэта працэдура таксама нескладаная. Спачатку па краях салона здымаюцца элементы пластыкавай абшыўкі. Мацуюцца яны, як дзіцячы канструктар, з дапамогай пластыкавых фішачак ці ўвогуле без іх. Потым звычайнай адвёрткай адкруціце балты мацавання на кансолі (канструкцыя, якая аздабляе рычаг пераключэння перадач, ручны тормаз, магнітолу і гэтак далей). Цяпер нішто не замінае вам зняць «дывановае пакрыццё».

КРОК ТРЭЦІ. Прасушыць шумаізаляцыйны слой (каму неабходна прыбраць ваду з салона).

Пад «дывановым пакрыццём» на падлозе пракладзена матэрыя, падобная на шчыльную паралонавую губку. Гэта і ёсць шумаізаляцыйны слой. Ён і ўвабраў у сябе львіную долю дажджавой вады, якой затапіла маю машыну. Увесь шумаізаляцыйны слой давялося выціскаць і цалкам прасушваць цягам сутак. Калі на дварэ вільготна ці халодна, лепш увесь гэты паралон высушваць дома.

КРОК ЧАЦВЁРТЫ. Падрыхтаваць пену для чысткі салона.

І вось пачынаецца самае цікавае. Пярэднія, заднія сядзенні і «дывановае пакрыццё» трэба прапыласосіць. Пасля гэтага падрыхтаваць пену для чысткі салона.

— У спецыялізаваных крамах з аўтакасметыкай прадаюцца замежныя сродкі. Але нават прафесіяналы карыстаюцца беларускай «хіміяй», напрыклад, «Фералінам», — раіць Аляксандр Сайчык. — Каштуюць такія сродкі ўтрая менш за замежныя аналагі, а па сваёй якасці не саступаюць.

За пяцілітровы буталь такой беларускай вадкасці давядзецца выкласці каля 15 000 — 20 000 беларускіх рублёў.

Такім чынам, у пяцілітровае вядро вады дадаецца каля 300 грамаў вадкасці, усё гэта актыўна перамешваецца да ўтварэння пены.

КРОК ПЯТЫ. Як правільна рабіць хімчыстку?

— Цяпер пену можна наносіць губкай на сядзенні, «дывановае пакрыццё» і панэль прыладаў. Што тычыцца столі, пена наносіцца ашчадна, каб пазбегнуць адклейкі.

Цяпер месцы, куды нанесена пена, трэба чысціць шчоткай. Важна, каб шчотка была няжорсткая — можна пашкодзіць любы тып пакрыцця.

— Ці можна сапсаваць пакрыццё неасцярожным нанясеннем хіміі?

— Як правіла, спецыяльныя сродкі для чысткі салона пашкоджанняў не ўтвараюць.

КРОК ШОСТЫ. Як высушыць ачышчаны салон?

— Па правілах, цяпер па салоне трэба прайсціся спецыяльным пыласосам, які адсмоктвае вадкасць, — адзначае Аляксандр Сайчык. — Але не ў многіх аўтааматараў такі пыласос ёсць. У такім разе важна не перабольшыць з пенай. Іначай высушыць салон будзе няпроста. Калі з пенай вы не перабольшалі, можна прайсціся па ўжо чыстых элементах салона звычайным пыласосам. І цяпер чакаць, пакуль усё высахне. Калі на дварэ сухое летняе надвор'е, праблемаў з сушкай не будзе. А вось узімку ці позняй восенню за такую хімчыстку лепш не брацца.

КРОК СЁМЫ. Фінальная зборка аўтамабільнага салона.

Тут галоўнае — не разгубіць балты і пластыкавыя фішачкі, якімі мацуюцца элементы салона, не забыць вярнуць на месца адлучаныя ад сядзенняў фішачкі.

Цяпер у чысты салон вашай машыны любую паненку пасадзіць не сорамна.

Калі хімчыстка будзе зроблена згодна з гэтай інструкцыяй, вы атрымаеце чысты салон аўтамабіля за мінімальныя грашовыя ўкладанні. У такую машыну, якая патыхае водарам свежасці, не сорамна пасадзіць ні пераборлівую паненку, ні чысцюлю-хлопца. Вас могуць абвінаваціць у любых смяротных грахах, але ні за што не скажуць: «Аёй, гэты вадзіцель — сапраўдны гразнуля...»

Яўген ВАЛОШЫН.

11 жніўня

Дзве даты

1895 год — у Мінску адкрыта першая электрастанцыя, найбуйнейшая ў Беларусі з ліку муніцыпальных. Знаходзілася яна на правым беразе Свіслачы, побач з сучасным будынкам Беларускага дзяржаўнага цырка. Эксплуатацыя электрастанцыі дазволіла ўстанавіць 390 лямпачак напальвання: 140 для асвятлення вуліц, 140 у зімовым і летнім тэатрах і 110 у прыватных спажыўцоў. У 1900 годзе ў горадзе было 180 электрычных ліхтароў.

1979 год — над Украінай, у раёне Днепрапятроўска, сутыкнуліся два самалёты «ТУ-134», у выніку чаго загінулі 173 чалавекі, у тым ліку футбалісты ташкенцкага «Пахтакора», якія ляцелі ў Мінск на матч чэмпіянату СССР.

Цытата дня

«Самая рэдкая мужнасць — гэта мужнасць думкі».

Анатоль Франс (1844—1924), французскі пісьменнік.

Усміхнемся!

— Мілы, ідзі есці макарону.
— Іду...
— Толькі яна перавараная...
— КІМ?

☺

Учора зняславіў сябе — прыйшоў на працу ў адных трусах. Быў абсмяяны калегамі: «Ты б яшчэ футра апрануў!».

☺

Жонка і муж.

— Што за жыццё? Мы нікуды не ходзім: ні ў кіно, ні ў тэатр.

— Што ты глупства кажаш, а каго я летась адвёз у паліклініку з паламаной нагой?

☺

Новы кактэйль: «Вяртанне Тытаніка».

Бяром сто грамаў астуджанай гарэлкі (сімвалізуюць халодны Атлантычны акіян), асцярожна дадаём сто грамаў малака (смуга над вадой), кладзём кубік лёду (айсберг) і ў выглядзе закусі — вялікі салёны агурок з насеннем («Тытанік» з пасажырамі). Залпам выпіваем, заядаем — і праз 15, максімум 30 хвілін «Тытанік» вяртаецца, прычым разам з пасажырамі!

ПЕРАД МЯДОВЫМ СПАСАМ (14 ЖНІЎНЯ)

«Боская працаўніца» — пчала — у культуры шматлікіх народаў з'яўляецца надзвычай шматпланавым сімвалам. Яна стала ўвасабленнем працавітасці і стараннасці, арганізатарскіх і творчых здольнасцяў, мудрасці і храбрасці, самаадданасці, эканоміі і беражлівасці. Часам пчала сімвалізавала таксама красамоўнасць, нездарма ж з'явіўся выраз «мядовыя словы». Менавіта таму, што раней чытаць і пісаць даводзілася пры васковых свечках, пчалу сталі звязваць з асветай і адукацыяй.

● У старажытных славян пчала стала сімвалам кахання, таму што аб'ядноўвала ў сабе і радасць, асалоду (мёд), і гаркоту (джала), — тое, без чаго не абходзіцца сямейнае жыццё.

● Пчолы заўсёды былі паплечнікамі нябесных бостваў. Дзякі мёд звалі «ежай багоў». Хрысціяне прадоўжылі гэту традыцыю: пчаліны мёд стаў сімвалам Хрыстовай дабрадзейнасці, а джала — яго пакутамі.

● Старажытныя людзі былі перакананыя, што пчолы з'яўляюцца на свет «самі па сабе, з воску і мёду», таму пчала была таксама сімвалам цнатлівасці. Так яна стала сімвалізаваць адвечную дзявоцкасць Дзевы Марыі, якая без граху зачала і нарадзіла Ісуса Хрыста.

● Часам выяву пчалы можна сустрэць на надмагільных камянях, як сімвал бессмяротнасці. Магчыма таму, што абуджэнне пчалы пасля зімовага сну атаясамлівалася з уваскрасеннем пасля смерці.

● Згодна са старажытнымі паданнямі, святымі пчолы сталі таму, што джалілі рукі тых, хто прыносіў пакуты Хрысту, і палягчалі яго пакуты: яны прыляталі роем і пілі яго крывавы пот у час яго хрэсных пакут. Таксама лічыцца, што менавіта пчолы першымі разнеслі вестку аб яго ўваскрэсенні. Пчалу заўсёды лічылі Боскай угодніцай, таму што яна «робіць воск на свечы» — «Богу ахвяру прыносіць».

● Тыя, хто меў сто і больш вулляў, па народных уяўленнях, былі звязаны з нячыстай сілай, іх звалі знахарамі, калдунамі і ведзьмакамі. У дахрысціянскія часы ў народзе існавала паданне, што пчолы з'явіліся ў багне, таму іх ахоўнікамі лічылі вадзяніка.

● Лічылася, што пчала джаліць толькі грэшнікаў: «пчолы не любяць дурных людзей», а добрага чалавека «пчала не кране».

● Сярод сялян існаваў звычай: «Чалавеку злоснаму, грахоўнаму лепш пчол не заводзіць!»

● Забіць пчалу без нагоды лічылася вялікім грахом, скрасці вулей ці калоду — страшэнным злом, разбурыць вулей — «разбурыць храм Божы».

● Паўсюдна лічылася, што распадар павінен размаўляць з пчоламі, як з разумнымі істотамі, быццам яны з'яўляюцца членамі сям'і. Ім трэба расказваць сямейныя навіны. Калі пчолы на некалькі хвілін змоўклі, а потым загулі роўна, значыць, прынялі навіны добра; калі ж выляталі з вулляў і злосна гулі — чакай непрыемнасцяў.

● Лічылася, што пчолы не «ганаруюць» таго гаспадара, які любіць есці мёд.

● Чужы рой, які наведаў вашу гаспадарку, лічыўся добрай прыкметай, знакам дабрабыту ў хаце і гаспадарцы. Гэты рой трэба было асабліва ахоўваць.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3877. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЕТРО НОВАГА ПАКАЛЕННЯ

Так будзе выглядаць новая станцыя «Пятроўшчына».

УСВЕЦЕ не існуе двух аднолькавых метрапалітэнаў, як не існуе абсалютна падобных адзін на аднаго народаў. Кожны з іх мае свае гістарычныя, этнічныя, культурныя асаблівасці. Кожны па-свойму ўнікальны. Тое ж і з «падземкамі», якія розняцца не толькі асаблівасцямі геалагічных умоў, але і архітэктурай, інжынернымі рашэннямі, што з'яўляецца адлюстраваннем культурных традыцый і менталітэту пэўнай нацыі.

ЭКСКУРС У ГІСТОРЫЮ

Першая лінія метрапалітэна — 3,6 км — была пабудавана ў Лондане і запушчана 10 студзеня 1863 года. Будаўніцтвам займалася кампанія «Metropolitan Railways» (з англійскай — «Сталічная чыгунка»). Ад гэтай назвы і пайшло слова «метрапалітэн», якое выкарыстоўваецца сёння ў многіх краінах. Напачатку першая лінія метро ў Лондане эксплуатавалася на паравой цязе, якая з 1890 года была заменена на электрычную.

Другі метрапалітэн быў адкрыты ў Нью-Ёрку ў 1868 годзе як наземны, аднак першыя надземныя ўчасткі не захаваліся і пазней былі заменены падземнымі. На еўрапейскім кантыненце самымі старымі з'яўляюцца метрапалітэны Будапешта (1896), Вены (1898), Парыжа (1900), Берліна (1902) і Гамбурга (1912).

У Расіі першая лінія метрапалітэна была адкрыта ў 1935 годзе (у Маскве). У Мінску сваё метро з'явілася ў 1984-м. Мінскі метрапалітэн з'яўляецца пятым па велічыні пасажырапатоку, шостым па колькасці станцый сярод «падземак» на прасторах СНД і адзіным на тэрыторыі Беларусі.

Дырэктар ААТ «Мінскметрапраект» Валерый ЧЭКАНАЎ.

УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ГРУНТОЎ

Будаўніцтва метро вельмі дарагое і лічыцца эканамічна абгрунтаваным толькі тады, калі аб'ём пасажыраперавозак у гадзіну пік у пэўным кірунку перавышае 20 тысяч чалавек. Калі менш — спраўляюцца наземныя віды транспарту. У Савецкім Саюзе толькі горад з колькасцю насельніцтва большай за мільён чалавек меў права будаваць у сябе метро.

На сёння Мінскае метро складаецца з дзвюх ліній агульнай працягласцю 31,5 км, 25 станцый і двух дэпо. На яго долю прыходзіцца звыш 36 працэнтаў пасажыраў, перавозімых грамадскім транспартам Мінска.

Вылучаюць закрыты спосаб будаўніцтва метро з дапамогай тунэлепраходных шчытоў і адкрыты, пры якім тунэлі і станцыі будуюцца ў катлаванах, а пасля засыпаюцца грунтам. Закрыты спосаб прымяняецца пры будаўніцтве ліній глыбокага закладання — калі гэтага патрабуюць гідрагеалагічныя ўмовы ці калі неабходна захаваць каштоўную забудову горада. Станцыі мелкага закладання будуюць адкрытым спосабам. Акрамя таго, для ліній метро мелкага закладання прымяняюць таксама і змешаны спосаб (як у Мінску), калі самі станцыі будуюцца адкрытым спосабам, а тунэлі — закрытым, што дае значную эканомію сродкаў.

Усе лініі і станцыі Мінскага метро — падземныя, мелкага закладання, глыбінёй 10-15 метраў. Самая глыбокая ў нас станцыя «Кастрычніцкая» — 18 метраў.

— Усё залежыць ад грунтоў, — патлумачыў журналісту **дырэктар ААТ «Мінскметрапраект» Валерый ЧЭКАНАЎ**. — У Піцеры метро глыбокае, бо там першыя метраў 50 ад паверхні складаюць няўстойлівыя грунты і балоты, у якіх будаваць метро ці выключна дорага (бо канструкцыя павінна быць нашмат больш трывалай, ізаляцыя — больш надзейнай), ці ўвогуле немагчыма. А глыбей грунты ўстойлівыя.

Наша метро — мелкага закладання, бо ў нас таксама няўстойлівыя грунты — але не на 50 метраў, як у Піцеры, а метраў на 200-300. Ды яшчэ пры высокім узроўні грунтовых вод. Нам «заглыбляцца» асаблівага сэнсу не было. Гэта б толькі прывяло да падаражання работ. На пачатку 70-х гадоў, калі толькі рабілася тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне, акадэмік Багамолаў, член НАН БССР, які таксама ўдзельнічаў у даследаванні, падтрымаў праекціроўшчыкаў. Ён пацвердзіў, што найбольш рацыянальна з эканамічнага пункту гледжання будаваць у Мінску метро мелкага закладання. Акрамя таго, неглыбокае метро больш зручнае і для пасажыраў.

Адметнай асаблівасцю Мінскага метрапалітэна (акрамя мелкага закладання) з'яўляецца перадавая тэхналогія «сценка ў грунце».

— Мы першымі на тэрыторыі Савецкага Саюза ўкаранілі такую тэхналогію, — працягвае дырэктар інстытута. — Прычым «сценка ў грунце» ў нас мела адразу два прызначэнні: яна была абмяжоўваючай (пры мацаванні катлавана на перыяд работ), а потым ператваралася ў сцяну гатовай станцыі. Станцыі першай лініі і першага ўчастка другой лініі, пабудаваныя ў канцы 80-х гадоў, узводзіліся менавіта па такой тэхналогіі. На жаль, пазней гэтую выдатную тэхналогію пры будаўніцтве метро ў Мінску не выкарыстоўвалі з-за адсутнасці сродкаў, патрэбных на замену старога абсталявання, якое прыйшло ў непрыдатнасць.

Станцыя «Малінаўка» прыме пасажыраў у недалёкай будучыні.

Галоўны спецыяліст канструктарскага аддзела Георгій ПРАТАСАЎ і вядучы інжынер Вадзім ШАЛАЕЎ.

БЛОЧНАЕ КАМБІНАВАННЕ

Яшчэ адна асаблівасць нашага сталічнага метрапалітэна — больш кароткія будынкі станцый (дзякуючы выкарыстанню такіх спосабаў праектавання, як блочнасць і шматузроўневасць).

— Гэта быў адзін з кірункаў па паніжэнні кошту будаўніцтва. Звычайная даўжыня станцыйнага комплексу метро — каля 300 метраў, дзе размешчаны аб'екты рознай вышыні. Пасажыру бачна толькі пасажырская частка — платформа даўжынёй 102 метры (яна разлічана на 5 вагонаў і аднолькавая на ўсіх мінскіх станцыях) і вестыбюль. А ёсць яшчэ СЦП (сумешчаная цягавапаніжальная падстанцыя), якая забяспечвае электрычнасцю ўсе збудаванні метрапалітэна і рух цягнікоў (70 метраў), камера падземнай вентыляцыі (24 метры), дзве вентыляцыйныя збойкі (па 24 метры) і г.д. Для таго каб максімальна выкарыстаць раскрытую падземную прастору, нашы канструктары і архітэктары прыдумалі блочнае камбінаванне: вентыляцыйную збойку ўмацоўвалі ў вестыбюль, венткамеру рабілі на верхнім паверсе, службовыя памяшканні — на ніжнім. За кошт гэтага ў нас даўжыня станцыйных комплексаў скарачалася на 50-70 метраў, эканомія сродкаў на будаўніцтве адной станцыі дасягала 20 працэнтаў. Да нас — на лініях мелкага закладання — такога не рабіў ніхто.

РАЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ І АДМЕТНАСЦЬ

Інстытут «Мінскметрапраект» раней быў адным з шасці філіялаў Маскоўскага дзяржаўнага праектна-вышукальнага інстытута «Метрагіпратранс». Заслуга беларускіх канструктараў у тым, што яны прапанавалі такі разумны і эфектыўны спосаб паніжэння кошту будаўніцтва, які потым паспяхова ўкараняўся ў іншых гарадах Савецкага Саюза, дзе існавалі філіялы «Метрагіпратранса».

Наша метро вельмі рацыянальнае. І адметнае. Напрыклад, станцыя «Аўтазаводская» мае 4 узроўні. На ёй пасажыры не бачаць купала — толькі плоскую столь, а над ёй ёсць яшчэ тэхнічны паверх, дзе размешчаны службовыя памяшканні, вентыляцыйныя камеры, шчытавыя і г.д. Другі паверх — непасрэдна платформа. Пад ёй — трэці паверх з падземнай цягавай падстанцыяй, а чацвёрты — яшчэ ніжэй — кабельны канал. Станцыя «Аўтазаводская» пакуль што такая адна, бо з пункту гледжання эксплуатацыі абслугоўваць яе цяжэй, чым станцыі са звычайнай планіроўкай. На станцыі «Аўтазаводская» інстытут прымяніў яшчэ адно сваё вынаходніцтва — паўназборную апрацоўку з шасці блокаў двух тыпаў памераў (якая ўпершыню была выкарыстана пры будаўніцтве станцыі «Усход»).

Самая кароткая станцыя Мінскага метрапалітэна — «Першамайская» (даўжынёй усяго 132 метры, з якіх 102 метры — платформа). Кампактнасць станцыі дасягнутая за кошт двухпавярховасці.

ПЕРСПЕКТЫВЫ

Прагрэс, у тым ліку і тэхнічны, не стаіць на месцы, і ў праектаванні станцый метро з'яўляюцца новаўвядзенні. Галоўнае з якіх — тэхналагічнае абсталяванне, новыя сістэмы эксплуатацыі метрапалітэна. Пасля таго як была здадзена першая лінія, дадаўся цэлы шэраг аўтаматызаваных сістэм: кантроль праходу (каб пабочныя асобы не маглі патрапіць у службовыя памяшканні як на самой станцыі, так і ў тунэлі), кантроль аплаты пасажырамі праезду, каляровае відэаназіранне на станцыі (што асабліва актуальна ў сувязі з абвастрэннем барацьбы з тэрарызмам) і інш.

— Мы пачалі распрацоўваць архітэктурны праект першага ўчастка трэцяй лініі ад перасадачнай станцыі «Фрунзенская»/«Юбілейная» да станцыі «Каржанеўскага», — дадаў кіраўнік інстытута. — Заказчык папрасіў, каб гэта быў цалкам аўтаматызаваны метрапалітэн. Напрыклад, касіры на такіх станцыях застануцца, але ўсе іх службовыя дзеянні будуць фіксавацца (колькі жэтонаў прададзена, якой была выручка і г.д.). Будзе фіксавацца і колькасць чалавек, якія прайшлі праз турнікеты станцыі за пэўны адрэзак часу. Гэта неабходна для далейшага аналізу, каб высветліць, ці не розняцца рэальныя лічбы ад запраектаваных і ці ёсць неабходнасць у дадатковых мерапрыемствах па паляпшэнні якасці перавозкі пасажыраў. Пакуль што гэта толькі ідэя, нават не праект, але магу вас запэўніць, што першы ўчастак трэцяй лініі стане аўтаматызаваным метрапалітэнам новага пакалення, які будзе адпавядаць патрэбам XXI стагоддзя.

На ўсіх станцыях, уведзеных у эксплуатацыю пасля 2001 года («Магілёўская», «Спартыўная», «Кунцаўшчына», «Каменная Горка», «Барысаўскі тракт», «Уручча») ёсць ліфты ці пад'ёмнікі для людзей з абмежаваннямі апорна-рухальнай сістэмы. У перспектыве ўсе дзейсныя станцыі метро павінны абзавесціся такім абсталяваннем.

У будучыні плануецца падаўжэнне другой лініі Мінскага метро за кошт станцый «Чырвоны Бор» і «Шабаны», а першай лініі — за кошт станцый «Смаленская», «Грушаўка», «Міхалова», «Пятроўшына», «Малінаўка». Акрамя таго, з часам у сталіцы з'явяцца дзве новыя лініі метро (трэцяя і чацвёртая). Трэцяя лінія працягласцю 17,2 км з 14 станцыямі злучыць Зялёны Луг праз цэнтр з мікрараёнам Курасоўшчына. Чацвёртая лінія метро працягнецца на 15 км і будзе складацца з 9 станцый. Лінія пройдзе ад плошчы Бангалор праз перасадачную станцыю (з другой лініяй) «Трактарны завод» і пройдзе праз Серабранку ў Чыжоўку.

18 ЗАМЕСТ 8

Паводле разлікаў спецыялістаў, максімальная правазная здольнасць нашага метрапалітэна — 36 тысяч пасажыраў у гадзіну. Сёння на асобных участках мы ўжо дасягнулі 32 тысяч у гадзіну. Аднак чым больш ліній будуецца, тым больш паніжаецца гэты ўзровень на канкрэтным участку, бо пасажыры перараз-

Інжынер Рыгор ЖАРОВІН — адзін з самых вопытных спецыялістаў «Мінскметрапраекта». Інжынеры Наталля ПАЖЫТАК і Паліна ФАРБЕРАВА — прадстаўнікі маладой змены.

Станцыя «Грушаўка» — з ліку тых, якія з'явяцца на новым участку ўжо існуючай лініі метро «Уручча»—«Інстытут культуры».

мяркоўваюцца па новых станцыях. Згодна з разлікамі «Мінскграда», схема чатырох ліній забяспечыць перавозку пасажыраў без дасягнення пікавых лічбаў ні на адным участку метрапалітэна. Нават на перасадачных станцыях. Праўда, жыццё ўносіць у праекты свае карэктывы. Калі праектавалася першая лінія, паводле разлікаў, на перасадачнай станцыі павінна было рабіць перасадку не болей за 8 тысяч пасажыраў у гадзіну.

— Раней куды ў асноўным людзі ездзілі на метро? Ранкам са спальных раёнаў — на заводы, увечары — назад, — даў тлумачэнні Валерый Уладзіміравіч. — У апошнія дзесяцігоддзі колькасць рабочых на заводах зменшылася прыкладна напалову. Людзі пайшлі ў іншыя галіны дзейнасці (на рынкі, у офісы, у сферу абслугоўвання). Пасажырскія патокі пераразмеркаваліся. І таму на перасадачным вузле «Купалаўская»/«Кастрычніцкая» пэўны час — пакуль не ўстанавілі чацвёрты эскалатар — абедзве станцыі былі значна перагружныя. Замест прадугледжаных планам 8 тысяч рэальны пасажырапаток там дасягаў 18 тысяч. Для таго каб зняць гэтую цісканіну, і была прадугледжана замена эскалатараў на новыя з дабаўленнем чацвёртай лініі.

Паводле слоў Валерыя Уладзіміравіча, рэзерваў для падаўжэння пасадачнай платформы дзейсных станцый сталічнага метрапалітэна не прадугледжана. Новыя лініі можна праектаваць і даўжэйшымі, але разлікі паказваюць, што саставаў з пяці вагонаў на кожнай лініі нам хопіць яшчэ надоўга.

«ГУМАВАЯ КАЛОША» І АГАРОДЖА БЯСПЕКІ

У Санкт-Пецярбургу (як і на некаторых іншых метрапалітэнах свету) пасадачная платформа аддзелена ад цягніка жалезабетоннымі канструкцыямі. Падобную сістэму можна ўкараніць і ў нас. Калі закладаць яе ў праект з самага пачатку, то гэта абумовіць адносна невялікае падаражэнне работ (на 10-15 працэнтаў), а вось калі паспрабаваць укараніць яе на дзейных станцыях, прыйдзецца перарабляць усю сістэму вентыляцыі, усю сістэму руху цягнікоў. Гэта вельмі вялікія затраты.

— Пры праектаванні трэцяй лініі мы прапрацоўваем гэтае пытанне — у межах аўтаматызаванага метрапалітэна, разглядаем магчымасці ўстаноўкі сістэмы агароджы платформы ад пуцей, вывучаем яе эканамічную мэтазгоднасць. Трэба ўлічваць, што гэта абумовіць памяншэнне хуткасці цягнікоў, а разам з ёй і правазной здольнасці метро. Калі сёння ў нас хуткасць цягнікоў метро — 40-41 км у гадзіну, то з такой сістэмай будзе ўсяго 35 км. Адпаведна правазная здольнасць складзе ўжо не 36 тысяч пасажыраў у гадзіну, а 32.

Не адзін год інстытут займаецца распрацоўкай новай канструкцыі ўстройства пуці з меншым узроўнем вібрацыі і шуму.

Чарговы праект абмяркоўваюць галоўны архітэктар аддзела Уладзімір ЦЕЛЯПНЁЎ, вядучы архітэктар Надзея НІКАЛАЕВІЧ, дырэктар будаўнічай кампаніі «Мішчанка і К» Андрэй МІШЧАНКА, кансультант-архітэктар з Італіі Маура ПЕСОЦІ.

гуле нельга нічога будаваць. Нам давялося яго цалкам выбіраць, замяшчаць нармальным грунтам і ўжо ў ім будаваць перагонны тунэль. Пад платформамі саміх станцый — «Спартыўнай» і «Кунцаўшчына», таксама былі праслойкі торфу, але меншыя (па 2-3 метры). Мы яго альбо цалкам выбіралі (калі была такая магчымасць), альбо «саджалі» канструкцыю на буранабіўныя палі (што абумовіла падаражэнне будаўніцтва). Кожны новы ўчастак прыпадносіць нам новыя сюрпрызы — з пункту гледжання грунтовых слаёў. Мы, безумоўна, праводзім геалагічныя пошукавыя работы, бурым свідравіны (па нормах іх трэба рабіць адну на 100 метраў, а на складаных участках — на кожныя 20 метраў і абавязкова — на 10 метраў ніжэй за меркаваны ўзровень тунэля, каб высветліць, на якія грунты мы «пасадзім» канструкцыю). Аднак і гэтага недастаткова. У нас бывае так, што грунтовыя слаі мяняюцца кожныя 10 метраў. Некалі праз Беларусь прайшоў ледавік, які перамяў геалагічныя пароды, утварыў шмат лагчын, дзе назапасіліся тарфяныя, ілістыя, асадачныя адкладанні, яшчэ лагчыны бываюць запоўненыя вадой, валунамі рознай акружнасці. Самы вялікі валун, які патрапіўся сталічным будаўнікам метро, быў дыяметрам 3 метры. Яго прыйшлося ўзрываць прама ў забоі.

ВЫХАД ЗА МЕЖЫ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ

Першапачаткова асноўным і адзіным кірункам дзейнасці інстытута было праектаванне метрапалітэна для горада Мінска. У 80-90-х гадах мінулага стагоддзя калектыў аказваў тэхнічнае садзейнічанне пры праектаванні метрапалітэна ў Варшаве і рэканструкцыі транспартнага тунэля ў Афганістане, браў удзел у распрацоўцы абгрунтавання інвестыцый у будаўніцтва метрапалітэна ў Гаване. Праектная дакументацыя на розных стадыях была выканана для Масквы і Растова-на-Доне, Каўнаса і Рыгі. Спецыялізуючыся на распрацоўцы тэхналагічных рашэнняў, а таксама рашэнняў па генплане і вееры пуцей для электрадэпо метрапалітэнаў, «Мінскметрапраект» выконваў (і выконвае цяпер) праектаванне такіх аб'ектаў для Расіі і іншых краін СНД. Запраектавана, пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю электрадэпо метрапалітэна ў Казані. Аналагічныя аб'екты праектуюцца для Омска, Чалябінска, Алматы і Баку.

У сярэдзіне 90-х, калі аб'ёмы фінансавання будаўніцтва Мінскага метро скараціліся, інстытуту давялося асвоіць новы напрамак дзейнасці — праектаванне аўтадарожных і чыгуначных тунэляў, а таксама падземных збудаванняў рознага прызначэння.

— У 1998 годзе нашы спецыялісты ўдзельнічалі ў прыняцці рашэння па будаўніцтве аўтадарогі Адлер — Красная Паляна на адным з самых складаных яе ўчасткаў — у раёне цясніны ракі Мзымты перад пасёлкам Красная Паляна, — падзяліўся дасягненнямі кіраўнік інстытута. — Дарога ў гэтым месцы небяспечная, праходзіць па скальных паліцах шырынёй 5-6 метраў. Пры выбары трасы новай аўтадарогі разглядалася мноства варыянтаў. Знайсці аптымальнае рашэнне, якое забяспечвала б найлепшыя параметры, бяспеку і максімальнае захаванне прыроднага асяродку Сочынскага нацыянальнага парку, было няпроста. Выбар быў зроблены на карысць нашага варыянту з двума тунэлямі. У канцы 2002 года ўчастак аўтадарогі працягласцю 4,9 км з двума тунэлямі даўжынёй 420 і 380 метраў быў уведзены ў эксплуатацыю. Аб'ект атрымаў высокую ацэнку дзяржаўнай камісіі і спецыялістаў. Асабліва адзначаўся той факт, што тунэлі па тэхнічным узроўні і якасці выканання на сёння з'яўляюцца аднымі з лепшых сярод аналагічных збудаванняў.

Яшчэ адной цікавай работай стала праектаванне інжынернай абароны ад каменяпадаў на аўтадарозе Адлер — Красная Паляна. Задачай гэтага праекта было забеспячэнне абароны ад каменяпадаў і снежных лавін участка аўтадарогі, якая праходзіць у раёне цясніны Ац-Ху. Работа гэта проста ўнікальная, паколькі на праектаванне падобных збудаванняў практычна адсутнічае нарматыўная база. У адпаведнасці з праектам там было пабудавана 8 супрацьлавінных і супрацькаменяпадных галерэй тунэльнага тыпу, якія забяспечваюць бяспеку руху на ўчастку аўтадарогі працягласцю каля 4 км да ўвядзення ў эксплуатацыю Краснапалянскага тунэля.

«Мінскметрапраект» выступіў і генеральным праекціроўшчыкам аб'екта «Аўтамабільная дарога Джугба-Сочы на ўчастку абходу горада Сочы ПК134-ПК194», які з'яўляецца другой чаргой аўтадарожнага абходу цэнтра Сочы на скрыжаванні ракі Сочы і Мамайскага храбта. Гэта ўчастак аўтадарогі працягласцю 4,4 км з моставым пераходам цераз раку Сочы (0,7 км), аўтадарожным тунэлем (2,6 км), эстакадным участкам ад паўночнага партала тунэля да развязкі (1,1 км) і транспартнай развязкай на



Інжынер Таццяна УСІК з кагорты маладых спецыялістаў.

Група выпуску аснашчана самым сучасным абсталяваннем. Тут працуюць начальнік гэтага падраздзялення Валянціна САМСОНАВА (на здымку ў цэнтры), аператары Вера ПРЫШЧЫЦ і Таццяна КАРДЫМОН.

— Адно з нашых вынаходніцтваў — так званая «гумавая калоша» (гумавы вібраізалятар пад драўляныя шпалы) — ужо ўкаранёны на ўчастках, дзе метро блізка падыходзіць да жылых дамоў, — расказаў Валерый Чэканаў, — але эфектыўнасць сістэмы невысокая. Яна забяспечвае гашэнне вібрацыі толькі на 10-12 дБ. Гэта таксама адчувальна, але недастаткова для выканання патрабаванняў санітарных нормаў. Цяпер мы распрацоўваем новую канструкцыю вібраізаляванага пуці і плануем на ўчастку лініі, які будуецца ў кірунку «Пятроўшчыны», зрабіць эксперыментальны адрэзак — метраў 100. Калі ў ходзе эксплуатацыі будзе дасягнуты станоўчы эфект, мы будзем прымяняць гэтую канструкцыю на ўсёй трэцяй лініі.

«СЮРПРЫЗЫ» АД ЛЕДАВІКА

Сярод асноўных цяжкасцяў, якія могуць з'явіцца ў далейшым пры праектаванні і будаўніцтве новых станцый і ліній метро, дырэктар назваў інжынерна-геалагічныя ўмовы:

— На кожным новым участку мы пераконваемся, наколькі яны разнастайныя нават у адным толькі горадзе Мінску. Калі мы будавалі працяг ад «Пушкінскай» да «Каменнай Горкі», то ўпершыню сутыкнуліся з участкамі торфу. На перагоне паміж станцыямі «Спартыўная» і «Кунцаўшчына» было 180 метраў суцэльнага торфу. А на торфе ўвогуле нельга нічога будаваць. Нам давялося яго цалкам выбіраць, замяшчаць нармальным грунтам і ўжо ў ім будаваць перагонны тунэль. Пад платформамі саміх станцый — «Спартыўнай» і «Кунцаўшчына», таксама былі праслойкі торфу, але меншыя (па 2-3 метры). Мы яго альбо цалкам выбіралі (калі была такая магчымасць), альбо «саджалі» канструкцыю на буранабіўныя палі (што абумовіла падаражэнне будаўніцтва). Кожны новы ўчастак прыпадносіць нам новыя сюрпрызы — з пункту гледжання грунтовых слаёў. Мы, безумоўна, праводзім геалагічныя пошукавыя работы, бурым свідравіны (па нормах іх трэба рабіць адну на 100 метраў, а на складаных участках — на кожныя 20 метраў і абавязкова — на 10 метраў ніжэй за меркаваны ўзровень тунэля, каб высветліць, на якія грунты мы «пасадзім» канструкцыю). Аднак і гэтага недастаткова. У нас бывае так, што грунтовыя слаі мяняюцца кожныя 10 метраў. Некалі праз Беларусь прайшоў ледавік, які перамяў геалагічныя пароды, утварыў шмат лагчын, дзе назапасіліся тарфяныя, ілістыя, асадачныя адкладанні, яшчэ лагчыны бываюць запоўненыя вадой, валунамі рознай акружнасці. Самы вялікі валун, які патрапіўся сталічным будаўнікам метро, быў дыяметрам 3 метры. Яго прыйшлося ўзрываць прама ў забоі.

ВЫХАД ЗА МЕЖЫ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ

Першапачаткова асноўным і адзіным кірункам дзейнасці інстытута было праектаванне метрапалітэна для горада Мінска. У 80-90-х гадах мінулага стагоддзя калектыў аказваў тэхнічнае садзейнічанне пры праектаванні метрапалітэна ў Варшаве і рэканструкцыі транспартнага тунэля ў Афганістане, браў удзел у распрацоўцы абгрунтавання інвестыцый у будаўніцтва метрапалітэна ў Гаване. Праектная дакументацыя на розных стадыях была выканана для Масквы і Растова-на-Доне, Каўнаса і Рыгі. Спецыялізуючыся на распрацоўцы тэхналагічных рашэнняў, а таксама рашэнняў па генплане і вееры пуцей для электрадэпо метрапалітэнаў, «Мінскметрапраект» выконваў (і выконвае цяпер) праектаванне такіх аб'ектаў для Расіі і іншых краін СНД. Запраектавана, пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю электрадэпо метрапалітэна ў Казані. Аналагічныя аб'екты праектуюцца для Омска, Чалябінска, Алматы і Баку.

У сярэдзіне 90-х, калі аб'ёмы фінансавання будаўніцтва Мінскага метро скараціліся, інстытуту давялося асвоіць новы напрамак дзейнасці — праектаванне аўтадарожных і чыгуначных тунэляў, а таксама падземных збудаванняў рознага прызначэння.

— У 1998 годзе нашы спецыялісты ўдзельнічалі ў прыняцці рашэння па будаўніцтве аўтадарогі Адлер — Красная Паляна на адным з самых складаных яе ўчасткаў — у раёне цясніны ракі Мзымты перад пасёлкам Красная Паляна, — падзяліўся дасягненнямі кіраўнік інстытута. — Дарога ў гэтым месцы небяспечная, праходзіць па скальных паліцах шырынёй 5-6 метраў. Пры выбары трасы новай аўтадарогі разглядалася мноства варыянтаў. Знайсці аптымальнае рашэнне, якое забяспечвала б найлепшыя параметры, бяспеку і максімальнае захаванне прыроднага асяродку Сочынскага нацыянальнага парку, было няпроста. Выбар быў зроблены на карысць нашага варыянту з двума тунэлямі. У канцы 2002 года ўчастак аўтадарогі працягласцю 4,9 км з двума тунэлямі даўжынёй 420 і 380 метраў быў уведзены ў эксплуатацыю. Аб'ект атрымаў высокую ацэнку дзяржаўнай камісіі і спецыялістаў. Асабліва адзначаўся той факт, што тунэлі па тэхнічным узроўні і якасці выканання на сёння з'яўляюцца аднымі з лепшых сярод аналагічных збудаванняў.

Яшчэ адной цікавай работай стала праектаванне інжынернай абароны ад каменяпадаў на аўтадарозе Адлер — Красная Паляна. Задачай гэтага праекта было забеспячэнне абароны ад каменяпадаў і снежных лавін участка аўтадарогі, якая праходзіць у раёне цясніны Ац-Ху. Работа гэта проста ўнікальная, паколькі на праектаванне падобных збудаванняў практычна адсутнічае нарматыўная база. У адпаведнасці з праектам там было пабудавана 8 супрацьлавінных і супрацькаменяпадных галерэй тунэльнага тыпу, якія забяспечваюць бяспеку руху на ўчастку аўтадарогі працягласцю каля 4 км да ўвядзення ў эксплуатацыю Краснапалянскага тунэля.

«Мінскметрапраект» выступіў і генеральным праекціроўшчыкам аб'екта «Аўтамабільная дарога Джугба-Сочы на ўчастку абходу горада Сочы ПК134-ПК194», які з'яўляецца другой чаргой аўтадарожнага абходу цэнтра Сочы на скрыжаванні ракі Сочы і Мамайскага храбта. Гэта ўчастак аўтадарогі працягласцю 4,4 км з моставым пераходам цераз раку Сочы (0,7 км), аўтадарожным тунэлем (2,6 км), эстакадным участкам ад паўночнага партала тунэля да развязкі (1,1 км) і транспартнай развязкай на

Так выглядаў на схеме тунэль паблізу горада Сочы, пабудаваны па праекце спецыялістаў «Мінскметрапраекта». На здымку побач — партал гэтага пабудаванага тунэля, які сёння арганічна ўпісаўся ў горны пейзаж.



Так выглядаў на схеме тунэль паблізу горада Сочы, пабудаваны па праекце спецыялістаў «Мінскметрапраекта». На здымку побач — партал гэтага пабудаванага тунэля, які сёння арганічна ўпісаўся ў горны пейзаж.

Гэта таксама адна з распрацовак «Мінскметрапраекта»: такая галерэя ўзведзена на горных аўтастрадах бліз Сочы для аховы транспарту ад каменяпадаў.

Ганаровы знак «У памяць 200-годдзя Упраўлення воднымі і сухапутнымі зносінамі», атрыманы ад калег з Расіі дырэктарам «Мінскметрапраекта» Валерыем ЧЭКАНАВЫМ — сведка прызнання заслуг мінскіх праекціроўшчыкаў.

Матэрыял падрыхтавалі Інга МІНДАЛЁВА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
УНП 100021050.
Ліцэнзія №02250/0464239 выдадзена Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Беларусі да 15.03.2014.

АД РЭДАКЦЫІ. *Выказваем шчырую падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі начальніку групы АСКП Мікалаю МЯЦЕЛЬСКАМУ і начальніку аддзела ПБК Аляксандру ГУЦЬКО.*

Карыстаючыся магчымасцю, я хацеў бы выказаць падзяку свайм спецыялістам за напружаную штодзённую працу, пажадаць ім здароўя, дабрабыту і новых творчых ідэй.